ЗАСТАВАЙЦЕСЯ СА «ЗВЯЗДОЙ»!

Пачалася падпіска на II паўгоддзе 2009 года

Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)

Індэкс	на 1 месяц	на 3 месяцы	на 6 месяцаў
63850 (індывідуальны)	10600	31800	63600
63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)	9990	29970	59940
63858 (ведамасны)	17050	51150	102300
63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)	15550	46650	93300

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

22 КРАСАВІКА 2009 г. СЕРАДА № 75 (26433)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Прамая лінія

АТЭРАСКЛЕРОЗ САСУДАЎ РУК, НОГ І ГАЛАВЫ

Аб дыягностыцы атэрасклератычных паражэнняў артэрый, лячэнні гангрэнаў з захаваннем канечнасцяў, прафілактыцы інсультаў можна даведацца ад **загадчыка аддзялення сасудзістай хірургіі Мінскай абласной клінічнай бальніцы Паўла Паўлавіча АЎДЗЕЯ.**

«Прамая лінія» з яго ўдзелам адбудзецца **24 красавіка, у пятніцу, з 15.00 да 16.00 па нумарах: 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21.**

Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах: 8 (017) 287 18 29 (Святлана Барысенка) і 287 18 36 (Вольга Шаўко).

Аляксандр Лукашэнка лічыць магчымым больш актыўнае ўзаемадзеянне з Расіяй у ваенна-тэхнічнай сферы

Узаемадзеянне паміж міністэрствамі абароны Беларусі і Расіі — прыклад супрацоўніцтва, якім павінны кіравацца і грамадзянскія ведамствы дзвюх краін. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 21 красавіка ў час сустрэчы з міністрам абароны Расійскай Федэрацыі Анатолем Сердзюковым.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў: «Я лічу, што ў нас няма вялікіх праблем у супрацоўніцтве паміж ведамствамі ў галіне абароны нашай сумеснай Айчыны. У нас няма праблем у плане рэалізацыі дасягнутых у гэтай сферы дамоўленасцяў». Закранаючы падпісанае пагадненне аб адзінай сістэме ППА, Аляксандр Лукашэнка сказаў, што ёсць час для падрыхтоўкі пратакола да гэтага дакумента. «Я перакананы, што пытанне будзе вырашана ў інтарэсах нашых дзяржаў», — падкрэсліў ён. Прэзідэнт пацвердзіў, што «ўсе дасягнутыя з Расіяй дамоўленасці, перш за ўсё ў ваеннай, ваенна-тэхнічнай сферах, будуць няўхільна выконвацца нашымі спецыялістамі, міністрамі, урадам».

«Больш таго, я хацеў бы, каб мы пайшлі далей, паглядзелі наперад у нашым ваенным і ваенна-тэхнічным супрацоўніцтве — у плане сумеснай вытворчасці якіх-небудзь абаронных сістэм, актыўна ўключалі навуку ў нашы распрацоўкі, — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі. — Мы хочам, каб патэнцыял нашай эканомікі, як у савецкія часы, быў запатрабаваны не толькі тут, у Беларусі, але і ў Расіі».

Кіраўнік дзяржавы падзякаваў расійскаму боку за цеснае супрацоўніцтва з беларускімі спецыялістамі ў ваеннай і ваенна-тэхнічнай сферах, а таксама асабіста міністру абароны Расіі за падтрымку, што аказваецца Беларусі. «Мы адкажам узаемнасцю», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

У сваю чаргу Анатоль Сердзюкоў падкрэсліў высокі ўзровень кантактаў паміж міністэрствамі абароны Беларусі і Расіі, які, на яго думку, садзейнічае развіццю ўзброеных сілаў дзвюх краін.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«Асаблівая частка Падатковага кодэкса павінна быць прынята ў гэтым годзе»

Парламентарыі разам з беларускім урадам павінны зрабіць усё магчымае, каб у гэтым годзе прыняць Асаблівую частку Падатковага кодэкса. На гэта звярнуў асаблівую ўвагу Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 21 красавіка ў час сустрэчы са старшынёй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімірам Андрэйчанкам.

Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Андрэйчанка абмеркавалі пытанні бягучай дзейнасці Палаты прадстаўнікоў, а таксама рэалізацыі ўказа, які вызначае задачы нарматворчай дзейнасці на 2009 год. Акрамя таго, была адзначана неабходнасць ратыфікаваць шэраг дакументаў, прынятых у рамках Еўразійскага эканамічнага супольніцтва.

Таксама закраналіся пытанні міжнароднай дзейнасці беларускіх парламентарыяў у гэтым годзе.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

У беларускіх парламентарыяў неадназначнае стаўленне да пытання аб прызнанні Паўднёвай Асеціі і Абхазіі

У беларускіх парламентарыяў на сёння неадназначнае стаўленне да пытання аб прызнанні Паўднёвай Асеціі і Абхазіі. Аб гэтым паведаміў журналістам старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір Андрэйчанка, адказваючы на пытанне карэспандэнта БЕЛТА.

«Пытанне аб прызнанні вельмі няпростае. Палата прадстаўнікоў можа ў любы момант уключыць гэта пытанне ў парадак дня, і тут няма ніякіх праблем, — падкрэсліў Уладзімір Андрэйчанка. — Іншая справа, што на сёння ў нашых парламентарыяў неадназначнае стаўленне да гэтага пытання. Ёсць розныя пункты гледжання, і з моманту паступлення звароту парламентаў Паўднёвай Асеціі і Абхазіі ў беларускі Нацыянальны сход прайшло ужо даволі шмат часу. У камісіі гэта пытанне абмяркоўваецца, але адзінства пакуль няма».

«На мой погляд, і Прэзідэнт Беларусі гэтым занепакоены, ён усё ж такі хацеў бы, каб па гэтым пытанні было большае адзінства ў нашага парламента. Тады мы, напэўна, уключым гэта пытанне ў парадак дня. Пакуль я па паводзінах дэпутатаў бачу, што пытанне не выспела», — адзначыў старшыня Палаты прадстаўнікоў.

Ён таксама нагадаў, што Беларусь са свайго боку аказала гуманітарную дапамогу і ўнесла прапанову аб прыняцці на аздараўленне дзяцей. «Парламентарыі Паўднёвай Асеціі і Абхазіі прысутнічаюць у якасці наглядальнікаў у Парламенцкім сходзе Саюза Беларусі і Расіі», — дадаў Уладзімір Андрэйчанка.

НОВЫЯ МАРКІ

21 красавіка 2009 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь увяло ў паштовае абарачэнне блок «Год роднай зямлі». Мастакі — Марыя Плахатнюк і Іван Лукін.

15 красавіка 2009 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь увяло ў паштовае абарачэнне дзве маркі на тэму «Астраномія» з лагатыпам «Europa», падрыхтаваныя выдавецкім цэнтрам «Марка» РУП «Белпошта». Мастак — Тамара Стасевіч.

ЗДАМ КВАТЭРУ Ў ДОБРЫЯ РУКІ!

Хто ж не марыць пра ўласнае жыллё?! Бяда толькі ў тым, што не ўсім «па кішэні» набыць кватэру. А так хочацца жыць самастойна, без бацькоў і павучанняў з іх боку! Калі вы падзяляеце думку, што сваякоў лепш любіць на адлегласці, застаецца — здымаць кватэру.

Калі для гэтых мэтаў вы вырашылі звярнуцца ў агенцтва, то патрэбна ведаць, што ў Мінску кампаніі, якія займаюцца пошукам кватэр для арэнды, працуюць двума спосабамі. Першы, калі кліенту, які хоча зняць жыллё, проста даюць спіс з адрасамі кватэр, нумарамі тэлефонаў гаспадароў. Далей ён сам звязваецца з кватэраздатчыкамі і падбірае сабе жыллё.

Другі спосаб працы — па факце. Гэта калі супрацоўнік агенцтва разам з кліентам выбіраюць варыянты для прагляду, аб'язджаюць кватэры, якія здаюцца, каб выбраць тую, што найбольш падыходзіць. Па такім прынцыпе працуе і агенцтва нерухомасці «Твая сталіца». З чалавекам, які звяртаецца туды, заключаецца дагавор на паслугу па падборы жылля.

Як расказала дырэктар агенцтва Людміла КРАСОЎСКАЯ, цяпер на рынку нерухомасці попыт на арэнду кватэр малы, больш прапаноў. Таму ў тых людзей, што шукаюць сабе жыллё, ёсць выбар.

Па прагнозах Людмілы Васільеўны, такая тэндэнцыя захаваецца да канца лета. Потым, калі пачнецца вясельны бум, у сталіцу на вучобу прыедуць студэнты, усё памяняецца. Тады ўжо надта не павыбіраеш. Калі ты не возьмеш гэтую кватэру, то яе забярэ хто-небудзь іншы.

— Восенню ў нас бывалі выпадкі, калі ў агенцтва з чамаданамі прыходзілі мамы і плакалі, прасіліся хоць што-небудзь падабраць для іх дзяцей-студэнтаў, толькі каб сынок ці дачушка не засталіся на вуліцы, — успамінае дырэктар агенцтва.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 22.04.2009 г. (для б/н разлікаў)

▲ 1 долар ЗША	2 865,00
▲ 1 еўра	3 704,16
1 латвійскі лат	5 233,35
1 літоўскі літ	1 074,97
1 чэшская крона	136,77
1 польскі злоты	836,97
▼ 1 расійскі рубель	84,01
1 украінская грыўня	357,01

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	34,1043
10 UAH	42,2083
1000 BYR	11,9917
EUR	44,0764

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

ТРУБА КЛІЧА!

Учора ў Нацыянальным выставачным цэнтры ў сталіцы па вуліцы Я. Купалы, 27 адкрылася 11-я міжнародная выстава «Вада і цяпло». Гэта адзіны форум у краіне, што цалкам прысвечаны вода- і цеплазабеспячэнню. Праект прадстаўляе прадукцыю і абсталяванне па наступных напрамках: водападрыхтоўка і ачыстка вады; водаадвядзенне і ачыстка сцёкаў; ацяпленне; трубы і арматура; помпы і басейны; будаўнічыя, мантажныя, сантэхнічныя, рамонтныя і спецыяльныя работы; кандыцыянаванне і вентыляцыя. Сёлета на выставе будуць працаваць больш за 130 кампаній з амаль двух дзясяткаў краін. Па меркаванні пастаянных удзельнікаў, форум дае шырокія магчымасці для наладжвання прафесійных сувязяў, пошуку новых дзелавых партнёраў. А журналісты «Звязды» па традыцыі наведалі выставу яшчэ да яе афіцыйнага адкрыцця са сваімі канкрэтнымі мэтамі: знайсці на шматлікіх стэндах тое, што можа зацікавіць звычайнага пакупніка, быць яму «па кішэні».

«Раю вам вось гэтую топку», — кажа намеснік дырэктара фірмы па продажы пячнога і каміннага абсталявання Дзмітрый КЛЕМЯТА.

...Красамоўным пацвярджэннем першай часткі назвы выставы адразу ля ўвахода нас сустракае экспазіцыя Баранавіцкага камунальнага ўнітарнага вытворчага прадпрыемства водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі «Водаканал». Яго прадукцыя — бутыляваная пітная вада, якую яшчэ называюць «жывой вадой». Справа ў тым, што яна настоеная на крэмені. У прыродзе сустракаецца больш за 500 разнавіднасцяў гэтага каменя, але для актывавання прэснай вады выкарыстоўваюцца толькі пэўныя з іх. У Беларусі такія крэмені адзначаны ў раёне Навагрудскага і Мінскага ўзвышшаў і ў крэйдавых кар'ерах Брэстчыны. Як вядома, камень нейтралізуе на атамным узроўні нітратныя злучэнні, адсарбіруе ў вадзе частку элементаў і шкодных для арганізма рэчываў, а іншую частку пераўтварае ў бяскшодныя для чалавека злучэнні.

Спецыяліст па маркетынгу Святлана Сцяцко кажа, што іх прадпрыемства — адзінае ў краіне, якое па ўласнай тэхналогіі «гатуе» «жывую ваду». Прадукцыя пастаўляецца ў гандлёвую сетку паўсюдна, разліваецца яна ў бутэлькі розных ёмістасцей. 5-літровая, напрыклад, у крамах каштуе 3250 рублёў.

Спецыяліст па маркетынгу баранавіцкага прадпрыемства Святлана СЦЯЦКО дэманструе «жывую ваду».

...З прадукцыяй Мінскага завода ацяпляльнага абсталявання знаёмы прынамсі кожны жыхар гарадской кватэры — па літых чыгунных радыятарах. Прадпрыемства з'яўляецца іх адзіным вытворцам у Беларусі і вырабляе — цяжка паверыць — з 1947 года, моманту адкрыцця завода. Вядома ж, за гэты час з'явіліся іншыя сучасныя матэрыялы, але нічога лепш за чыгун пад такія мэты пакуль не прыдумалі: па цеплааддачы, устойлівасці да карозіі.

— Да таго ж, напрыклад, аналагічная італьянская прадукцыя не правяраецца на цеплаўдар, у іх увогуле іншыя ўмовы падачы вады. Вы ж, напэўна, чулі пра затапленні кватэр у шматпавярховіках? А наша яго вытрымлівае, — расказала нам спецыяліст па маркетынгу і рэкламе завода Ірына Пляханава.

Акрамя таго, што прадпрыемства цалкам забяспечвае ўнутраны рынак у гэтай прадукцыі, яно яшчэ актыўна працуе з Казахстанам, Румыніяй, у яго моцныя дылеры ў Расіі. Хыццё не стаіць на месцы, таму змяняецца і дызайн звыклых нам радыятараў, з'яўляюцца і навінкі. Сярод апошніх — невялікі па сваёй вышыні радыятар, які зручна будзе размяшчаць пад акном.

Яшчэ на заводзе працуе цэх мастацкага ліцця. Тут вырабляюць агароджы (побач з оперным тэатрам — прадукцыя якраз гэтага прадпрыемства), лаўкі, урны, кветачніцы, каміны і іншае, зразумела, усё з чыгуну. Тут прымаюць нават заказы на чарцяжах заказчыка. Да месца будзе сказаць, што вядомы бабруйскі бабёр таксама быў адліты цэхам мастацкага ліцця Мінскага завода ацяпляльнага абсталявання. Гэтак жа, як і туфлік Папялушкі, усталяваны перад адным з аршанскіх ЗАГСаў, які так любяць «прымяраць» нявесты. Цэны на вырабы даволі дэмакратычныя. Скажам, адзін падлакотнік для лаўкі каштуе 82 тысячы рублёў. Ірына Пляханава зазначыла, што многія заказваюць толькі адны падлакотнікі, а драўляную частку лаўкі вырабляюць самастойна — кожны на свой капыл. Абавязкова дадам, што ўсе прадстаўленыя на выставе ўзоры мастацкага ліцця — вельмі прыгожыя.

Калі мы ўжо перайшлі ад «вады» да «цяпла», варта сказаць і некалькі слоў пра пячное і каміннае абсталяванне. Асабіста мяне ўразіла гатовая літая печ — усталёўвай і карыстайся — для загарадных дамоў і нават гарадскіх кватэр. Так, тут памылкі няма. Уяўце сабе чыгунную топку з празрыстымі — як у каміне — дзверцамі. Устаноўлена яна на своеасаблівай назе-падстаўцы і можа варочацца вакол сваёй восі! Так, такая печ патрабуе ўстаноўкі сістэмаў дымаходаў і выцяжкі, што, у сваю чаргу, патрабуе ўзгаднення такіх крокаў у адпаведных гарадскіх службах. Аднак, як запэўніў намеснік дырэктара беларускай кампаніі (што возіць каміннае і пячное абсталяванне 12 брэндаў з сямі краінаў свету) Дзмітрый Клемята, намаганняў і часу гэта запатрабуе не больш, чым пры афармленні перапланіроўкі ў гарадской кватэры. Каштуе, праўда, такая французская камінная печ некалькі дарагавата для сярэдняга пакупніка — каля 10 мільёнаў рублёў разам з сістэмамі дымаходаў і выцяжкі.

— Такія вырабы дэманструюцца ў нас, хутчэй, як узоры тэндэнцыі сусветнай моды. Калі вам сапраўды патрэбны варыянт для абагрэву жылля, выбірайце вось гэтую камінную топку, — правёў далей па экспазіцыі Дзмітрый Леанідавіч. — Каштуе яна ўсяго 1,2 мільёна рублёў, дазваляе ацяпляць жыллё плошчай да 120 квадратных метраў. Як мы жартуем, гэта варыянт для лянівых і рацыянальных людзей. Працэс гарэння можна рэгуляваць па працягласці і інтэнсіўнасці шляхам падачы і адтоку паветра.

Шмат цікавага раскажуць і пакажуць спецыялісты па маркетынгу і рэкламе Ірына ПЛЯХАНАВА і Аляксей ДЗЯМІДАЎ з Мінскага завода ацяпляльнага абсталявання.

...Зноў жа па традыцыі напрыканцы дададзім: лепш самому ўсё адзін раз пабачыць, чым некалькі пра тое ж — прачытаць. Выстава «Вада і цяпло» будзе працаваць да 24 красавіка ўключна. А, значыць, усіх зацікаўленых — труба кліча!

Сяргей РАСОЛЬКА.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

23 красавіка 2009 г. у 16.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) прадоўжыць работу другая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.

ШТО Ў «ПАКЕЦЕ»... САЦЫЯЛЬНЫМ?

Твае правы

Работа з 9 да 18 гадзін, высокая зарплата плюс сацыяльны пакет — сёння падобны «набор» для большасці аб'яў аб пошуку супрацоўнікаў можна назваць практычна стандартным. Між тым, прынамсі адно пытанне тут ёсць. Пра рэжым работы і зарплату зразумела кожнаму. Аднак нашмат менш вядома іншае — што такое... «сацыяльны пакет»?

ЗАКОН — НЕ ПРЫВІЛЕЯ

Падчас спробаў патэлефанаваць па аб'явах і высветліць, што ўсё ж маецца на ўвазе пад «сацыяльным пакетам», часцей за ўсё давялося пачуць прыкладна такія адказы — водпуск, аплата «бальнічных» і «дэкрэтных», залік работы ў пенсійны стаж, кампенсацыя камандзіровачных выдаткаў. Словам, раскладка нібыта простая. Калі б не адна вельмі цікавая акалічнасць.

— Прапанова прадастаўляць «сацыяльны пакет» гучыць заўсёды вельмі заманліва і прыгожа, — кажа **намеснік начальніка ўпраўлення знешніх сувязяў і партнёрскай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Людміла ЛЯШЧЫНСКАЯ.** — Але давайце разбірацца па сутнасці. «Сацыяльны пакет» — гэта пэўныя гарантыі «ў дадатак да закона», з дапамогай іх ставіцца на мэце зацікавіць работніка, павысіць вытворчасць працы, пазбегнуць «бягучкі» кадраў. Тым часам усё пералічанае вышэй трэба лічыць не якімі-небудзь «прывілеямі» ці «бонусамі». Бо гэта — звычайныя патрабаванні нашага заканадаўства. Прычым яны датычацца ўсіх найманых работнікаў і ўсіх работнікаў без выключэння.

У прыватнасці, заўважае Людміла Ляшчынская, пры любых умовах наймальнік проста абавязаны пералічваць за работніка ўзносы дзяржаўнага сацыяльнага страхавання, што дае права на залік пенсійнага стажу, «бальнічныя» і «дэкрэтныя» выплаты. Без залішніх «напамінаў» наймальнік мусіць плаціць прынамсі мінімальную зарплату, кампенсаваць камандзіровачныя выдаткі, павінен даваць як мінімум 24 каляндарныя дні працоўнага водпуску плюс як мінімум дзень водпуску па кантракце, вызначаць 40-гадзінны працоўны тыдзень. І ставіцца да гэтых гарантый як да «адвольнага варыянту» не выпадае — у адваротным выпадку давядзецца несці адказнасць.

АД ПУЦЁЎКІ ДА «МАБІЛЬНІКА»

Дадатковыя працоўныя і сацыяльныя гарантыі — тэма ўжо іншая. Па вялікім рахунку, «сацыяльны пакет» можа быць неабмежаваным, да прыкладу, ён можа «складацца» са зніжак на харчаванне, аднаразовых выплат з нагоды нараджэння ці пахавання, выплат да святаў і юбілеяў, прэмій, «лішніх» дзён водпуску, прадастаўлення аплатных водпускаў студэнтам і навучэнцам-завочнікам, аплаты стажыровак і курсаў павышэння кваліфікацыі, кампенсацыі найму жылых памяшканняў, беспрацэнтных пазык на будаўніцтва жылля, дадатковага пенсійнага страхавання, медыцынскіх страховак і медыцынскага абслугоўвання за кошт наймальніка, дапамогі на аздараўленне, льготаванні пуцёвак у санаторыі, бясплатных або льготных абанементаў у спартзалы, бясплатных турыстычных паездак, аплаты дзіцячых садкоў, урэшце, кампенсацыі за карыстанне паслугамі мабільнай сувязі.

— У гэтым выпадку гарантыі вызначае кожная арганізацыя, установа ці фірма па ўласным меркаванні, — распавядае Людміла Ляшчынская. — Пры гэтым зараз сацыяльны пакет выкарыстоўваецца амаль паўсюль. Праўда, аналіз сведчыць, што найбольшае распаўсюджванне тут атрымалі аплата аздараўлення і заняткаў спортам, зніжкі на харчаванне, заахвочванні да святаў і юбілеяў. А вось страхаванне медыцынскіх расходаў, страхаванне дадатковых пенсій і аказанне дапамогі ў вырашэнні жыллёвых пытанняў пакуль практыкуецца толькі на невялікай колькасці прадпрыемстваў.

УСІМ ЦІ КОЖНАМУ?

Звычайна «сацпакет» прадугледжваецца ў калектыўным дагаворы. Але гэта шлях не адзіны. Тыя або іншыя гарантыі, асабліва калі ў арганізацыі няма ўласнага прафсаюза і калдагавора, магчыма замацаваць у кантрактах або прадстаўляць на падставе загадаў ці распараджэнняў наймальнікаў.

Прычым варыянт працоўных дагавораў ці «кропачных» рашэнняў адміністрацыі, як правіла, мае адну асаблівасць — у гэтым выпадку бонусы могуць распаўсюджвацца не на ўвесь калектыў, а толькі на асобных яго членаў. Зрэшты, лічыць Людміла Ляшчынская, такі падыход з'яўляецца цалкам нармальным — ніхто не павінен забараняць кіраўніцтву заахвочваць перш-наперш тых супрацоўнікаў, у якіх яно зацікаўлена ў найбольшай ступені.

— Разам з тым і наймальнікам, і работнікам варта памятаць, што ўсе дадатковыя гарантыі павінны быць «пад'ёмнымі» для арганізацыі ці прадпрыемства, — зазначае Людміла Ляшчынская. — Калі пэўная планка вызначана, але забяспечыць яе адміністрацыя рэальна не ў стане, работнік можа дамагчыся выканання калектыўнага або працоўнага дагавора, і ў тым ліку праз суд. Аднак у сваю чаргу падобная акалічнасць з вялікай доляй верагоднасці адаб'ецца на фінансавым стане суб'екта гаспадарання, і, як вынік, на пытаннях зарплаты і захавання працоўных месцаў.

ВЫБІРАЦЬ... ГАЛОЎНАЕ

Якой-небудзь «абавязковасці» дадатковых гарантый у заканадаўстве няма, адпаведна, патрабаваць іх увядзення ад наймальніка таксама нельга. Тым больш, што варта заўважыць: аплата ўсіх «бонусаў» магчыма толькі з прыбытку, адносіць яе на сабекошт прадукцыі ці паслуг нельга. Прычым гэта ўмова агульная, яна датычыцца ўсіх суб'ектаў гаспадарання незалежна ад формы ўласнасці.

Зразумела, што лішніх грошай не бывае, і асабліва ў наш час. І ўсё ж ці варта адмаўляцца ад працоўных «бонусаў»?

— Цалкам адмаўляцца ад «сацыяльнага пакета» наўрад ці правільна, у рэшце рэшт, эфектыўнасць любой работы залежыць не толькі ад зарплаты, — адзначае Людміла Ляшчынская. — Аднак калі грошай не хапае, напэўна, іх не трэба дзяліць дробнымі часткамі на як мага больш напрамкаў, важна вызначыцца, што неабходна супрацоўнікам у першую чаргу. Скажам, галоўнымі для «шкоднай» вытворчасці могуць стаць пытанні аздараўлення, для арганізацый з высокімі зарплатамі — сумесныя турыстычныя паездкі, а для прадпрыемстваў з вялікімі «жыллёвымі праблемамі» — беспрацэнтныя пазыкі на будаўніцтва і дапамога ў пагашэнні крэдытаў.

Сяргей ГРЫБ.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ

КІРОЎЦУ ВЫЗВАЛЯЛІ ВЫРАТАВАЛЬНІКІ

У Мінску ў панядзелак а палове восьмай вечара на праспекце Незалежнасці аўтамабіль «Форд Сіера» лоб у лоб сутыкнуўся з джыпам «Вольва ХС90» пасля чаго загарэўся.

Як паведамілі ў аддзеле па агітацыі і прапагандзе ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама, паводле слоў відавочцаў, «Форд Сіера», за рулём якога знаходзіўся 46-гадовы мужчына, вельмі спяшаўся і выехаў на паласу сустрэчнага руху для абгону праз дзве суцэльныя лініі разметкі. У джыпа ад удару адарвала пярэдняе кола, пасля чаго машына па інерцыі праехала яшчэ 300 метраў на трох колах. А «Форд Сіеру» патушылі відавочцы і сведкі здарэння. Кіроўцу апошняй машыны заціснула ў салоне, і яго давялося вызваляць выратавальнікам: у бальніцу ён шпіталізаваны з закрытай ЧМТ лёгкай ступені, закрытым пераломам левага сцягна і ўдарам грудной клеткі.

Ігар ГРЫШЫН.

ШЧАСЛІЎЧЫКІ АТРЫМАЮЦЬ ПАМЯТНУЮ МАНЕТУ

Па выніках інтэрнэт-галасавання, якое праводзіцца з 15 красавіка па 31 мая, вызначацца пераможцы ў намінацыі «Прыз глядацкіх сімпатый» Міжнароднага конкурсу манет «Манетнае сузор'е-2009», які арганізуе выдавецтва «Уотэр Марк», паведамілі «Звяздзе» ва ўпраўленні інфармацыі Нацбанка.

Нацыянальным банкам Беларусі на конкурс, у якім бяруць удзел памятныя манеты, выпушчаныя з 1 студзеня па 31 снежня 2008 года, прадстаўлены манеты «Вялікая белая чапля», «Дзяды», «Легенда пра «зязюлю», «Заказнік «Ліпічанская пушча», «Навасёлле», «Прападобны Серафім Сароўскі», «Прападобны Сергій Раданежскі», «Свяціцель Мікалай Цудатворца», «Велікамучанік і лекар Панцеляймон», «Прападобная Ефрасіння Полацкая», «Рысь», «Рысі», «Турандот», «Алімпійскія гульні. Фігурнае катанне». Па выніках інтэрнэт-галасавання, у якім могуць узяць удзел усе ахвотныя на сайце http://www.coinconference.com/cgi-bin/coins2009_rus.cgi, манета, што набярэ максімальную колькасць галасоў, атрымае спецыяльны прыз глядацкіх сімпатый. Кожнай манеце можна паставіць ацэнку: ад 1 бала (самая нізкая) да 10 балаў (самая высокая). Сярод усіх удзельнікаў інтэрнэт-галасавання будуць разыграныя 10 памятных манет з каштоўных металаў.

Ігар ГРЫШЫН.

НЕЦВЯРОЗЫ БАМБІСТ

33-гадовы грамадзянін Расійскай Федэрацыі нарабіў перапалоху на беларуска-ўкраінскай мяжы.

Днём ён патэлефанаваў па тэлефоне 101 у Мазыры, назваўся па прозвішчы Гарбачоў і паведаміў, што ў цягніку Жытомір—Баранавічы, які вечарам будзе перасякаць беларускую мяжу, закладзена бомба. У баявую гатоўнасць былі прыведзены падраздзяленні міліцыі, МНС, мытні, аховы мяжы і КДБ Беларусі і Украіны. Састаў быў спачатку дасканальна правераны на станцыі Корасцень Жытомірскай вобласці, а потым дадаткова на станцыі Славечна Гомельскай. Інфармацыя аб выбуховай прыладзе не знайшла пацвярджэння. Затрымка цягніка склала 2 гадзіны 40 хвілін. Адначасова з правядзеннем комплексу мерапрыемстваў па забеспячэнні бяспекі шукалі жартаўніка. Знайшлі ў адной з вёсак раёна ў стане алкагольнага ап'янення. Такім ён быў і ў момант, калі тэлефанаваў у МНС. Дадаткова пра мужчыну вядома, што ён працуе цесляром на адным з мясцовых прадпрыемстваў, мае пасведчанне на права жыхарства ў Мазырскім раёне. Удзельнік чачэнскай вайны, дзе атрымаў кантузію. А самае галоўнае, пра што ён даведаўся, калі была ўзбуджана крымінальная справа: максімальнае пакаранне за лжывае паведамленне аб небяспецы складае да пяці гадоў пазбаўлення волі. Будзе час падумаць на цвярозую галаву.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

У АДНЫМ ДТЗ ЗАГІНУЛІ ТРОЕ...

Увечары ў панядзелак у Старадарожскім раёне ў дарожна-транспартнае здарэнне трапілі кіроўцы двух «Фальксвагенаў» — «Пасата» і «Гальфа».

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ва ўпраўленні Дзяржаўтаінспекцыі МУС, не справіўся з кіраваннем 23-гадовы жыхар Мінскага раёна, які атрымаў пасведчанне кіроўцы сёлета ў лютым: ідучы на апераджэнне на аўтамабілі «Фальксваген-Пасат», ён выехаў на сустрэчную паласу і сутыкнуўся з аўтамабілем «Фальксваген-Гольф», за рулём якога знаходзіўся 41-гадовы жыхар Слуцка. Для вадзіцеля апошняй машыны і яго 33-гадовага пасажыра (абодва не былі прышпіленыя рамянямі бяспекі), а таксама 67-гадовага пасажыра «Пасата» ДТЗ стала ракавым — яны загінулі. А вадзіцель «Пасата», і тры яго пасажыры — 18-гадовы хлопец, 28-гадовая жанчына і яе пяцігадовы сын — з траўмамі былі дастаўлены ў бальніцу.

А ў Рагачоўскім раёне за руль «Мерседэса» сеў 36-гадовы кіроўца, які быў пазбаўлены пасведчання летась за кіраванне ў стане алкагольнага ап'янення. Вынік гэтай язды таксама сумны: мужчына не справіўся з кіраваннем і «Мерседэс» з'ехаў у кювет, дзе ўдарыўся ў апору лініі электраперадачы і дрэвы. У ДТЗ загінула 24-гадовая жанчына, а два іншыя пасажыры змешчаны ў бальніцу.

Ігар ГРЫШЫН.

BYFLY — У КОЖНУЮ ГІМНАЗІЮ І ДЗІЦЯЧЫ САДОК

Доступ у інтэрнэт па тэхналогіі ADSL адкрывае для ўстаноў адукацыі новыя магчымасці. Інтэграцыя ў інфармацыйнае асяроддзе, уменне лёгка арыентавацца і выбіраць патрэбнае з вялікіх аб'ёмаў інфармацыі маюць важнае значэнне ў развіцці школьнікаў.

Byfly падтрымлівае сацыяльную праграму развіцця навучання ў Беларусі і працягвае супрацоўніцтва з установамі адукацыі. З 20 красавіка byfly пашырае сферу дзеяння сваіх пакетаў «Школьны эканом» і «Школьны стандарт». Цяпер на гэтыя пакеты могуць падключыцца не толькі агульнаадукацыйныя школы, але і спецыяльныя школы, дашкольныя ўстановы, гімназіі і ліцэі, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі, а таксама ўстановы прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Зразумела, што «школьныя» тарыфы выгадна адрозніваюцца ад іншых.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Міністры абароны Беларусі і Расіі падпісалі Дамову аб стварэнні сістэмы інфармацыйнага забеспячэння ваеннага супрацоўніцтва

Дамова была падпісана на пасяджэнні сумеснай Калегіі ваенных ведамстваў дзвюх краін, якая адбылася ў Мінску.

— Прынятае на пасяджэнні сумеснай Калегіі рашэнне накіравана на працяг стварэння Трывалага прававога фундамента Саюзнай дзяржавы, далейшую рэалізацыю палажэнняў ваеннай дактрыны, — зазначыў **міністр абароны Рэспублікі Беларусь генерал-палкоўнік Леанід МАЛЬЦАЎ**. — Стварэнне сістэмы інфармацыйнага забеспячэння ваеннага супрацоўніцтва абедзвюх краін дазволіць максімальна рэалізаваць патэнцыял інфармацыйных структур міністэрстваў абароны ў забеспячэнні ваеннай бяспекі нашых краін...

У рамках пасяджэння Калегіі былі зацверджаны таксама планаваныя дакументы аператыўна-стратэгічнага вучэння «Захад-2009». Гэта, паводле слоў Леаніда Мальцава, дазволіць вывучыць дасягненні ў галіне ваеннай тэорыі і практыкі і абмяняцца вопытам ваеннага будаўніцтва Беларусі і Расіі.

— Вучэнні стануць найбуйнейшым мерапрыемствам сумеснай аператыўнай падрыхтоўкі Узброеных Сілаў з моманту стварэння Саюзнай дзяржавы, — адзначыў **міністр абароны Расійскай Федэрацыі Анатоль СЕРДЗЮКОЎ.** — З расійскага боку плануецца прыцягнуць значныя па аб'ёме агульнавайсковыя групоўкі, істотныя сілы авіяцыі і ваенна-марскога флоту. У ходзе вучэнняў адбудзецца адпрацоўка элементаў аб'яднаўчай сістэмы сувязі рэгіянальнай групоўкі войскаў. Вучэнні пакажуць аб'ектыўную падрыхтаванасць органаў ваеннага кіравання войскаў у забеспячэнні бяспекі Саюзнай дзяржавы.

Рэалізацыя дасягнутых дамоў у рамках пасяджэння сумеснай Калегіі, паводле слоў Анатоля Сердзюкова, будзе ў поўнай меры садзейнічаць павышэнню боегатоўнасці Узброеных Сілаў і ўмацаванню абароназдольнасці абедзвюх краін.

Ілья ЛАПАТО.

Завяршаецца сяўба яравых збожжавых

Аб гэтым паведамілі ў Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання.

Яравыя збожжавыя і зернебабовыя (без кукурузы) пасеяны на 90 працэнтах запланаваных плошчаў. Сяўба гэтых культур поўнасцю завершана ў Гомельскай і Гродзенскай абласцях. У Брэсцкай вобласці пасеяна 96,9 працэнта да плана, Мінскай — 89,7 працэнта, Магілёўскай — 81,2 працэнта, Віцебскай — 67,9 працэнта.

Прадаўжаецца сяўба лёну, цукровых буракоў, яравога рапсу, кукурузы і бульбы. Так, цукровыя буракі займаюць ужо 50 працэнтаў адведзеных пад іх плошчаў, лён — 29 працэнтаў, бульба — 14 працэнтаў. Кукуруза высаджана на 32 тыс. га, што складае амаль 4 працэнты да плана, яравы рапс — прыкладна на 2 тыс. га (7 працэнтаў да плана).

У бліжэйшыя дні Мінсельгасхарч ацэніць, як паўплывалі замаразкі на стан азімых культур. «Мы пастаянна кантралюем, як уплываюць умовы надвор'я на стан пасеваў, для нас гэта вельмі важнае пытанне, такія даследаванні праводзяцца рэгулярна, — расказалі спецыялісты. — Аднак гаварыць аб тым, як паўплывалі апошнія замаразкі на будучы ўраджай, пакуль рана. Іх наступствы можна будзе назіраць толькі праз тры-чатыры дні, тады і можна будзе ўбачыць, ёсць адміранне пасеваў ці не, якія пашкоджанні азімых». Пакуль ні адна з абласцей не прадаставіла даныя аб тым, што халоднае з замаразкамі надвор'е прывяло да гібелі азімых. «Ні адзін рэгіён не заявіў аб стратах», — сказалі ў Мінсельгасхарчы.

БЕЛТА.

Паўторна забалочана 26 тысяч гектараў былых тарфянікаў

Агульная плошча праблемных зямель Беларусі, на якіх раней вялася прамысловая эксплуатацыя тарфяных радовішчаў, складае каля 226 тысяч гектараў, паведаміў журналістам намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Віталь Кулік.

Сельскагаспадарчая рэкультывацыя такіх зямель не заўсёды дае станоўчы эфект. Лепш аднаўляць на месцы тарфяных радовішчаў балотныя экасістэмы. Праблема ў тым, што кожны год тут адбываецца каля 4,2 тыс. пажараў, агульная плошча выгарання торфу складае 6,2 тысячы гектараў. У краіне ўжо ўзноўлена больш за 26 тыс. га такіх балотаў. Пры фінансавай падтрымцы глабальнага экалагічнага фонду (інвестыцыі каля 970 тысяч долараў) паўторна забалочваюцца яшчэ 42 тысячы гектараў былых тарфяных радовішчаў.

Сяргей КУРКАЧ.

І два за аднаго

Ягор Хрусталёў звольніўся з АНТ па ўласным жаданні

Літаральна за адзін дзень на Другім нацыянальным тэлеканале адбыліся нечаканыя кадравыя змены. Першы намеснік старшыні АНТ Ягор Хрусталёў, які працаваў на канале з моманту яго стварэння ў 2002 годзе, 20 красавіка раптоўна напісаў заяву аб звальненні.

У прэс-службе тэлеканала адзначаюць, што звольніўся прадзюсар, аўтар і вядучы ток-шоу «Выбар» па ўласным жаданні — «верагодна, таму, што атрымаў цікавую і выгадную прапанову за межамі краіны». Тэлефонны нумар Ягора Хрусталёва пакуль што недаступны, але мяркуецца, што пасля некалькіх дзён тайм-аўту, вырашыўшы ўсе пытанні, экс-супрацоўнік АНТ пракаментуе сітуацыю.

На пасаду першага намесніка старшыні праўлення ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал» прызначаны Сяргей Хоміч, які раней з'яўляўся кіраўніком дырэкцыі ранішняга вяшчання тэлеканала і вядомы таксама як прадзюсар праектаў «Адзін супраць усіх», «Зорны цырк», «Бітва гарадоў». Што да ток-шоу «Выбар», то ў мінулы панядзелак у ролі яго вядучага гледачы ўбачылі Сяргея Дарафеева; пасля эфіру было вырашана зацвердзіць яго ў гэтай ролі і надалей.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

«Tibo-2009» стартавала

Міжнародная спецыялізаваная выстава «Tibo-2009» адкрылася ўчора ў сталічным Футбольным манежы. Яна адбываецца ўжо ў шаснаццаты раз і таму стала традыцыйнай для Беларусі:

— Гэта мерапрыемства як бы падводзіць вынікі тэлекамунікацыйнага развіцця нашай краіны і нашых партнёраў за мінулы год, — сказаў на адкрыцці старшыня аргкамітэта выставы міністр сувязі і інфарматызацыі Мікалай Панцялей. Ён лічыць, што крызісныя з'явы не паўплывалі на ўзровень прадстаўніцтва на выставе і спадзяецца, што стратэгія далейшага развіцця галіны інфармацыйных тэхналогій, а таксама шляхі найменшых стратаў ва ўмовах крызісу будуць выпрацаваны на XVI Кангрэсе па тэхналогіях інфармацыйнага грамадства, які адкрыецца ў рамках выставы сёння.

Усяго ж у выставе «Tibo-2009» удзельнічаюць 124 экспаненты, якія дэманструюць прадукцыю 200 фірмаў з 12 краін. Так, на выставе можна падключыцца да трох мабільных аператараў, папіць з імі кавы і паўдзельнічаць у конкурсах, пасядзець «на халяву» ў інтэрнэце ад правайдараў па Wi-Fi, спытаць, колькі каштуе антывірус, прыцаніцца да GPS-навігатара, памераць ціск і пульс на інтэгралаўскай тэхніцы, падзівіцца на банкамат ад «Гарызонта», а таксама даведацца, што ў «Белпошты» з'явілася электронная марка і што падпісацца на любое перыядычнае выданне (у тым ліку і на «Звязду»!) можна праз інтэрнэт-сайт «Белпошты». Выстава будзе праходзіць да 24 красавіка, кошт уваходнага квітка ад 3000 да 6000 рублёў.

Павел БЕРАСНЕЎ.

УКЛАДЗЕНЫЯ Ў «ТОРФ» ГРОШЫ ДАЛІ АДДАЧУ

Ва Урадзе

Летась патрэбы беларусаў, а таксама паліўна-энергетычнага комплексу краіны ў тарфяным паліве і іншай прадукцыі на яго аснове былі поўнасцю задаволеныя, зазначыў на ўчарашнім пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў, якое праходзіла пад старшынствам прэм'ер-міністра Сяргея Сідорскага, міністр энергетыкі Аляксандр Азярэц. Дакладваючы аб ходзе выканання Дзяржпраграмы «Торф», Аляксандр Азярэц дадаў, што выпуск паліўных брыкетаў мог быць куды большым, аднак брыкетныя заводы былі вымушаныя прыпыняць вытворчасць, таму што вобласці не выбіралі вызначаныя праграмай аб'ёмы.

Паводле інфармацыі міністра, за мінулы год выбарка паліўных брыкетаў склала 80 % ад задання. Таму, каб стабілізаваць сітуацыю са збытам гэтай прадукцыі, летась рабіліся захады па актывізацыі экспарту. У выніку апошні летась у параўнанні з пазамінулым годам узрос у паўтара раза: на экспарт было пастаўлена амаль 349 тысяч тон паліўных брыкетаў. Сёлета, падкрэсліў Азярэц, у выпадку паўтарэння падобнай сітуацыі на ўнутраным рынку, экспартны патэнцыял па пастаўках торфабрыкетаў будзе павялічаны. Між іншым, ужо ў першым квартале аб'ёмы паставак гэтай прадукцыі за межы рэспублікі ў параўнанні з адпаведным перыядам 2008 года ўзраслі ў паўтара раза і склалі амаль 150 тысяч тон.

Закранаючы пытанне пра фінансаванне праграмы, Аляксандр Азярэц, у прыватнасці, паведаміў, што на яе рэалізацыю ў 2008 годзе было выкарыстана 101,2 мільярда рублёў. Пры гэтым асноўны аб'ём сродкаў быў накіраваны на набыццё тэхнікі і абсталявання, будаўніцтва плошчаў здабычы торфу, перааснастку брыкетных і машынабудаўнічых цэхаў. Укладзеныя грошы далі аддачу. Да прыкладу, закупленыя летась два высокатэхналагічныя фінскія комплексы для здабычы торфу дазволілі знізіць сабекошт адной тоны кавалкавага торфу ў разы — са 105 тысяч рублёў да 36 тысяч. Зараз сумесна з ААТ «Амкадор» будуць працягвацца эксплуатацыйныя выпрабаванні комплексу, каб вызначыцца з магчымасцю і эканамічнай мэтазгоднасцю па тыражыраванні згаданага абсталявання і выпуску аналагічнай прадукцыі айчыннай вытворчасці.

Сёлета ж на рэалізацыю Дзяржпраграмы «Торф» плануецца накіраваць каля 100 мільярдаў рублёў. Мяркуецца, што ў гэтым годзе будзе здабыта 2,7 мільёна тон торфу і выраблена 1,24 мільёна тон паліўных брыкетаў. Для здабычы торфу будзе адведзена 1100 гектараў плошчаў і пабудавана 770 гектараў палёў. Акрамя таго, працягнецца і мадэрнізацыя прадпрыемстваў, дзякуючы чаму сёлета плануецца знізіць затраты ў галіне на 9 % і палепшыць якасць прадукцыі, пашырыць яе наменклатуру. «А налета, — прапанаваў Аляксандр Азярэц, — трэба ўнесці ў праграму карэктывы з мэтай паменшэння фінансавання». Міністр лічыць, што ўкладзеныя ў «Торф» грошы за мінулы і гэты год далі пэўны эфект.

Падводзячы вынікі квартала, міністр адзначыў, што ў працы арганізацый торфяной прамысловасці захоўваецца станоўчая дынаміка. Так, у супастаўных цэнах выраблена прадукцыі на суму больш за 45 мільярдаў рублёў. Гэта, дарэчы, больш як на 13 % перавышае паказчык аналагічнага леташняга перыяду. За тры месяцы торфапрадпрыемствамі атрыманы прыбытак ад рэалізацыі прадукцыі 5,96 мільярда рублёў, чысты прыбытак — 3 мільярды, а рэнтабельнасць рэалізаванай прадукцыі склала 12,9 %.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

ЗДАМ КВАТЭРУ Ў ДОБРЫЯ РУКІ!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ЗАПАЛКІ, ВЯДРО І ШЧЫРЫЯ РАЗМОВЫ...

У студэнцкую пару мне даводзілася неаднойчы здымаць не кватэру нават, а пакой, бо на большае не хапала грошай. Так атрымлівалася, што кожную новую сесію я жыла ў іншай гаспадыні. Усе яны былі вельмі розныя, са сваім характарам, звычкамі, але ўсё ж нешта іх аб'ядноўвала.

Гаспадыня адной з кватэр, дзе мне давялося пажыць, чамусьці вельмі берагла запалкі. Калі я ішла на кухню, каб прыгатаваць ежу, а на пліце ўжо нешта варылася, гаспадыня прасіла мяне браць старую запалку, ад канфоркі, якая гарэла, падпальваць яе і толькі тады ўключаць новую. У яе нават была спецыяльная скрынка для ўжо выкарыстаных запалак. Калі ж я забывалася і падпальвала новую запалку, мая гаспадыня злавалася і казала, што я няправільна жыву, не так усё раблю і ўвогуле з маім марнатраўствам мяне замуж ніхто не возьме.

Яшчэ адна гаспадыня прымушала мыць посуд у спецыяльным тазіку. Потым ваду, што выкарыстоўвалася для гэтай мэты, патрэбна было выліваць у вядро, што стаяла ў прыбіральні. Пасля кожнага наведвання прыбіральні змываць патрэбна было менавіта вадой з гэтага вядра. І гэта пры тым, што ў кватэры функцыянавалі водаправод і каналізацыя.

Але больш за ўсіх мне запомнілася гаспадыня, у якой я жыла на кватэры ў апошні раз. Жанчыне было ўжо за 80. Яна была невысокага росту, даволі мажная, заўсёды нафарбаваная і з манікюрам. Хадзіла яна з палачкай, бо ў яе былі праблемы з нагамі. Ніякай спецыяльнай скрыначкі для запалак у яе не было і вядра ў прыбіральні таксама, затое мая бабулька вельмі любіла пагаварыць. Ды не абы пра што, а пра сваё інтымнае жыццё. Уявіце сабе, я, маладая 23-гадовая дзяўчына і яна, 80-гадовая бабуля, якая расказвае мне ўсе падрабязнасці свайго інтымнага жыцця. Мяне ў чырвань кідала ад гэтых падрабязнасцяў, і я не ведала, як спыніць такія размовы. А бабулька кожны вечар прыходзіла да мяне ў пакой, садзілася ў мяккае крэсла, свой кіёчак ставіла побач і пачынала... Яна расказвала, як да яе заляцаецца 70-гадовы мужчына і яна не ведае, адмовіць яму ў спатканні ці не. Назаўтра бабуля паведамляла ўжо пра спатканне, якое праходзіла ў яе кватэры, бо і яна, і той мужчына перасоўваліся з дапамогай кіёчкаў і ім было цяжка сустракацца яшчэ дзенебудзь. На трэці, чацвёрты і пяты дні ішлі падрабязнасці іх інтымных зносінаў. А потым мая гаспадыня прыйшла і сказала: «Усё, выгнала! Мужчына ён хоць куды і палюбоўнік адменны, але такі скупы, што і не порадаць. Дзе ж гэта бачна: прыходзіць да дамы толькі з бутэлечкай, а да бутэлечкі я павінна падносіць. Так жа і разарыцца нядоўга. Не, трэба другога кавалера шукаць». Знайшла яна сабе другога ці не, на маё шчасце, я так і не даведалася, бо хутка з'ехала ад гаварлівай бабулькі.

ШТО ПА ЧЫМ?

Каб не патрапіць у такую сітуацыю, вядома, лепш здымаць асобную кватэру. Для гэтага і час зараз спрыяльны — зацішша на рынку кватэр «у наём». Такая сітуацыя назіраецца кожную вясну-лета. Адзінае, чым сёлетні сезон адрозніваецца ад іншых — славуты крызіс паўплываў на цэны. Калі да новага года, каб зняць «аднапакаёўку», патрэбна было мець 300 долараў, то цяпер і 180 дастаткова. Нярэдка гаспадары згодныя нават аплачваць камунальныя паслугі, каб толькі здаць жыллё.

З'яўленне вялікай колькасці кватэр звязана яшчэ вось з чым. Уладальнікі, якія хацелі прадаць кватэру, зразумелі: за тую цану, што яны прасілі, яе ніхто не купіць, а аддаваць за меншую яны не хочуць. Таму гаспадары занялі чакальную пазіцыю, а каб жыллё не пуставала, вырашылі здаваць яго.

Сёння за 180-200 «зялёненькіх» можна зняць аднапакаёвую кватэру ў Курасоўшчыне, Серабранцы, Чыжоўцы, Малінаўцы, Паўднёвым Захадзе, на вул. Ангарская, Герасіменкі. Трошкі даражэй, 200-220 долараў, каштуюць кватэры ва Уруччы, у Зялёным Лузе, Куншаўшчыне, Сухарава, на Захадзе, Лошыцы, 210-230 — каля станцыі метро Пушкінская. Ад 220 да 350 долараў патрэбна будзе заплаціць, калі хочаце жыць у Вяснянцы. У раёне вуліцы Захарава, пл. Перамогі, Камароўкі «аднапакаёўкі» каштуюць 250-350 умоўных адзінак. Самае дарагое жыллё — у цэнтры сталіцы: 300-450.

Зразумела, што танныя «аднапакаёўкі» карыстаюцца найбольшым попытам. Іх ахвотна «бяруць» студэнты, маладыя, якія толькі пажаніліся, і людзі, якія скасавалі шлюб.

«Двушкі» здымаюць часцей сем'і з дзецьмі. На двухпакаёвыя кватэры цэны прыкладна такія: Курасоўшчына, Лошыца, Серабранка — 210-250 долараў; Малінаўка, Паўднёвы Захад — 230-250; Куншаўшчына, Сухарава, Захад — 250-270; Уручча — 250-300; Камароўка — 250-330; Зялёны Луг — 300; Захарава, плошча Перамогі — 300-380; каля станцыі метро Пушкінская — 300-450. Ад 350 долараў каштуе жыллё ў Вяснянцы, на праспекце Пераможцаў, на вуліцы Заслаўская. Самыя танныя «двухпакаёўкі» — у Чыжоўцы, у раёне вуліц Ангарская, Герасіменкі (200-220), а самыя дарагія — у цэнтры (400-530).

Але дырэктар агенцтва ўпэўненая, што больш выгадна не здымаць жыллё і плаціць грошы ў чужую кішэню, а з дапамогай крэдыту купіць уласную кватэру.

— Зараз для набыцця свайго «даху» самы спрыяльны час, — кажа Людміла Васільеўна. — Раней, каб купіць «аднапакаёўку», патрэбна было мець каля 70 тысяч долараў, цяпер яе можна знайсці за 50 і нават меней. Чакаць таго, што кватэры патаннеюць яшчэ, на маю думку, не варта. Цэны, можа, і паўзуць пакрыху ўніз, але танныя кватэры разбіраюць, і ёсць небяспека, што хутка іх не застанецца.

ДАГАВОР НАЙМУ: БЫЦЬ АБО НЕ БЫЦЬ?

Як паведамілі мне ў агенцтве нерухомасці, часта дагавор найму заключаецца тады, калі здаецца кватэра з добрымі рамонтам і мэбляй. Гаспадар хоча сябе засцерагчы ад небяспеці, каб у выніку якіх-небудзь прэтэнзій да кватэранаймальніка ў яго была падстава звярнуцца ў суд.

Каля 70 працэнтаў тых, хто звяртаецца ў агенцтва, заключаюць дагавор найму. Гэта выгадна і для кватэранаймальніка (чалавек можа быць упэўнены, што яго не папросяць з кватэры праз месяц), і гарантыя спакою для ўладальніка. Бывалі выпадкі, калі праз месяц у агенцтва зноў прыходзілі людзі, якім нядаўна падабралі жыллё. Дагавор найму з гаспадаром яны не заключалі, той чамусьці перадумаў здаваць кватэру і папрасіў кватэранаймальнікаў «вызваліць памяшканне». Вядома, за ўладальнікаў агенцтва не адказвае, але ў гэтым выпадку давялося для кліента шукаць новае жыллё бясплатна. Марку трэба трымаць!

Больш за тое, дагавор найму — гарантыя, што аднойчы да вас у дзверы не пастукаецца прадстаўнік падатковай інспекцыі.

— Калі чалавек здае сваё жыллё неафіцыйна, рана ці позна мы ўсё адно яго знойдзем, — жартуе **Ірына ЯСКЕВІЧ, начальнік управління кантролю за індывідуальнымі прадпрымальнікамі і фізічнымі асобамі інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па горадзе Мінску.**

Адным словам, заплаці што патрэбна — і спі спакойна. Вось і спяць спакойна 23 855 кватэраздатчыкаў, якія на 1 красавіка 2009 года зарэгістраваліся ў якасці плацельшчыкаў падатку з даходаў ад здачы памяшкання ў наём. У параўнанні з мінулым годам іх колькасць павялічылася на 3439.

Толькі за першы квартал гэтага года ад такіх плацельшчыкаў у бюджэт паступіла 2,8 млрд рублёў. Грошы паступаюць не толькі ад добрасумленных падаткаплацельшчыкаў, але і ад тых, хто здае кватэру неафіцыйна. Так, за студзень-сакавік 2009 года было праверана 197 чалавек і высветлілася, што 193 з іх здавалі кватэру незаконна. У выніку гэтыя людзі заплацілі штрафаў і падаткаў на суму 34 мільёны рублёў.

Каб пазбегнуць праблем з падатковай інспекцыяй, дастаткова толькі ў ЖЭСе па месцы жыхарства запоўніць тыпавы дагавор з абавязковым пазначэннем сумы, за якую здаецца кватэра, а потым выплачваць падаходны падатак не пазней за першы дзень кожнага месяца. Яшчэ падатак можа выплачвацца раз у год. Гэты спосаб больш выгадны, бо пры змяненні базавай велічыні, ад якой залежыць сума падатку, даплата рабіцца не будзе. Калі ж чалавек наведвае інспекцыю штомесяц, то са змяненнем базавай велічыні мяняецца і сума.

Падатак вызначаецца ў залежнасці ад колькасці здадзеных пакояў. Калі здаецца адзін пакой — адна базавая велічыня, два — дзве і г.д. Праўда, існуе яшчэ такое паняцце, як павышаючы каэфіцыент. Гэта значыць, падатак вызначаецца ад месца знаходжання кватэры. Напрыклад, калі яна ў цэнтры сталіцы, тады за адзін пакой гаспадар будзе плаціць не адну базавую велічыню, а дзве. Дзе-небудзь на ўскраіне горада такога каэфіцыента няма.

Калі кватэра здаецца на гадзіны, суткі, размова ідзе пра прадпрымальніцкую дзейнасць. У гэтым выпадку чалавеку патрэбна зарэгістравацца ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка. Яшчэ нядаўна па гэтым відзе дзейнасці не існавала стаўкі адзінага падатку. А цяпер, згодна са зменамі, унесенымі ва Указ Прэзідэнта № 285 і рашэннем Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў ад 11 сакавіка 2009 № 219, вызначаны наступныя стаўкі адзінага падатку: калі прадпрымальнік здае адну кватэру — 70 еўра ў месяц, дзве і больш — 100, жылы дом ці катэдж — 130 еўра. Але, зноў жа, сума залежыць ад месца знаходжання кватэры. Напрыклад, у Шабанах за здачу адной кватэры падатак складзе 56 еўра, дзвюх і больш — 80.

Марына ЛЯВОШКА.

Абзац

■ **У Мінску цяпер жывуць 74 доўгажыхары, што перакрочылі праз 100-гадовы рубеж, паведамілі БЕЛТА ў камітэце па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама. Да векавога юбілею дажылі 62 жанчыны і толькі 12 мужчын. Старэйшай жыхаркі сталіцы Клаўдзіі Якімовіч споўнілася 114 гадоў.**

■ Збор падснежнікаў у лесе можа абярнуцца штрафам да 50 базавых велічыняў, што складае Br1 млн 750 тыс. паведамілі БЕЛТА ў Мінскім гарадскім камітэце прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Эколагі заклікаюць не парушаць заканадаўства, што забараняе збор першых веснавых кветак. Яны раяць таксама не купляць кветак у браканьераў, каб не заахвочваць парушальнікаў.

■ **Супрацоўнікі ўпраўлення КДБ па Брэсцкай вобласці канфіскавалі ў жыхара Брэсцкага раёна нелегальную партыю вадкакрысталёвых тэлевізараў і мэблі польскай вытворчасці. Паводле папярэдняй ацэнкі, кошт тавару — больш за Br40 млн. Вядзецца праверка.**

■ Падземны пераход для жабаў з'явіцца ў Белавежскай пушчы. Ён будзе ўяўляць сабой некалькі труб, пракладзеных пад аўтадарожным мостам. Гэта дазволіць скараціць гібель амфібій, што ідуць на нераст, як мінімум удвая, лічаць эколагі. Першы ў СНД падземны пераход для земнаводных быў пабудаваны ў 2007 г. на хуткаснай трасе Мінск—Віцебск на тэрыторыі Бярэзінскага біясфернага запаведніка.

■ **Жыхарку Нясвіжа, якая забіла да смерці сваю маленькую дачку, суд прыгаварыў да 20 гадоў пазбаўлення волі. 27-гадовая жыхарка Нясвіжа ў снежні мінулага года нанесла каля 50 удараў рукамі і драўлянай палкай сваёй дачцэ. Дзяўчынка памерла ад шоку і страты крыві. Абвінавачаная падала касацыйную скаргу.**

■ Лельчыцкі раённы суд прыгаварыў былога міліцыянера, які вінаваты ў двух згвалтаваннях, да 9 гадоў пазбаўлення волі. 25-гадовы экс-міліцыянер быў затрыманы сёлета ў лютым па падазрэнні ў згвалтаванні 15-гадовай школьніцы. Было таксама даказана, што ён згвалціў два гады таму работніцу чыгуначнай станцыі.

■ **Паляванне на дзікоў скончылася для 41-гадовага жыхара Касцюковічаў двума гадамі папраўчых работ. Парушальнік разам з сябрамі паляваў каля вёскі Белы Камень, але замест звера падстрэліў аднаго з паляўнічых, які не папярэдзіў аб перамяшчэнні. Ад атрыманых ранаў пацярпелы памёр на месцы. Гора-паляўнічы прызнаны вінаватым у прыкладанні смерці па неасцярожнасці, яму прызначана пакаранне ў выглядзе 2 гадоў папраўчых работ па месцы працы з утрыманнем у даход дзяржавы 25 % заробку.**

■ Нехта ўкраў аўтамашыну «ВАЗ-2106», якая стаяла каля дома № 32 па вул. Прамысловай у Баранавічах. Праз два тыдні яе знайшлі ў Пухавіцкім раёне ў нармальным стане, але без нумароў. Выявілі і злодзея. На ўкрадзенай «шасцёрцы» праехаўся па сваіх справах жыхар г/п Гарадзішча, што пад Баранавічамі.

Поўны абзац

■ **Два брытанскія гастраномы адкрылі ў цэнтры Лондана кактэйль-бар «Алкагольная архітэктура». Гэтая ўстанова цікавая не столькі сваёй назвай, колькі спосабам ужывання напояў — яны літаральна разлітыя ў паветры, іх трэба ўдыхаць. Аплата ў бары, які разлічаны на 40 чалавек, пагадзінная — 5 фунтаў ($7,4). Хоць наведвальніку для таго, каб стаць весялейшым, дастаткова прабыць у бары 40 хвілін. Тут раздаюцца гукі, што нагадваюць шум вадкасці, якая льецца, а таксама звон кубікаў лёду ў шклянцы. Залу зацягвае «алкагольны туман», які ўдыхаюць кліенты. Туман мае тую ж моц, што і звычайны джын з тонікам.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

У латарэі зноў пашанцавала гамяльчанам

Напярэдадні Вялікадня ў Мінску адбыўся чарговы 374-ы тыраж латарэі «Ваша лато». Галоўным прызам у ім была новая аднапакаёвая кватэра ў сталіцы краіны па вуліцы Сыракомлі коштам у 119,2 мільёна рублёў. Фартуна, як кажуць, усміхнулася тром гульцам з Гомельшчыны, якім і дастаўся той прыз. На долю кожнага з іх прыпадае па 39,7 мільёна рублёў.

Як расказаў нам вядучы спецыяліст аддзела распубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Беларускія латарэі» Леанід Кандратаў, гэта ўжо не першая ўдача гамяльчан у латарэйнай гульні. Так, напрыклад, у снежні мінулага года ў час розыгрышу прызавога фонду 356-га тыражу латарэі «Ваша лато» і пятага тыражу латарэі «Пяцёрачка» гамяльчанам дасталіся новая трохпакаёвая кватэра ў Гродне і галоўныя грашовыя прызы ў суме адпаведна ў пяць і дзесяць мільёнаў рублёў. А наогул летась жыхарам вобласці, якія гулялі ў лато, было выплачана звыш 2114 мільёнаў рублёў у якасці выйгрышаў.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов, расположенных на территории Шабабского сельсовета Логойского района:

№ лота	Адрес земельного участка	Площадь земельного участка	Расходы по подготовке документации	Начальная цена (рублей)	Задаток (рублей)
1	д. Погребище, участок № 2	0,2082 га	1 290 604 руб.	8 328 000	830 000
4	д. Ганевичи	0,1853 га	1 290 604 руб.	1 853 000	185 000
5	д. Молоди, участок № 4	0,2076 га	1 423 514 руб.	8 304 000	830 000
6	д. Молоди, участок № 5	0,2075 га	1 423 514 руб.	8 300 000	830 000
7	д. Молоди, участок № 6	0,1970 га	1 423 514 руб.	7 880 000	780 000
8	д. Молоди, участок № 8	0,1567 га	1 290 604 руб.	6 268 000	620 000
9	д. Молоди, участок № 9	0,1671 га	1 290 604 руб.	6 684 000	660 000

Земельные участки в д. Погребище, д. Ганевичи расположены в водоохранных зонах р. Маковза и ручья. Подробное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 24.02.2009 г. Аукцион состоится **12.05.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **11.05.2009 г.** до 17.00 по вышеуказанному адресу.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

УНП 690324015

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» ПО ПОРУЧЕНИЮ УПРАВЛЯЮЩЕГО В ДЕЛЕ О БАНКРОТСТВЕ РУП «БАРАНОВИЧСКАЯ ФАБРИКА ПОШИВА И РЕМОНТА ОБУВИ»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже имущества, расположенного по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. М. Богдановича, д. 11а, в составе: здания специализированные для производства текстильных, швейных и кожаных изделий (общ. пл. 565,9 кв.м, 684,7 кв.м, 639,5 кв.м), здание специализированное иного назначения (общ. пл. 290,6 кв.м), склады-гаражи (общ. пл. 280,1 кв.м), проходная (общ.пл. 13,2 кв.м), заборы железобетонный (дл. 40,58 м) и металлический (дл. 50,8 м), дворовое асфальтовое покрытие (пл. 1062 кв.м). Площадь земельного участка составляет 0,2969 га. Начальная цена 1 832 455 долларов США с НДС. Задаток в размере 100 000 долларов США перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Объекты продаются без условий. Результаты аукциона оформляются протоколом. Договор купли-продажи подписывается сторонами в течение 10 дней с даты проведения аукциона. Оплата объекта в течение 30 дней с даты проведения торгов. Все платежи производятся в бел. руб. по курсу НБ РБ на дату платежа. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **30.04.2009 г.** в 14.00 по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, 11а. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **29.04.2009 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактные телефоны: (8017) 224 61 34, (8029) 6332490.
Сайт в интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» ПО ПОРУЧЕНИЮ МАЧУЛИЩАНСКОГО ПОСИСПОЛКОМА

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельного участка в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в Минском районе, д. Александрово, ул. Лесная, пл. участка 0,1480 га, кадастровый номер 623675200501000064, начальная цена – 46 000 000 рублей, в непосредственной близости имеются сети электроснабжения, водоснабжения, газоснабжения. Участок расположен в зоне санитарной охраны поверхностных и подземных источников водоснабжения. Задаток в размере 5 % от начальной цены перечисляется на р/с 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой документации в сумме – 764 846 рублей. Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельным участком. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **02.06.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **27.05.2009 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34.
Наш сайт в интернете: www.rlt.by.

Другі адкрыты чэмпіянат па фотапаляванні пройдзе ў Беларусі 2 мая

Другі адкрыты чэмпіянат Беларусі па фотапаляванні пройдзе 2 мая ў пойме Прыпяці на Тураўскім лузе (Жыткавіцкі раён), паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшыны» (АПБ).

У спаборніцтвах могуць прыняць удзел усе жадаючыя фотапаляўнічыя з Беларусі і замежных краін, якія маюць фотаапаратуру з даўгафокуснымі аб'ектывамі.

БЕЛАРУСКІ БАНК МАЛОГА БІЗНЭСУ НАРОШЧВАЕ СТАТУТНЫ ФОНД

Статутны фонд ЗАТ «Беларускі Банк Малога Бізнэсу» будзе павялічаны на 3,5 мільёна еўра і складзе 10,5 мільёна еўра, — паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў прэс-службе банка.

Рашэнне аб павелічэнні статутнага фонду было прынята на пасяджэнні акцыянераў і Савета дырэктараў банка. Акрамя таго, праінфармавалі ў банку, 16 красавіка на пасаду старшыні праўлення Беларускага Банка Малога Бізнэсу ўступіў грамадзянін Канады Стывен Арлескі, які, між іншым, мае 10-гадовы вопыт працы ў банках краін СНД і з'яўляўся кіраўніком праекта па стварэнні згадан

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

22 красавіка 2009 г. № 15 (167)

ПОСЛЕ ВЫСТУПЛЕНИЯ «МС»

ПЕРЕРАСЧЕТ БУДЕТ ПРОИЗВЕДЕН

В № 10 «Местного самоуправления» (18.03.09) была опубликована статья «600 рублёў плацім, 665 — у галаве?», где говорилось о том, что некоторые перерабатывающие предприятия поторопились снизить цены на молоко 1-го сорта, закупаемое у личных подсобных хозяйств, с 665 до 600 рублей за литр.

В редакцию продолжают поступать реагирования на статью (см. № 14 за 15.04.09).

«Климовичский районный исполнительный комитет, рассмотрев критический материал «600 рублёў плацім, 665 — у галаве?», опубликованный 18.03.2009 года и касающийся снижения закупочных цен на молоко от населения, сообщает.

9 февраля 2009 г. вступило в силу Постановление Совета Министров Республики Беларусь № 164 «О внесении изменений в Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 5 июня 2008 г. № 812», согласно которому закупочные цены на продукцию животноводства, реализуемую для государственных нужд, были снижены.

11 февраля 2009 г. в дополнение получено письмо Министерства сельского хозяйства и продовольствия № 03-4-8/1378, в котором рекомендовано оплачивать молоко, закупаемое у населения, по ценам не ниже действовавших до 9 февраля 2009 г. — в целях недопущения снижения его объемов и уменьшения доходов сдатчиков.

Жители Климовичского района проживают в сырьевой зоне ОАО «Мстиславский маслодельно-сыродельный завод», соответственно, реализуют молоко данному предприятию. В связи с тяжелым финансовым положением предприятия в период с 9 февраля по 31 марта 2009 г. в расчетах с населением за молоко применялась цена 600 рублей за 1 кг.

В соответствии с постановлением коллегии комитета по сельскому хозяйству и продовольствию Могилевского облисполкома от 30.03.2009 года № 5, ОАО «Мстиславский маслодельно-сыродельный завод» с 1 апреля 2009 г. в расчетах с населением за молоко применяется закупочная цена 665 рублей за 1 кг. В течение апреля 2009 г. будет произведен перерасчет стоимости молока, закупленного у населения с 9 февраля по 31 марта 2009 г., по закупочной цене не ниже 665 рублей за 1 кг.

А.П. СУДИЛОВСКИЙ,
первый заместитель председателя, начальник управления сельского хозяйства и продовольствия райисполкома».

НА СЛЫХУ

СЦЕРАЖЫСЯ ЗГРАІ, або БЯСШУМНАЯ ЛІКВІДАЦЫЯ

...Леташні трагічны выпадак у Бабруйску, калі маладую дзяўчыну моцна пакалечыла зграя сабак, атрымаў шырокі рэзананс. Праблема бяздомных жывёл зноў прыцягнула ўвагу грамадскасці. Высветлілася, што выпадкі нападзення сабачых зграй на людзей неаднойчы здараліся і ў іншых населеных пунктах.

У гэтай сітуацыі, як бы ні заклікалі абаронцы жывёл праяўляць больш гуманнасці да вулічных тузікаў і бобікаў, першаснае значэнне ўсё ж мае пытанне бяспекі грамадзян. Пасля няшчасця ў Бабруйску ў горадзе былі прыняты экстранныя меры па барацьбе з бяздомнымі сабакамі. А як гэтую праблему вырашаюць на сваёй тэрыторыі мясцовыя сельскія Саветы раёна, дзе безнаглядных сабак таксама хапае?

— Увогуле, праблема з бяздомнымі жывёламі ў сельскай мясцовасці існавала заўсёды, — расказвае **старшыня Бабруйскага раённага Савета дэпутатаў Леанід БАРКОЎСКІ**. — Пытанне толькі ў тым, як праводзіць іх адлоў і знішчэнне. Раней старшыня сельвыканкама мог дамовіцца з мясцовымі паляўнічымі, набыць ім патроны, а яны выязджалі ў поле (бо ў межах населенага пункта карыстацца зброяй нельга) і адстрэльвалі сабак. З вопыту магу сказаць, што самае галоўнае — забіць важака зграі, астатнія, як правіла, адразу разбягаюцца. Вельмі небяспечна, калі ў зграю трапляе хоць адзін дрэсіраваны байцоўскі сабака (як атрымалася ў выпадку з маладой дзяўчынай). Тады байцоўскі першым накідваецца на ахвяру, а ўсе астатнія — за ім.

Некалі нашы Саветы прымянялі нестандартныя метады вырашэння праблемы, напрыклад, рабілі спецыяльныя прынады. На полі, па-за межамі населенага пункта клалі мяса, прывязвалі, каб сабакі з ім не збеглі, і чакалі, калі на яго пах прыбяжыць зграя. Паляўнічым заставалася толькі абкружыць і адстрэліць жывёл. Цяпер паслугамі паляўнічых мы не карыстаемся.

Паводле слоў Леаніда Андрэевіча, у раёне летась былі зацверджаны Правілы ўтрымання дамашніх сабак і катоў, пры службе ЖКГ створана брыгада па адлове безнаглядных жывёл у населеных пунктах. Пакуль ішоў працэс яе фарміравання, сельскія Саветы супрацоўнічалі з гарадской арганізацыяй «БУКСАП» (Бабруйскае ўнітарнае камунальнае спецыялізаванае аўтатранспартнае прадпрыемства). У адрозненне ад паляўнічых, работнікі БУКСАПа карыстаюцца пнеўматыкай і страляюць не патронамі, а дроцікамі са снатворным. Гэта больш гуманны і бясшумны спосаб ліквідацыі.

— Важнае значэнне ў барацьбе з бяздомнымі жывёламі мае прафілактычная работа, якую мы праводзім сярод мясцовых жыхароў. Напярэдадні чарговага планавага рэйду мы абавязкова развешваем па населеных пунктах аб'явы, што ў такі дзень, у такі час будзе праводзіцца адстрэл. Людзі адразу прывязваюць сваіх сабак на ланцуг.

Асабліва актуальнае пытанне адлову безнаглядных тузікаў у прыгарадных сельсаветах раёна — Слабадкоўскім, Глушанскім, Хімоўскім. Летась у Глушанскім работнікі «БУКСАПа» адлавілі 25 сабак, у Хімоўскім — 24. Разлік за работу ідзе ў залежнасці ад колькасці галоў жывёл і ад працягласці маршруту брыгады. Так, апошні адлоў для Слабадкоўскага сельсавета, падчас якога быў знішчаны 21 сабака, абышоўся ў 560 тысяч рублёў. «Дзякуючы таму, што мы размяшчаемся блізка да горада, транспартныя расходы «БУКСАПа» былі мінімальнымі. Адпаведна і сума была не самай вялікай», — патлумачыў старшыня Слабадкоўскага сельскага Савета дэпутатаў Аляксандр Пінцэвіч

На 2009 год усе 14 сельсаветаў Бабруйскага раёна заключылі дагавор на абслугоўванне з новаствонаранай спецбрыгадай ЖКГ, якая мае ліцэнзію на адлоў, утрыманне і эўтаназію безнаглядных сабак, і якая, як і БУКСАП, прымяняе дроцікі са снатворным.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ФАБРЫКА ТАВАРАЎ І ПАСЛУГ У МІНІЯЦЮРЫ

Сельскую бытоўку ратуе выязны гандаль

Кожныя выхадныя ў некалькіх пунктах абласнога цэнтра стаяць машыны Жабінкаўскага камбіната бытавога абслугоўвання з таварам уласнай вытворчасці. Коўдры, падушкі, пасцельную бялізну, фланелевыя кашулі і паркалёвыя сукенкі, а яшчэ трыкатажныя вырабы, наматрацнікі і цэлы шэраг іншых патрэбных у гаспадарцы рэчаў.

— Таму, відаць, і цягнуць з дазволам гандляваць каля ЦУМа, што ў нас таннейшае, — смяецца Таццяна Ваканюк, якая ў Вербную нядзелю працавала каля рынка «Кавалёва» ў Брэсце. — Камплект добрай якаснай пасцельнай бялізны мы прапануем за 60 тысяч рублёў, падушкі ў нас самыя танныя, а мяккія цёплыя кашулькі з фланелі, жаночыя кофты, што любяць пажылыя вясковыя людзі, вялікая прамысловасць амаль і не выпускае.

Кожнаму пакупніку жанчына падрабязна расказвае пра перавагі якасці і цаны свайго тавару, наматрацнікі ў выпадку набыцця прапануе падвезці дадому ў канцы змены, маладзейшым раіць набыць для вясковых бацькоў што-небудзь з недарагога адзення.

Таццяна Ваканюк — гандляр вопытны. Са сваёй аўтакрамай аб'ездзіла амаль усю Беларусь: Навапалацк, Віцебск, Гомель, Слонім. А ўжо ў вобласці кожны куточак, здаецца, наведала. Сама яна працуе на сельскім комплексным прыёмным пункце ў Ракітніцы. Апошнім часам выязджае на выхадныя галоўным чынам у Брэст. Бо далёкія камандзіроўкі, калі сям'ю даводзіцца пакідаць дні на тры, усё ж стаміляюць. А тут пастаяў за прылаўкам паўдня, а праз гадзіну — ужо дома. Вось такая праца ў сельскай прыёмшчыцы ўстановы бытавых паслуг: тыдзень працуеш на месцы, абслугоўваеш наведвальнікаў, а ў выхадныя — на выезд. «Трэба ж круціцца, — падсумоўвае Таццяна Ваканюк. — Нам зарплата, а прадпрыемству — план».

Так, менавіта ўменнем «круціцца», а не спаць у шапку, тлумачыць поспехі камбіната бытавога абслугоўвання яго дырэктар Валянціна Юхімук. Напрыклад, па выніках 2007 года КБА самага маленькага раёна краіны стаў лепшым у рэспубліцы. Пра гэта сведчыць адпаведны дыплом у кабінеце дырэктара. А сама Валянціна Юхімук рашэннем аблвыканкама занесена ў спісы абласной дошкі пашаны. Там зараз і размешчаны яе партрэт.

Валянціна Анатольеўна перагортвае свой рабочы блакнот:

— За сёмы год прадалі тавараў і аказалі паслуг на суму ў 1 мільярд 378 мільёнаў рублёў, за восьмы — 1 мільярд 823 мільёны. Усяго ў нас 12 комплексных прыёмных пунктаў, 9 — у сельскай мясцовасці. У асноўным вясковыя КПП за год прадаюць тавараў і паслуг крыху больш, чым на 400 мільёнаў рублёў. Калі ў некага паказчыкі ўдвая меншыя, мы разглядаем іх як дрэнныя. Зараз вельмі складана працаваць у вёсцы, — працягвае дырэктар, — у многіх населеных пунктах застаюцца адны пенсіянеры. Але ж стараемся. Аўтакрама пайшла — мы за ёю, пенсію паштальён павёз — мы за ім. Даўно ўвайшлі ў практыку падворныя абходы вяскоўцаў. Лічыцца, што толькі спецыялісты сельскага Савета альбо паштальёны абходзяць усе хаты. Нашы работнікі таксама наведваюць і працаўнікоў, і старых, і адзінокіх, расказваюць, якія паслугі мы аказваем, запісваюць папярэднія заказы.

А ў райцэнтры, на месцы, жабінкаўскія бытавікі маюць свой швейны цэх, які выпускае пасцельную бялізну, коўдры, падушкі. Яшчэ адзін цэх займаецца вырабам трыкатажнага адзення. Швейнікі таксама працуюць з адзеннем: пашыў, рамонт і пашыў па індывідуальных заказах. У хімчыстку і пральню заказы вязуць у Брэст. А вось хімчыстку дываноў наладзілі нядаўна ў сябе — асабліва перад вясновымі святамі заказы валам валяць. Ёсць яшчэ цэх па вырабе жалезабетоннай агароджы, калодзежных кольцаў. Названая прадукцыя ідзе нядрэнна асабліва ў вёсках. Хутка гэты міні-заводзік пашырыць вытворчасць і прыступіць да вырабу тратуарнай пліткі. Наладжаны комплекс рытуальных паслуг, ёсць спецыяльная машына. Раней, паводле слоў спецыялістаў, яна больш была запатрабавана ў горадзе, зараз нярэдка выязджае і ў вёску.

Словам, увесь комплекс паслуг сельскі жыхар можа атрымаць на месцы тут жа купіць тавар па даступных цэнах. На тыя КПП, дзе няма штатных цырульнікаў, спецыяліст выязджае па графіку альбо па папярэдніх заяўках. Рамонт абутку таксама

Таццяна ВАКАНЮК са сваім аўтамагазінам аб'ездзіла амаль усю Беларусь.

перастаў быць праблемай, калі на гарызонце бытавой службы паявіўся прадпрымальнік Саркіс Карапецян. Спецыяліст па комплексных прыёмных пунктах Ганна Чарота гаворыць, што такога добрасумленнага работніка і добрага майстра яшчэ пашукаць трэба. Два разы на тыдзень ён аб'язджае ўсе КПП, забірае заказы і прывозіць іх. Рамантуе вельмі якасна. Адны толькі падзякі ў адрас майстра даводзілася чуць ад людзей.

Вось так, па крупіначцы, штодзённа і збіраюцца тыя лічбы, якія называла дырэктар. Яшчэ Валянціна Юхімук зазначыла, што з усіх сілаў, хоць гэта цяпер вельмі цяжка, стараюцца ў раённым КБА «трымаць» зарплату. У бытоўцы яна, як вядома, заўсёды была невялікая. Але ж калі людзі працуюць, калі ёсць план, то і заробкі не павінны выглядаць убога.

Галіна Капусціна, загадчыца КПП пасялковага цукровага завода, ганарыцца сваім маленькім калектывам. Эльвіра Мышкавец зусім нядаўна працуе цырульнікам, а пагалоска пра яе як пра добрага майстра пайшла па ваколіцы. Выпускніца Брэсцкага профільнага каледжа працу сваю любіць, нешта новае прыдумляе, эксперыментуе, абавязкова параіць, падкажа, вось і пайшлі да яе кліенты. А швачка-закройшчыца Раіса Астаповіч працуе тут вельмі даўно. У яе ўжо склалася кола пастаянных кліентаў, і тыя, хто прыходзіць першы раз, як правіла, застаюцца задаволеныя. Раіса Феадосьеўна працуе не толькі па індывідуальных заказах. Яна раскройвае многія вырабы для швейнага цэха. Так што час распісаны, кожная хвілінка задзейнічана.

Загадчыца КПП таксама па выхадных практыкуе выязны гандаль. У будныя дні — прыём заказаў, наведванне па чарзе 10 вёсак, што на абслугоўванні. Галіна Міхайлаўна кажа, што сярод дзесяці ёсць такія — Вешкі і Падлессе — дзе засталося па дзве хаты. Жывуць там старэнькія людзі. Яны ніякіх заказаў не робяць, ну, іншым разам нейкую дробязь набудуць, але ж вельмі радыя бываюць, як хто зойдзе.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Жабінкаўскі раён.

АКУПЛЯЛЬНАСЦЬ — ЗА АДЗІН СЕЗОН

У мэтах павышэння якасці вулічнага асвятлення і эканоміі бюджэтных сродкаў у населеных пунктах Мастоўскага раёна ўсталявалі 148 рэле часу, выдаткаваўшы 34 мільёны рублёў з бюджэтаў раённага і сельскіх Саветаў, і 68 працэнтаў энергазберагальных лямпаў.

Аўчынка, як кажуць, была вартая вырабу. Толькі за тры месяцы мінулага года на вулічным асвятленні было зэканомлена 9,6 мільёна рублёў. Пры гэтым з усіх усталяваных рэле найлепш сябе зарэкамендавалі РСЗ-525. Каштуюць яны дарагавата (196 тысяч рублёў), аднак працуюць вельмі надзейна, і выдаткі на іх акупляюцца за адзін сезон.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

БУДАЎНІЧЫ ТЫДЗЕНЬ

Своеасаблівай будаўнічай пляцоўкай на чатыры дні стаў выставачны павільён на праспекце Пераможцаў, 14.

Тут з 21 па 24 красавіка працуе выстава «Беларускі будаўнічы тыдзень», якая дэманструе ўсё лепшае, што можа сёння паказаць айчынная будаўнічая галіна. Галоўнымі элементамі выставы з'яўляюцца спецыялізаваныя тэматычныя раздзелы «Вокны. Дзверы, Дахі», «Інтэр'ер», «Маналіт. Будаўнічая тэхніка», спецыялізаваны салон «Прампластбел». На выставе дэманструецца велізарны выбар сучасных матэрыялаў. Загадзя была складзена і цікавая дзелавая праграма для ўдзельнікаў. Мяркуецца, што ўсё гэта дазволіць ператварыць «Беларускі будаўнічы тыдзень» у запамінальнае свята.

Леанід ТУГАРЫН.

СВАЯ СТРАХА — СВАЯ ЎЦЕХА

— Ой, паглядзіце, колькі да нас людзей прыехала! — пенсіянерка Марыя Кот не змагла стрымаць эмоцыі. Ім, 54 жыхарам вёсак Пясчанікі і Падвосце, што знаходзяцца ў самай глыбінцы Жыткавіцкага раёна, рэдка выпадае бачыць гасцей.

А тут адразу ўсе дэпутаты сельскага Савета, жансавет і раённае начальства прыехалі! І ўсё для таго, каб падзяліць з імі радасць: якраз з Вялікадня ў мясцовага насельніцтва будзе свой калектыўны прытулак — Дом сацыяльных паслуг.

— Цяпер пенсіянерам — а самаму малодшаму з жыхароў гэтых населеных пунктаў 56 гадоў — будзе дзе сабрацца, напрыклад, на сход. А то людзі раней на дварэ ў мароз стаялі — хіба гэта добра? — расказвае старшыня Юркевіцкага сельскага Савета Алена Шпакевіч. Можна ў гэтым доме і канцэрт людзям паказаць, і гарбаты на юбілей разам папіць. Пачалі мы з таго, што з Жыткавічаў прывезлі сюды ўрача і цырульніка. Цяжка ж сталым людзям дабірацца да райцэнтра.

Алена Іванаўна распавядае, што доўга шукала памяшканне для рэалізацыі такіх простых мараў. І вось нарэшце жыхарка пасёлка Азёрны — цэнтральнай сядзібы сельсавета — Таццяна Корж прапанавала, а потым аддала ў бязвыплатнае карыстанне дом, што дастаўся ёй у спадчыну. А потым дапамагала прыводзіць яго ў належны выгляд.

Добраўпарадкаванне падворка і рамонт, прынамсі, рабілі, як у колішнія часіны — талакой. Сабраліся мясцовыя актывісты і на працягу двух тыдняў павысякалі дзікія слівы, якімі зарасла сядзіба, знеслі старыя агароджы, хлявы, павыносілі смецце. Давялося і з домам паваждацца. Сама пабудова добрая, але ж трэба было і падлогу паправіць, і патынкаваць, і пабяліць, і вокны пафарбаваць... Ні капейкі бюджэтных сродкаў не было патрачана — усё зрабілі за свае ўласныя. Хто піламатэрыялы прынёс, хто шпалеры, хто фарбу падараваў. Затое вынік зараз цешыць вока — перад гараджанамі не сорамна.

— Як прыбраліся, першае, што зрабілі — абраз на чырвоны кут павесілі — каб усё як у людзей было. На святы праваслаўныя, і каб праводзіць у іншы свет, сюды будзе бацюшка прыязджаць — царквы ж у вёсках няма, — гаворыць дэпутат сельскага Савета, загадчыца мясцовага фельчарска-акушэрскага пункта Таццяна Украженка. Яна разам з мужам таксама прыняла самы актыўны ўдзел у навядзенні парадку ў мясцовым доме сацыяльных паслуг.

У дзень адкрыцця да цырульніка першым прыйшоў пенсіянер Сцяпан Ханеня. Чаму не скарыстацца такім выпадкам — навошта траціць грошы на білет да райцэнтра? Не ўтрымалася ад магчымасці стаць яшчэ прыгажэйшай і Кацярына Цярэня — папрасіла падраўняць валасы. Не засталася без работы і ўрач, што прыехала з Жыткавічаў. Цяпер яна будзе прыязджаць сюды па графіку — кожны месяц. Каму ціск памераць, а каго проста выслухаць — людзі ж сталага веку, многія — адзінокія. Большасць з іх найлепшыя гады жыцця аддалі мясцовай гаспадарцы — дасведнаму рыбгасу «Белае», што вядомы сваімі люстранымі карпамі. Цяпер вось на пенсіі, і вельмі задаволены, што мясцовыя ўлады не забываюць пра іх звычайныя штодзённыя патрэбы.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ТЭМА ДНЯ

«НІЧЫІХ» ТЭРЫТОРЫЙ НЕ БЫВАЕ

Калі аб'ект не перададзены на баланс спецыялізаванай арганізацыі, за яго добраўпарадкаванне павінен адказваць сельскі Савет.

Яшчэ пяць гадоў таму ўяўленне аб рабоце сельскіх Саветаў (нават у некаторых прадстаўнікоў «вертыкалі» ўлады) было неакрэсленым, няпэўным і далёкім ад рэалій. Самі ж сельскія Саветы чым толькі ні займаліся — пачынаючы ад чысткі калодзежаў і адлову сабак і заканчваючы зборам падаткаў і рамонтам дарог... Параўнальна нядаўна сітуацыяй на «нізавой прыступцы» ўлады зацікавіліся на самым высокім узроўні. Пасля выхаду Указа Прэзідэнта № 21 «Аб павышэнні ролі органаў мясцовага кіравання і самакіравання ў вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва» многія пытанні, якія раней здаваліся невырашальнымі, нарэшце скрануліся з «мёртвага пункта».

Наколькі «дух і літара» ўказа адпавядаюць сённяшнім — рэальным — патрэбам першаснага звяна ўлады, спрабавалі высветліць старшыні сельскіх і пасялковых Саветаў дэпутатаў падчас сустрэчы са **старшынёй Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Генадзем НАВІЦКІМ**, арганізаванай у межах работы Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання на базе Інстытута вышэйшых кіраўніцкіх кадраў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

— Сёння, як мне падаецца, у вас ёсць свой «зрэз» праблем, якія патрабуюць свайго вырашэння. Вы маеце непасрэднае дачыненне да «вертыкалі» ўлады, бо кожны з вас з'яўляецца адначасова і старшынёй сельскага Савета, і старшынёй сельвыканкама — так бы мовіць, сумяшчае двух кіраўнікоў у адной асобе. Нагрузка вялікая, таму што «пісаць рэзалюцыі» вам ужо няма для каго, а значыць, трэба самім брацца за ўсё і выконваць, — так пачаў дыялог з удзельнікамі сустрэчы Генадзь Навіцкі.

Ён адзначыў, што за час работы ў рамках Указа № 21 (а гэта два апошнія гады) удалося значна ўмацаваць матэрыяльна-тэхнічную базу сельскіх Саветаў — многія з іх ужо выглядаюць годна і адпавядаюць свайму прызначэнню. Разам з тым відавочна, што прывесці сельскі Савет у парадак і надаць яму адпаведны статус — гэта толькі палова справы. Неабходна забяспечыць яго фінансамі.

— І сёння мы ў Савеце па ўзаемадзеянні працуем над тым, каб гэта пытанне было вырашана, прычым, кардынальным чынам. Неабходна, каб падаходны падатак з фізічных асобаў, якія працуюць на тэрыторыі пэўнага сельскага Савета, накіроўваўся непасрэдна ў яго «кішэню». Гэта будзе не толькі спрыяць папаўненню сельсаветскай казны, але і стымуляваць стварэнне новых працоўных месцаў. Акрамя таго, у рэспубліканскім бюджэце на 2010 год будзе прадугледжана і вылучана асобным радком фінансаванне для сельскіх Саветаў, — паведаміў Генадзь Навіцкі. І прапанаваў удзельнікам сустрэчы падзяліцца сваім бачаннем «нізавых» праблем, выказаць уласныя меркаванні адносна рэалізацыі палажэнняў названага ўказа.

Фота БЕЛТА.

— Хочацца ведаць, як тое, што мы выпрацоўваем «наверсе», рэальна трансфармуецца на першасным узроўні, што атрымліваецца, што не атрымліваецца. Каб мы маглі скарэктаваць сваю працу з улікам таго, што вы тут скажаце.

Праблемы, узнятыя прадстаўнікамі мясцовай улады, былі ў пэўным сэнсе прадказальнымі — на працягу апошніх двух гадоў яны перыядычна агучваліся ў той ці іншай аўдыторыі. Не стала выключэннем і гэта сустрэча: у парадку дня апынуліся ўсё тыя ж пытанні аб падатках (хто і як павінен іх збіраць) і штатным раскладзе (у прыватнасці, ці будуць яго пашыраць, ці вернуць назад «адзінку» землеўпарадчыка).

Генадзь Навіцкі патлумачыў, што ў адпаведнасці з наяўным заканадаўствам, **падаткі** павінны збіраць выключна адпаведныя структуры падатковай інспекцыі, а не работнікі сельскіх Саветаў. У самым хуткім часе (а менавіта да 1 мая) гэта пытанне павінна быць цалкам «знятае» з сельскіх Саветаў і перададзенае Міністэрству па падатках і зборах.

Наконт вяртання ў штат сельвыканкама «адзінкі» **землеўпарадчыка** Генадзь Навіцкі выказаўся дакладна і адназначна: гэтага можна не чакаць.

— Кантроль за выкарыстаннем зямельных рэсурсаў заўсёды быў і будзе асновай дзяржаўнай зямельнай палітыкі. Гэта пытанне павінна вырашацца цэнтралізавана. Іншая рэч, што можна (і неабходна) перагледзець наяўны рэжым работы землеўпарадкавальнай службы, зрабіць яе больш эфектыўнай. Ёсць шэраг сельсаветаў (асабліва ў межах вялікіх гарадоў), дзе землеўпарадчыкі павінны бываць часцей. І такая задача сёння ставіцца.

Што датычыцца **штатнага раскладу** ўвогуле, гэта пытанне заўсёды знаходзілася ў зоне асаблівай увагі і кантролю ўлады, і, у прыватнасці, кіраўніка краіны.

— Раздуваць штаты не дазволена нікому. Калі гэты працэс пачнецца, яго ўжо не спыніш. Выйсце адно, і яно відавочнае — павышаць эфектыўнасць працы. Не толькі хутчэй думаць і дзейнічаць, але і «ўзбройвацца» сучаснай тэхнікай, камп'ютарамі, праграмамі пад гэтыя камп'ютары, каб з цягам часу ўсе «папяровыя справы», усю перапіску перакласці на «мову» электронікі. Упарадкаванне і аптымізацыя дакументаабароту павінны прывесці да значнага скарачэння часу, які затрачваецца сёння на працу з паперамі ў сельскіх Саветах, — лічыць Генадзь Навіцкі.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ЧВЭРЦЬ АБ'ЕКТАЎ НЕ ВЫКАРЫСТОЎВАЕЦЦА

У Віцебскай вобласці амаль 25 працэнтаў з ліку аб'ектаў былых ваенных гарадкоў не выкарыстоўваецца. Такіх безгаспадарчых, як высветлілася, аж 147. Яны ў ліку іншых у 1992—2004 гадах былі перададзены ў камунальную ўласнасць.

Тое, што яны не ўцягнуты ў гаспадарчы абарот, вызначылі супрацоўнікі Камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці. Кантралёры высветлілі, што мясцовыя ўлады не прынялі ўсіх неабходных мераў па выкарыстанні аб'ектаў у Верхнядзвінскім, Аршанскім, Пастаўскім і Полацкім раёнах, а таксама ў Оршы і Навапалацку.

У прыватнасці, Пастаўскім райвыканкамам яшчэ летам 2006 года былі прынятыя рашэнні на спісанне 51 аб'екта ваенных гарадкоў. Але на момант праверкі — праз 33 месяцы з моманту прыняцця гэтага рашэння, праведзены разборка і дэмантаж толькі дзесяці аб'ектаў. Аналагічныя парушэнні выявілі і ў іншых праверяных раёнах.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ВАШ ДЭПУТАТ У ПАЛАЦЕ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ЧАЦВЁРТАГА СКЛІКАННЯ

ВІЦЕБСКАЯ ВОБЛАСЦЬ

Віцебская-Горкаўская выбарчая акруга № 17

ГРЫЦКЕВІЧ Генадзь Паўлавіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце.

Нарадзіўся 22 красавіка 1954 года ў вёсцы Паўазер'е Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласці. Закончыў Беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту. Працаваў інжынерам, начальнікам вытворча-тэхнічнага аддзела, галоўным інжынерам рамонтна-будаўнічага ўпраўлення, намеснікам генеральнага дырэктара вытворчага аб'яднання ЖКГ, начальнікам упраўлення па ўліку і размеркаванні жылой плошчы Віцебскага гарвыканкама. Займаў пасады намесніка старшыні Віцебскага гарвыканкама, старшыні Віцебскага гарадскога Савета дэпутатаў.

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны юбілейным медалём «60 гадоў вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Віцебская-Чкалаўская выбарчая акруга № 18

АЎЧЫННІКАЎ Віктар Васільевіч

Член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі.

Нарадзіўся 8 кастрычніка 1952 года ў гарадскім пасёлку Бешанковічы Віцебскай вобласці. Закончыў Віцебскі дзяржаўны медыцынскі інстытут. Працаваў урачом Капыскай бальніцы, урачом-хірургам Аршанскай цэнтральнай раённай бальніцы, загадчыкам хірургічнага аддзялення тэрытарыяльна-медыцынскага аб'яднання № 3 Першамайскага раёна горада Віцебска, галоўным хірургам упраўлення аховы здароўя Віцебскага аблвыканкама, галоўным урачом установы аховы здароўя «Віцебская абласная клінічная бальніца».

Віцебская-Чыгуначная выбарчая акруга № 19

СЯМАШКА Сяргей Аляксандравіч

Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце, сувязі і прадпрымальніцтве.

Нарадзіўся 12 кастрычніка 1960 года ў вёсцы Коцькі Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці. Закончыў Ленінградскі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту, Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Працаваў дарожным майстрам, галоўным інжынерам дыстанцыі пуці, начальнікам пуцявой машыннай станцыі № 94 Прыбалтыйскай чыгункі, галоўным інжынерам пуцявой машыннай станцыі № 118 Беларускай чыгункі, намеснікам начальніка дыстанцыі пуці па кадрах і быце Віцебскай дыстанцыі пуці Беларускай чыгункі.

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога і трэцяга склікання.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», юбілейным медалём «90 гадоў Узброеных Сілаў Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Віцебская-Кастрычніцкая выбарчая акруга № 20

ЛАСЯКІН Аляксандр Міхайлавіч

Член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе.

Нарадзіўся 21 ліпеня 1957 года ў вёсцы Новая Беліца Сенненскага раёна Віцебскай вобласці. Закончыў Віцебскі дзяржаўны педагагічны інстытут. Працаваў дырэктарам Глебаўскай васьмігадовай школы Сенненскага раёна, першым сакратаром Сенненскага райкама ЛКСМБ, загадчыкам аддзела прапаганды і культурна-масавай работы Віцебскага абкама ЛКСМБ, дырэктарам установы адукацыі «Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны каледж».

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі».

Віцебская сельская выбарчая акруга № 21

БАЙКОЎ Васіль Міхайлавіч

Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце.

Нарадзіўся 28 мая 1953 года ў вёсцы Камаровічы Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці. Закончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь. Працаваў галоўным аграномам саўгаса «Віцебскі», дырэктарам саўгаса імя У.П. Краева Віцебскага раёна. Займаў пасады старшыні Віцебскага раённага Савета народных дэпутатаў, старшыні Віцебскага райвыканкама, намесніка старшыні Віцебскага аблвыканкама, старшыні Віцебскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

Глыбоцкая выбарчая акруга № 22

АНДРЭЙЧАНКА Уладзімір Паўлавіч

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Нарадзіўся 2 студзеня 1949 года ў вёсцы Мар'янава Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці. Закончыў Велікалуцкі сельскагаспадарчы інстытут, Мінскую вышэйшую партыйную школу. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь. Працаваў аграномам калгаса «Перамога сацыялізму» Верхнядзвінскага раёна, старшым аграномам Лёзненскай райсельгастэхнікі, інструктарам Лёзненскага райкама КПБ, сакратаром парткама саўгаса «Адаменкі», старшынёй калгаса імя Данукалава Лёзненскага раёна, старшынёй Лёзненскага райвыканкама, першым сакратаром Верхнядзвінскага райкама КПБ. Займаў пасады намесніка старшыні, старшыні Віцебскага аблвыканкама.

Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання, членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага, другога і трэцяга скліканняў.

Мае дзве падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны ордэнам Айчыны III ступені, юбілейнымі медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, ордэнам Беларускай праваслаўнай царквы Крыжа прападобнай Ефрасінні, ігуменні Полацкай.

Лепельская выбарчая акруга № 23

МІХАЛЕВІЧ Анфім Іванавіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па заканадаўстве і судова-прававых пытаннях.

Нарадзіўся 26 мая 1949 года ў вёсцы Старыя Шарабаі Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці. Закончыў Віцебскі ветэрынарны інстытут, Беларускі інстытут правазнаўства. Працаваў галоўным ветэрынарным урачом калгаса «Парыжская камуна», дырэктарам саўгаса «Яблынька» Глыбоцкага раёна, першым намеснікам старшыні — начальнікам упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Бешанковіцкага райвыканкама, старшынёй калгаса «Палітаддзелец» Бешанковіцкага раёна, старшынёй Чашніцкага райвыканкама.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», чатырма юбілейнымі медалямі, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Міёрская выбарчая акруга № 24

СКАВАРОДКА Уладзімір Юр'евіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па грашова-крэдытнай палітыцы і банкаўскай дзейнасці.

Нарадзіўся 1 кастрычніка 1954 года ў вёсцы Канахі Міёрскага раёна Віцебскай вобласці. Закончыў Велікалуцкі сельскагаспадарчы інстытут. Працаваў галоўным аграномам калгаса «Шлях да камунізму», намеснікам старшыні калгаса «Баявы партызан», старшынёй калгаса «1 Мая» Міёрскага раёна, загадчыкам сельскагаспадарчага аддзела Міёрскага райкама КПБ. Займаў пасады старшыні Міёрскага раённага аграпрамысловага аб'яднання, старшыні Міёрскага раённага Савета дэпутатаў, першага сакратара Міёрскага райкама КПБ, першага намесніка старшыні Міёрскага райвыканкама — начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання, старшыні Міёрскага райвыканкама.

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», юбілейным медалём «90 гадоў Узброеных Сілаў Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Наваполацкая выбарчая акруга № 25

АНТОНАВА Іна Васільеўна

Член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па працы, сацыяльнай абароне, справах ветэранаў і інвалідаў.

Нарадзілася 23 ліпеня 1952 года ў горадзе Туле РСФСР. Закончыла Паўночна-Асецінскі дзяржаўны медыцынскі інстытут. Працавала школьным урачом, загадчыкам аддзялення здаровага дзяцінства, галоўным урачом, намеснікам галоўнага ўрача па дзяцінстве Наваполацкага гарадскога тэрытарыяльна-медыцынскага аб'яднання, галоўным урачом дзіцячай паліклінікі ўстановы аховы здароўя «Наваполацкая цэнтральная гарадская бальніца».

Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Аршанская гарадская выбарчая акруга № 26

ЖАРАЛО Уладзімір Ільіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце, сувязі і прадпрымальніцтве.

Нарадзіўся 19 сакавіка 1949 года ў вёсцы Лозкі Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці. Закончыў Беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту. Працаваў начальнікам станцыі Уза, Таўкачоўскі, Жыткавічы, намеснікам начальніка станцыі Калінкавічы Гомельскага аддзялення, начальнікам станцыі Лунінец Баранавіцкага аддзялення, начальнікам станцыі Віцебск Віцебскага аддзялення, начальнікам Магілёўскага аддзялення, начальнікам Брэсцкага аддзялення Беларускай чыгункі. Займаў пасады першага намесніка начальніка, начальніка Беларускай чыгункі.

Узнагароджаны ордэнам Пашаны, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Аршанская-Дняпроўская выбарчая акруга № 27

АДАШКЕВІЧ Уладзімір Сцяпанавіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі.

Нарадзіўся 11 лістапада 1949 года ў вёсцы Казлоўшчына Ашмянскага раёна Гродзенскай вобласці. Закончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію, Мінскую вышэйшую партыйную школу, Акадэмію народнай гаспадаркі пры Урадзе Расійскай Федэрацыі. Кандыдат сацыялагічных навук. Працаваў старшынёй калгаса «Звязда», калгаса «Зара» Слаўгарадскага раёна, першым намеснікам старшыні Слаўгарадскага райвыканкама — старшынёй раённага аграпрамысловага аб'яднання. Займаў пасады намесніка загадчыка аддзела сельскай гаспадаркі і харчовай прамысловасці Магілёўскага абкама КПБ, першага сакратара Касцюковіцкага райкама КПБ, старшыні Касцюковіцкага раённага Савета дэпутатаў, першага намесніка старшыні Магілёўскага аблвыканкама — старшыні камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні, намесніка дырэктара па інфармацыйна-выхавачай рабоце Магілёўскага аўтамабільнага завода імя С.М. Кірава, старшыні Аршанскага райвыканкама Віцебскай вобласці.

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання — намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі.

Узнагароджаны ордэнам Пашаны, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, ордэнам Рускай праваслаўнай царквы Святога роўнаапостальнага Вялікага князя Уладзіміра.

Полацкая гарадская выбарчая акруга № 28

ЮЖЫК Пётр Уладзіміравіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі.

Нарадзіўся 13 ліпеня 1946 года ў вёсцы Зарудзічы Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці. Закончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінскую вышэйшую партыйную школу. Працаваў карэспандэнтам смаргонскай раённай газеты «Светлы шлях», загадчыкам аддзела прапаганды і агітацыі Смаргонскага райкама КПБ, намеснікам старшыні Смаргонскага райвыканкама, галоўным спецыялістам Арганізацыйнага аддзела Сакратарыята Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, саветнікам-кансультантам аддзела арганізацыйнага забеспячэння Сакратарыята Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Займаў пасады галоўнага інспектара па Віцебскай вобласці Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, намесніка старшыні Віцебскага аблвыканкама.

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны медалём «Ветэран працы», юбілейным медалём «60 гадоў вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў».

Пастаўская выбарчая акруга № 29

КАЗУРА Эдуард Пятровіч

Член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце.

Нарадзіўся 2 мая 1949 года ў вёсцы Сяргеевічы Пастаўскага раёна Віцебскай вобласці. Закончыў Ленінградскі сельскагаспадарчы інстытут, Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Працаваў галоўным інжынерам калгаса «Радзіма», намеснікам старшыні калгаса імя Мічурына, старшынёй калгаса «Касцярычнік» Пастаўскага раёна, інструктарам арганізацыйнага аддзела Пастаўскага райкама КПБ, начальнікам перасоўнай механізаванай калоны Пастаўскай райаграпрамтэхнікі, дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «Пастаўскі малочны завод», першым намеснікам старшыні, старшынёй Пастаўскага райвыканкама.

Узнагароджаны медалём «За воінскую доблесць. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна».

Сенненская выбарчая акруга № 30

ПАПКОЎ Аляксандр Андрэевіч

Член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце.

Нарадзіўся 2 студзеня 1948 года ў вёсцы Шчокатава Дрыбінскага раёна Магілёўскай вобласці. Закончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію, Мінскую вышэйшую партыйную школу. Кандыдат эканамічных навук. Працаваў галоўным аграномам калгаса «Іскра» Круглянскага раёна, старшынёй калгаса імя Андрэева Шклоўскага раёна, першым намеснікам старшыні, старшынёй Шклоўскага райвыканкама, першым сакратаром Шклоўскага райкама КПБ, старшынёй Круглянскага райвыканкама. Займаў пасады намесніка Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, рэктара ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт», намесніка Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Узнагароджаны ордэнам Пашаны, медалём «За працоўную доблесць».

«НІЧЫІХ» ТЭРЫТОРЫЙ НЕ БЫВАЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Не адчулі кіраўнікі першаснага звяна ўлады (паводле іх выказванняў) заўважных зрухаў і ў вырашэнні пытанняў, якія датычацца перадачы спецыялізаваным структурам дарог, шахтавых калодзежаў і грамадскіх могілак. Выкананне гэтага пункта Указа № 21, на думку ўдзельнікаў сустрэчы, увогуле «дрэнна ідзе». У выніку атрымліваецца «цэйтнот»: у сельвыканкамаў няма грошай, каб, напрыклад, заключыць дагавор на ремонт дарогі з ДРБУ, і няма тэхнікі, каб зрабіць гэты рамонт самастойна.

— У краіне ўвогуле не хапае грошай на ўтрыманне дарог, нават дарог рэспубліканскага падпарадкавання, — заўважыў Генадзь Навіцкі. — Дарогі ў невялікіх населеных пунктах, у вёсках — гэта тыя ж самыя вуліцы, інакш кажучы, камунальная ўласнасць. А камунальныя службы яшчэ не гатовы іх прыняць. Дарожнікі таксама адмахваюцца: маўляў, мы не павінны. Спрэчкі працягваюцца і сёння, таму што прыняць дарогу не так проста, як здавалася раней, — адначасова неабходна падрыхтаваць цэлы пакет дакументацыі. Але паступова праблемы вырашацца, і не толькі датычныя дарог.

Калі ўлічыць, што на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў уся «вясковая» інфраструктура ўвогуле не мела канкрэтных балансаўтрымальнікаў (у лепшым выпадку яе абслугоўваў калгас), то ўсё, што адбываецца сёння, можна разглядаць як пэўны прарыў, рух наперад.

— Добра, што мы ўвогуле скранулі з месца гэты пласт — пачалі вызваляць сельскія Саветы ад не ўласцівых ім функцый і шукаць іншыя дзяржаўныя структуры, якія здолелі б стварыць базу для забеспячэння тых ці іншых кірункаў дзейнасці. Сельвыканкам — гэта орган улады, на балансе якога ўвогуле нічога не павінна ўтрымлівацца. І хоць гістарычна так склалася, што сельскія Саветы заўсёды займаліся «ўсім», ад гэтага трэба паступова адыходзіць. Кожны павінен рабіць сваю справу, у тым ліку і ў глыбінцы — такую палітыку праводзіць сёння дзяржава, — падкрэсліў Генадзь Навіцкі. — Ніхто не гаворыць, што гэта адбудзецца адразу. Неабходны час, каб нарасціць базу: знайсці кадры, тэхніку, грошы. Цяжкасці ёсць. Але мы ўжо ведаем, на што трэба арыентавацца і чаго неабходна дамагацца.

Наталля КАРПЕНКА.

СЦЕРАЖЫСЯ ЗГРАІ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Увогуле, праблема ліквідацыі бяздомных сабак вырашальная, — развівае тэму Аляксандр Васільевіч. — Трэба памятаць, што яна мае сваю перыядычнасць (пік актыўнасці прыпадае на канец зімы — пачатак вясны і на восень). У астатні час можна гаварыць аб адзінкавых выпадках, калі дзесьці сарваўся з ланцуга чыйсьці сабака, ці ля несанкцыянаваных звалкі збеглася некалькі бяздомных. Трэба яшчэ адзначыць, што многія пажылыя жыхары маюць звычку прыкормліваць бяздомных жывёл, а яны потым збіваюцца ў зграі.

Мы працуем у цесным кантакце са старастамі — яны лепш ведаюць сітуацыяй на месцах. Калі ўзнікае пытанне, старасты адразу тэлефануюць у сельскі Савет. Мы збіраем інфармацыю па ўсіх населеных пунктах сельсавета і робім заяўку камунальнікам. Паведамляем арыенціровачную колькасць галоў і прыкладны маршрут руху транспарту камунальнікаў. Аб правядзенні адлову мы загадзя папярэджваем старастаў. Бывалі выпадкі, калі пасля адлову мясцовыя жыхары прыходзілі ў сельсавет скардзіцца, што разам з бяздомнымі ўсыпілі і іх уласнага сабаку, які па нейкай прычыне «аддзяўся». Не так даўно ў нас узнікла пытанне па Вішнёўцы. Нам патэлефанавалі з пошты, паскардзіліся, што на іх паштальёна ў Вішнёўцы накінуўся сабака. Мы адправілі заяўку на адлоў, аднак своечасова высветлілася, што сабака не бяздомны, а проста адвязаўся, пакуль яго ўладальніца, мясцовая жыхарка, знаходзілася ў бальніцы. Сабака пэўны час бегаў недагледжаны, а калі гаспадыня вярнулася, то адразу зноў навязала яго на ланцуг. У гэтым выпадку сабаку пашанцавала — калі б жанчына крыху больш часу правяла ў бальніцы, яго ўсыпілі б. Між іншым, паштальёны, як правіла, ведаюць «у твар» усіх мясцовых сабак і адразу сігналізуюць аб з'яўленні ў вёсцы чужых, бяздомных жывёл.

— У раёне выдатна адпрацаваны практычныя схемы: як знішчаць бяздомнны сабак, хто гэта павінен рабіць і за якія сродкі, — падсумаваў Леанід Баркоўскі. — Не важна — з «БУКСАПам» мы супрацоўнічаем ці з брыгадай ЖКГ, галоўнае, што праблема, калі яна ўзнікае, аператыўна вырашаецца. Галоўны ўпор мы ўсё ж робім на прафілактычную работу.

На заканчэнне старшыня райсавета параіў па магчымасці пазбягаць непасрэдных сутыкненняў з безнаглядными сабакамі, асабліва калі яны ў зграі. Не правакаваць агрэсію ў жывёл, не рабіць рэзкіх рухаў, не замахвацца, не бегчы (вялікая верагоднасць, што яны кінуцца за вамі). Неабходна захоўваць спакой і павольна адыходзіць, павялічваючы дыстанцыю.

Інга МІНДАЛЁВА.

Бабруйскі раён.

Чаму рэклама — не рухавік?

Рэклама на вуліцах Віцебска не адпавядае патрабаванням часу. Гэта адзначыў старшыня Віцебскага аблвыканкама.

І насамрэч, у параўнанні з тым жа Мінскам, у Віцебску рэклама часта як з «каменнага веку». І гэта — у «культурнай сталіцы».

Як высветлілі супрацоўнікі Камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці і аддзела архітэктуры і горадабудаўніцтва Віцебскага гарвыканкама, існуе шэраг праблем і недахопаў у развіцці рынку вулічнай рэкламы ў горадзе. Няма сістэмнага падыходу да яе размяшчэння. І, бывае, з'яўляецца яна стыхійна. Вельмі марудна абнаўляюцца рэкламныя канструкцыі. Больш за тое, частка іх не адпавядае патрабаванням бяспекі.

Такім чынам можна атрымаць рэкламны «ўдар» літаральна.

З праверaных 13 суб'ектаў гаспадарання парушэнні патрабавання адпаведнага Закона аб рэкламе былі выяўлены ў 12. За незаконнае размяшчэнне рэкламы вінаватых прыцягнулі да адміністрацыйнай адказнасці. Частку незаконна размешчаных рэкламных «аксесуараў» дэмантавалі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Ардэнаносцы на пенсіі

На Аршаншчыне сярод пенсіянераў нямала ардэнаносцаў. Гэта мужчыны і жанчыны, якія нялёгкай працай дамагліся рэкордных надояў і ўраджайнасці. Прадстаўнікі мясцовай улады віншуюць іх па святах, жадаючы здароўя і дабрабыту. Аб чым думаюць, што робяць і што зычаць сваім унукам ардэнаносцы, высвятляла наш карэспандэнт у вёсцы Дубраўка Аршанскага раёна.

Валянціна Іванавіча Шпака ў пачатку 90-х гадоў узнагародзілі ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі за тое, што ён, узначальваючы механізаванае звяно бульбаводаў, на працягу шэрагу гадоў дамагаўся высокай ураджайнасці гэтай культуры. Кіраўнік гаспадаркі — эксперыментальнай базы «Межава» — тады гаварыў, што Шпак працаваў за чацвярых, і ганарыўся ім як працаздольным і сумленным работнікам. Аднавяскоўцы расказалі, што Валянцін Іванавіч у пенсійныя гады заслужыў яшчэ адзін ордэн. Калі б была ўведзена ўзнагарода за чалавечнасць ці гераізм у хатніх умовах, то яна б дасталася Шпаку.

На працягу 15 гадоў ён даглядаў жонку, якую хвароба прыкавала да ложка. Увесь гэты час мыў бялізну, гатаваў ежу, насіў жонку ў лазню. Ён прыдумваў і майстраваў розныя прыстасаванні і ўсталёўваў каля ложка, каб жонцы лягчэй было бавіць час.

«Мы ажаніліся ў свой час па каханні. І калі здарылася бяда, то дзялілі яе на дваіх, інакш не магло быць», — распавядаў гаспадар.

Ён засяваў агарод, трымаў карову і каня. Каля свойскай жывёлы, вядома, хапала клопату...

Жонка памерла летась. Але ён толькі на кароткі час выбіўся з раўнавагі. А потым зноў пераканаў сябе, што трэба з радасцю сустракаць кожны наступны дзень.

Цяпер на падворку Валянціна Іванавіча чатыры казачкі, куры, сабака, кот. Ён з імі, як з людзьмі вядзе размову. А калі трэба абмеркаваць, што ў свеце дзеецца, то ідзе да вяскоўцаў на вячоркі. У восень на вячорках гаварылі аб тым, што лішкі бульбы, вырашчанай на прысядзібным участку, цяжка рэалізаваць: нясі прадаваць куды хочаш. І шкада, што дзяржаўныя людзі не бачаць гэтага рэсурсу агародніны.

Яшчэ адзін ардэнаносец і цяперашні старэйшына вёскі Дубраўка — Яўген Ягоравіч Копікаў. Усё жыццё працаваў брыгадзірам у паляводстве і жывёлагадоўлі. У васьмідзясятых гадах мінулага стагоддзя стаў лепшым брыгадзірам у раёне. Ураджайнасць збожжавых у яго брыгадзе дасягала 50 цэнтнераў з гектара, што было тады рэкордам. У тыя гады яго ўзнагародзілі ордэнам Пашаны.

Сёння Яўген Ягоравіч аб'ядноўвае грамаду сваёй вёскі, каб прыбраць вуліцу, абкасіць летам падворкі, своечасова разабраць старыя будыніны. Ён сочыць, каб аўталаўка ў вёску своечасова прыязджала, каб дарогу чысцілі і шмат чаго яшчэ рабілася для нармальнага жыцця вяскоўцаў.

Яўген Копікаў расказаў пры сустрэчы, што дом ён пабудаваў, сын у яго ёсць ды і сад пасадзіў — усё зрабіў, што патрабуецца ад сапраўднага мужчыны. А мінулай восенню па сваёй ініцыятыве ў вольны час пасадзіў 220 бярозак за вёскай. З цягам часу будзе там бярозавы гай. А побач на свае грошы (заплаціў з пенсіі экскаватаршчыку 200 тысяч рублёў) выкапаў вадаём, дзе можна будзе адпачываць летам і вяскоўцам, і яму.

Што тычыцца сям'і, то жонка Яўгена Ягоравіча памерла гадоў дзесяць таму. Жыве ён цяпер з дачкой, зяцем і ўнукамі. Абсталяваў сабе асобны пакой, каб маладых не турбаваць. Тут жа, у Дубраўцы, пасяліўся і сын, працуе ў сельгаспрадпрыемстве «Межава» аграномам.

Зяць па вечарах заходзіць да яго ў пакой, каб падзяліцца планамі і думкамі. Ён, ваенны пенсіянер, спрабуе стаць на ногі як фермер, ці хутаранін — можна назваць па-рознаму, а сэнс адзін. У зяцевай гаспадарцы — тры каровы і цялушка. Яшчэ большы статак развёў бы, але не хапае кармоў, каб пракарміць жывёлу ў стойлавы перыяд. Каб атрымаць больш травяных кармоў і збожжа, летась уключыў у севазварот пакінутыя прысядзібныя ўчасткі вёскі, што зараслі пустазеллем.

Зяць часта гутарыць з цесцем аб сельскагаспадарчай палітыцы дзяржавы: дзяржаўных крэдытах і кошце малака, аб тым, пры якіх умовах будзе развівацца сялянская гаспадарка, каб было выгадна і гаспадару, і дзяржаве. «Калі рацыянальна прадумаюць гэту палітыку на дзяржаўным узроўні, то, магчыма, у вёсак застанецца хоць нейкае падабенства да ранейшых хутароў. А магчыма, і вымалюецца нейкая новая форма», — гаворыць Яўген Копікаў.

Вольга ШУТАВА.

РАЗМЕРКАВАННЕ: ЯК ЗАДАВОЛІЦЬ І СВАЕ, І ДЗЯРЖАЎНЫЯ ІНТАРЭСЫ?

На пытанні, якія датычацца парадку размеркавання і ўладкавання на першым працоўным месцы, адказваюць старшыня прафсаюзных камітэтаў навучэнскай моладзі пры Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, намеснік старшыні ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Раман ДАПІРА і галоўны прававы інспектар працы ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Ларыса МАНЮК.

(Працяг, пачатак у нумарах за 15—18, 20 і 21 красавіка.)

☎ **Дзяўчына заканчвае Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт. Яе бацькі жывуць у Мядзельскім раёне. Яе таксама збіраюцца размяркоўваць у Мядзельскі раён, але яна хацела б знайсці сабе месца ў мінскай школе. Ці патрэбна ёй для гэтага рэгістрацыя ў сталіцы? Калі ўдасца знайсці ў сталіцы школу, дзе яе гатовы будуць узяць, ці зможа яна перараз-меркавацца? І як гэта робіцца? Выпускніцу таксама цікавіла, ці абавязана кіраўніцтва сельскай школы забяспечваць маладых спецыялістаў жыллём?**

У адпаведнасці з пунктам 22 Палажэння аб размеркаванні, установы адукацыі маюць права вырашаць пытанні перараз-меркавання маладых спецыялістаў на працягу аднаго года пасля атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі, двух гадоў — пасля атрымання сярэдняй спецыяльнай ці вышэйшай адукацыі і двух гадоў — пасля праходжання стажыроўкі (інтэрнатуры) выпускнікамі вышэйшых медыцынскіх устаноў адукацыі ў выпадку пераводу маладога спецыяліста з яго згоды ад аднаго наймальніка да іншага (пункт 4 артыкула 35 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь) па ўзгадненні паміж імі ў адпаведнасці з атрыманай спецыяльнасцю (прафесіяй) і прысвоенай кваліфікацыяй. Для рэалізацыі ў дачыненні да вас гэтай нормы заканадаўства патрэбная наяўнасць згоды трох бакоў: вашага наймальніка, установы адукацыі, якая выдала вам мэтавае накіраванне, і арганізацыі, дзе вы хацелі б працаваць. Майце на ўвазе, што вырашэнне пытання аб перараз-меркаванні з'яўляецца правам, а не абавязкам установы адукацыі. Гэта значыць, што вам трэба будзе перакана-ць камісію па размеркаванні ў мэтазгоднасці свайго перараз-меркавання. Жаданне вашага наймальніка пацвярджаецца пісьмова лістом на імя кіраўніка ўстановы адукацыі, у якім даецца згода на гэтае перараз-меркаванне. Жаданне ж арганізацыі, у якой вы хацелі б працаваць, пацвярджаецца накіраваннем ва ўстанову адукацыі заяўкі аб перараз-меркаванні вас на работу ў дадзеную арганізацыю. Усе абставіны перараз-меркавання і вашы пажаданні вы адлюстроўваеце ў заяве на імя кіраўніка ўстановы адукацыі.

Адносна абавязку наймальніка забяспечваць маладых спецыялістаў жыллём звяртаем вашу ўвагу на адсутнасць у заканадаўстве Рэспублікі Беларусь адпаведных нормаў. Аднак у шэрагу выпадкаў наймальнікі і прафсаюзныя арганізацыі садзейнічаюць у вырашэнні жыллёвых праблем маладым спецыялістам.

☎ **Падкажыце, калі ласка, якія могуць быць падставы для перараз-меркавання? У нашай арганізацыі плануецца рэарганізацыя, пасля якой працаваць па атрыманай спецыяльнасці магчымасці, хутчэй за ўсё, ужо не будзе. Што рабіць: пачынаць шукаць работу ці чакаць, што прапануе камісія па размеркаванні?**

Згодна з пунктам 22 Палажэння аб размеркаванні, права на перараз-меркаванне маюць усе катэгорыі, якія карыстаюцца прэферэнцыямі пры размеркаванні: гэта інваліды, сямейныя людзі, цяжарныя жанчыны і г.д., калі названыя абставіны з'явіліся ўжо пасля размеркавання. Напрыклад, перараз-меркавацца па месцы праходжання службы мужа могуць жонкі асобаў, абраных на выбарную пасаду ў дзяржаўныя органы, Міністэрства замежных спраў, накіраваных у службовую камандзіроўку, жонкі вайскоўцаў (за выключэннем вайскоўцаў, якія праходзяць тэрміновую службу, і курсантаў), супрацоўнікаў Службы бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, органаў унутраных спраў дзяржаўнай бяспекі, фінансавых расследаванняў, Камітэта дзяржаўнага кантролю, мытных органаў, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, пракурорскіх работнікаў. Перараз-меркавацца можна і ў тым выпадку, калі ў размеркаванага маладога спецыяліста з'явіліся медыцынскія супрацьпаказанні да работы па атрыманай спецыяльнасці. У гэтым выпадку месца працы прадастаўляецца яму з улікам стану яго здароўя.

Падставай для перараз-меркавання могуць быць таксама:

— адмова наймальніка ў прыёме на працу маладому спецыялісту, накіраванаму ў адпаведнасці з заяўкай гэтага наймальніка (дагаворам аб падрыхтоўцы спецыяліста). Тэарэтычна такое можа быць, бо заяўкі фарміруюцца загадзя;

— немагчымасць забеспячэння месцам працы ў адпаведнасці з атрыманай спецыяльнасцю (прафесіяй) і прысвоенай кваліфікацыяй пасля заканчэння службы ва Узброеных Сілах. Прынамсі, калі малады спецыяліст прызваны на службу ў армію, то час, на працягу якога ён абараняе Айчыну, залічваецца яму ў тэрмін працы па размеркаванні. А калі пасля службы ў арміі хлопец збіраецца працаваць паводле размеркавання, ён абавязаны пісьмова папярэдзіць пра гэта наймальніка;

— спыненне працоўнага дагавора з маладым спецыялістам у выніку аднаўлення на працы работніка, які раней займаў гэту пасаду, парушэння вызначаных правілаў прыёму на працу (пункты 2 і 3 артыкула 44 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь);

— скасаванне працоўнага дагавора па ініцыятыве наймальніка ў выпадку ліквідацыі арганізацыі, спынення дзейнасці індывідуальнага прадпрымальніка, скарачэння колькасці і штату работнікаў;

— перавод маладога спецыяліста з яго згоды ад аднаго наймальніка да іншага (пункт 4 артыкула 35 Працоўнага кодэкса) па ўзгадненні паміж імі ў адпаведнасці з атрыманай спецыяльнасцю (прафесіяй) і прысвоенай кваліфікацыяй;

— адлічэнне з установы адукацыі, дзе малады чалавек атрымліваў адукацыю больш высокага ўзроўню на дзённай форме навучання.

Яшчэ адзін важны момант. Раней у маладых спецыялістаў не было магчымасці перараз-меркавацца нават калі наймальнік пастаянна затрымліваў ім выплату заработнай платы. Цяпер парушэнні наймальнікам працоўнага заканадаўства, калектыўнага ці працоўнага дагавора з'яўляюцца падставай для скасавання па патрабаванні работніка працоўнага дагавора і наступнага перараз-меркавання.

Як мы ўжо казалі раней, на працягу двух гадоў пасля заканчэння ВНУ іх выпускнікі, якія прыступілі да працы па размеркаванні і з'яўляюцца маладымі спецыялістамі, абавязаны паведамляць у камісію па размеркаванні аб усіх змяненнях, звязаных з іх вучобай і работай. А ўстанова адукацыі абавязана адсочваць усе іх перамяшчэнні. Для вырашэння пытання аб перараз-меркаванні трэба звярнуцца ва ўстанову адукацыі, якая ажыццяўляла размеркаванне, з адпаведнай заявай і дадаць да яе дакументы, якія пацвярджаюць ваша права на перараз-меркаванне. У тым выпадку, калі камісія прыме рашэнне аб перараз-меркаванні, малады спецыяліст атрымае новае пасведчанне аб накіраванні на працу. Часткай 7 пункта 22 Палажэння аб размеркаванні вызначаць, што ў выпадку немагчымасці забеспячэння пры перараз-меркаванні месцам працаўладкавання ў адпаведнасці з атрыманай спецыяльнасцю (прафесіяй) і прысвоенай кваліфікацыяй малады спецыяліст пры наяўнасці падстаў для вызвалення ад выканання сродкаў, выдаткаваных дзяржавай на яго падрыхтоўку, мае права звярнуцца ва ўстанову адукацыі па даведку аб самастойным працаўладкаванні. Праўда, у гэтым выпадку малады спецыяліст, які атрымае такую даведку, страчвае статус маладога спецыяліста.

Надзея НІКАЛАЕВА.

(Працяг будзе.)

Доктар адкажа

Ёсць пытанні? Тэлефануйце...

Да канца месяца дзяжурыць на «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя

(017) 222 70 80

плануюць:

22 красавіка — начальнік аддзела кадравай палітыкі, устаноў адукацыі Міністэрства аховы здароўя Васілій Аляксеевіч ФІЛАНЮК.

23 красавіка — галоўны ўрач Мінскага абласнога скурна-венералагічнага дыспансэра Людміла Аляксандраўна КАЛАСКОВА.

24 красавіка — намеснік начальніка аддзела медыцынскай тэхнікі Міністэрства аховы здароўя Андрэй Гедэмінавіч ПЯТРОВІЧ.

29 красавіка — вядучы спецыяліст аддзела ліцэнзавання фармацэўтычнай дзейнасці Наталля Уладзіміраўна МІЛЕЙКА.

30 красавіка — галоўны ўрач Рэспубліканскага цэнтра экстранной медыцынскай дапамогі Антон Эдуардавіч НАГОРНЫ.

У графіку магчымыя змяненні.

«Гарачая» лінія ўпраўлення аховы здароўя Мінаблвыканкама

(017) 220 20 25

29 красавіка — галоўны ўрач Мінскага абласнога псіханеўралагічнага дыспансэра Таццяна Фёдараўна МАРТЫНАВА.

30 красавіка — загадчык неўралагічнага аддзялення Мінскай абласной клінічнай бальніцы Міхаіл Яўгенавіч ДЗЕДАВЕЦ.

Графік работы «гарачай» лініі — з 9.00 да 13.00 і з 14.00 да 17.00.

Рэха публікацыі

«Тэрміналам» па нелегалах

25 сакавіка 2009 г. наша газета апублікавала матэрыял «Хто ж нас выганіць? Мы пусцілі карані на вакзале» — другі па ліку крытычны артыкул аб праблемах у сферы міжгародніх перавозак пасажыраў. Папярэднічала яму публікацыя «Месца для бамбіл» ад 29 кастрычніка 2008 года. Размова ішла пра індывідуальных прадпрымальнікаў, якія не афармляючы дакументы, так званыя заказ-нарады, не выдаючы квіткі, адвозяць пасажыраў у розныя населеныя пункты. Пры гэтым пасажыр не мае ніякіх гарантый бяспекі, бо паводзяць сябе кіроўцы гэтых мікрааўтобусаў у дарозе, мякка кажучы, не дысцыплінавана. Зразумела, што ездзяць яны з хуткасцю 110, каб і пасажырам хутчэй дабрацца, і самім больш рэйсаў зрабіць, машыны іх не заўсёды адпавядаюць патрабаванням тэхнікі бяспекі — часу станавіцца на ремонт няма, бо прастой — страта грошай. Гэта відавочныя недахопы, якія заўважылі мы падчас паездкі ў якасці журналісцкага эксперыменту з такімі перавозчыкамі. Пра стаж кіроўцы (не менш за два гады катэгорыі D) і казаць залішне — даведацца пра яго могуць толькі падчас праверкі ўпаўнаважаныя асобы. Усё гэта зразумела, вось толькі пра бяспеку, жыццё пасажыраў такія кіроўцы наўрад ці задумваюцца.

Пасля публікацыі ў нашай газеце нам стала вядома, што на Маскоўскім аўтавакзале сталіцы (а ў матэрыяле менавіта пра яго ішла размова) цяпер штодня дзяжурыць супрацоўнік транспартнай інспекцыі. Трэба меркаваць, што ў яго абавязкі ўваходзіць кантроль за тымі асобамі, якія імкнуцца назбіраць там пасажыраў. І сапраўды, апошнім часам натоўп бесшабашных кіроўцаў істотна парадзеў, нахабных прапаноў наконт паездкі ў Лепель, Новалукомль, Віцебск на прылеглай да Маскоўскага тэрыторыі чуецца ўсё менш. Рэдакцыя нашай газеты тым часам таксама атрымала адказ ад **начальніка транспартнай інспекцыі Міністэрства транспарту А.П. ІВАНКОВА**. Прыводзім тэкст ліста цалкам.

«У выкананне даручэння Міністра транспарту і камунікацый Рэспублікі Беларусь У.Г. Сасноўскага ад 27 сакавіка 2009 г. Транспартная інспекцыя Мінтранса, правёўшы аналіз інфармацыі, якая ўтрымліваецца ў артыкуле «Хто ж нас выганіць? Мы пусцілі карані на вакзале», паведамляе:

Цяпер у Рэспубліцы Беларусь выдадзена 29 766 ліцэнзій на права ажыццяўлення дзейнасці ў галіне аўтамабільнага транспарту. З іх са складнікам відаў паслуг «міжгароднія перавозкі пасажыраў» — 3775 спецыяльных дазволаў (ліцэнзій) (12,7%). Падчас ажыццяўлення гэтага віду перавозак юрыдычнымі асобамі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі эксплуатуецца 8300 транспартных сродкаў.

Транспартнай інспекцыяй пастаянна праводзяцца кантрольна-прафілактычныя мерапрыемствы, накіраваныя на кантроль выканання заканадаўства падчас ажыццяўлення перавозак пасажыраў у нерэгулярных зносінах. Так, за перыяд 2007—2009 гг. праведзена 328 мэтавых праверак, за студзень—сакавік 2009 г. — 118, у тым ліку ў межах спецыяльных мерапрыемстваў «Тэрмінал». Падчас праверак праверана 3889 транспартных сродкаў, выяўлена 1687 парушэнняў заканадаўства ў галіне аўтамабільнага транспарту, складзена 435 актаў, прыцягнута да адміністрацыйнай адказнасці 189 чалавек, анулявана 59 спецыяльных дазволаў (ліцэнзій).

Вызначаны якасны склад асобаў, якія выконваюць перавозкі пасажыраў у нерэгулярных міжгароднях зносінах, пры гэтым устаноўлена, што прыкладна 40% падобных перавозак ажыццяўляюць асобы без наяўнасці ліцэнзіі, а 60 % — ліцэнзіяты, якія выконваюць «схаваныя рэгулярныя перавозкі».

На тэрыторыі ўсіх абласных цэнтраў і раённых гарадоў вызначаны месцы пастаяннай канцэнтрацыі асобаў, якія прапануюць насельніцтву такія паслугі (чыгуначныя і аўтавакзалы і прылеглая да іх тэрыторыя, дыспетчарскія станцыі і інш), найбольш верагодны час адпраўлення транспартных сродкаў па маршрутах, якія ўстаяліся, і пералік асобаў, якія ажыццяўляюць дзейнасць з парушэннем заканадаўства. Падчас запланаванага ў другім паўгоддзі гэтага года правядзення дакументальных праверак транспартнай дзейнасці гэтыя асобы ў першую чаргу будуць унесеныя ў план правядзення праверак і, у выпадку пацвярджэння фактаў парушэнняў заканадаўства ў дачыненні да іх будуць прынятыя меры ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Для павышэння эфектыўнасці кантролю Транспартнай інспекцыяй зацверджаны План правядзення сумесных мерапрыемстваў з Міністэрствам па падатках і зборах і УДАІ МУС па кантролі за транспартнай дзейнасцю на 2009 г. Уведзена ў практыку штомесячная распрацоўка графікаў правядзення сумесных праверак на ўзроўні аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама, а ў некаторых выпадках, у месцах размяшчэння кропак канцэнтрацыі асобаў, якія прапануюць паслугі па нерэгулярных перавозках пасажыраў нават на ўзроўні адміністрацыі раёнаў.

Па ўсіх фактах перавозак пасажыраў без наяўнасці спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) інфармацыя накіроўваецца ў ІМПЗ па месцы рэгістрацыі транспартнага сродку, паколькі меры адміністрацыйнага ўздзеяння на асобаў, якія займаюцца дзейнасцю па перавозцы пасажыраў без наяўнасці ліцэнзіі, маюць права прымаць супрацоўнікі ІМПЗ, КДК, МУС. Пазітыўнымі інспекцыйны МПЗ заключаецца ў дачы фармальнага адказу на паведамленне, а якія-небудзь дзейсныя меры ў дачыненні да нелегальных перавозчыкаў не прымаюцца, што абумоўлена, на наш погляд, дастаткова складанай працэдурай доказу факту ажыццяўлення незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці, а таксама адсутнасцю такога рычага ўздзеяння як канфіскацыя транспартных сродкаў.

У мэтах павышэння эфектыўнасці праверак на лініі супрацоўнікі аддзелаў кантролю філіялаў Транспартнай інспекцыі праведзеныя з 5-дзённага працоўнага тыдня з фіксаваным рэжымам працы на зменны графік работы, у тым ліку ў вячэрні і начны час, а таксама выхадныя дні.

Транспартнай інспекцыяй на перыяд з 15.04.2009 г. па 15.05.2009 г. запланавана рэалізацыя комплексу кантрольна-прафілактычных мерапрыемстваў «Тэрмінал», якія накіраваныя на выкараненне парушэнняў заканадаўства падчас ажыццяўлення перавозак пасажыраў у нерэгулярных зносінах. У гэты перыяд, грунтуючыся на выніках раней праведзеных праверак і інфармацыі, атрыманай з розных крыніц, супрацоўнікамі Транспартнай інспекцыі будуць праведзеныя мэтавыя праверкі як на аўтадорогах і стацыянарных аўтазбудаваннях, так і ў іншых месцах канцэнтрацыі асобаў, якія ажыццяўляюць дзейнасць па перавозках пасажыраў у нерэгулярных зносінах. Падчас правядзення мерапрыемстваў «Тэрмінал» асаблівая ўвага будзе нададзена перавозкам пасажыраў у напрамках «Мінск — Віцебск», «Мінск — Лепель», «Мінск — Новалукомль», «Мінск — Докшыцы». З мэтай максімальна аб'ектыўнага асвятлення праблем «схаваных рэгулярных» і нелегальных перавозак пасажыраў у міжгародніх зносінах прапануем узяць удзел у правядзенні аднаго з рэйдаў у перыяд з 15.04.2009 па 15.05.2009».

Мы — толькі за аб'ёктыўнае асвятленне, таму і ў рэйд згодныя паехаць, і напісаць потым пра бачанне праблемы з іншага боку. А галоўнае, паспрыяць са свайго боку яе вырашэнню.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ

Полное наименование:

Открытое акционерное общество «Конструкторско-технологический институт средств механизации и автоматизации»

Адрес: г. Минск, ул. Ангарская, 17

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2009 года

млн. руб.

АКТИВ	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	2566	4291
Нематериальные активы	120		34
Вложения во внеоборотные активы	140	27	141
Прочие внеоборотные активы	150		
ИТОГО по разделу I	190	2593	4466
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	210	556	1548
Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам	220	9	9
Дебиторская задолженность	240	352	1049
Денежные средства	260	585	1500
Финансовые вложения	270		
Прочие оборотные активы	280		
ИТОГО по разделу II	290	1502	4106
БАЛАНС (190+290)	**300**	**4095**	**8572**

ПАССИВ	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ			
Уставный фонд	410	3	4829
Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей)	411	—	—
Резервный фонд	420	12	—
резервы, созданные в соответствии с учредительными документами	422	—	—
Добавочный фонд	430	2793	—
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	440	—	—
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	450	232	1202
Целевое финансирование	460	—	—
Доходы будущих периодов	470	—	—
ИТОГО по разделу III	490	3040	6031
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	—	298
Прочие долгосрочные обязательства	520	—	—
ИТОГО по разделу IV	590	—	298
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	—	—
Кредиторская задолженность	620	1055	2243
Задолженность перед участниками (учредителями)	630	—	—
Резервы предстоящих расходов	640	—	—
Прочие краткосрочные обязательства	650	—	—
ИТОГО по разделу V	690	1055	2243
БАЛАНС (490+590+690)	**700**	**4095**	**8572**
Справочно (из строки 620): долгосрочная кредиторская задолженность	701	на начало отчетного года —	на конец отчетного периода —
краткосрочная кредиторская задолженность	702	1055	2243

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 2008 г.

НАИМЕНОВАНИЕ ПОКАЗАТЕЛЯ	Код стр.	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
1	2	3	4
I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ			
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	16861	9724
Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	011	2858	1652
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010-011)	020	14003	8072
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	030	12251	7635
Валовая прибыль (020-021-030)	040	1752	437
Управленческие расходы	050	—	—
Расходы на реализацию	060	—	—
Прибыль (убыток) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-050-060)	070	1752	437
II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Операционные доходы	080	—	3987
Налоги, включаемые в операционные доходы	081	—	—
Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционныедоходы) (080-081)	090	—	3987
В том числе: проценты к получению	091	—	—
доходы от участия в создании (учредительстве) других организаций	092	—	—
доходы от операций с активами	093	—	—
прочие операционные доходы	099	—	3987
Операционные расходы	100	—	3972
В том числе: проценты к уплате	101	—	—
расходы от операций с активами	102	—	—
прочие операционные расходы	109	—	3972
Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов (090-100)	120	—	15
III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Внереализационные доходы	130	169	11
Налоги, включаемые во внереализационные доходы	131	—	—
Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализаионные доходы) (030-131)	140	169	11
Внереализационные расходы	150	196	102
Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов (140-150)	160	-27	-91
Прибыль (убыток) (+/-070+/-120+/-160)	200	1725	361
Расходы не учитываемые при налогообложении	210	152	87
Доходы не учитываемые при налогообложении	220	—	—
Прибыль (убыток) до налогообложения (+/-200+210-220)	240	1877	448
Налог на прибыль	250	441	101
Прочие налоги,сборы из прибыли	260	82	57
Прочие расходы и платежи из прибыли	270	—	—
Чистая прибыль (убыток) (200-250-260-270)	300	1202	203

Количество акционеров — всего 2, в том числе юридических лиц — 2, физических лиц — 0
Начислено на выплату дивидендов в отчетном периоде — 0 руб.
Обеспеченность акции имуществом Общества — 1 тысяча рублей
Среднесписочная численность работающих — 154 человека
Основной вид деятельности — производство оборудования для животноводства, птицеводства и кормопроизводства

УНП 100195557

«ЛЯ КАЛОДЗЕЖА КАНСІЛІУМ: ШТО І ЯК РАБІЦЬ ВАСІЛІЮ...»

Хто каго?

«Вясна... І зноў усё закруцілася. Таму пішу вельмі коратка. І толькі па справе», — так пачала свой ліст у рэдакцыю спадарыня Гудачкова з Жыткавічаў. І тым самым як бы тон задала: коратка дык коратка, па справе дык па справе.

З чаго вось толькі пачаць? Спадар Гарачоў з вёскі Даўнары Іўеўскага раёна прапануе — з анекдота ў тэму. Згодны. То ідуць, значыць, па горадзе два сантэхнікі — стары і малады. Бачаць — аварыя: ля аднаго з каналізацыйных калодзежаў трубу парвала. Старэйшы рукавы закасаў — і туды. Нешта агледзеў, нешта абмацаў, паставіў «дыягназ», крычыць маладому: «Э-э, падай мне ключ на 32!». Штось там падкруціў, зацісnуў, «вынырнуў». «Пласкагубцы, — крычыць, — падкінь! І малаток...». Пяць хвілін працуе, дзесяць. А там, глядзіш, і справа ўжо зроблена. Вылез майстар з калодзежа, ад бруду трохі абтросся, засмаліў ды і кажа: «Вучыся, сынок, пакуль я жывы, а то да самай пенсіі будзеш ключы падаваць».

Ключы ключамі. Як сведчыць рэдакцыйная пошта — у нас куды больш ахвотных падаваць... Правільна — парады:

Ля калодзежа кансіліум,
Што і як рабіць Васілію:
— Калі лопнула труба,
Да вясны жыльцам «труба»,
— Ну а як каналізацыя?
Захліпнецца ж вентыляцыя? —

падслухала размову мужыкоў Любоў Міхайлаўна Чыгрынава з вёскі Забалацце Вілейскага раёна. Праблема! І калі б адна! А то...

Дзе прарвецца, дзе падтопіць...
Сем цікаўных прыбягуць.
Каб зрабіць — няма ахвочых,
А парады ўсе даюць, —

зазначае Валянціна Апанасаўна Гудачкова з Жыткавічаў. Чытай — на гэта (парады даваць) здольны і той, хто хоць нешта петрыць, і той, хто нічога... Стаяць вынь...

Але ж фасон пры гэтым трымаюць:

Быццам нешта разумеюць...
Быццам кожны знае толк...
Хоць на справе — толькі ўмеюць
Ключ падаць ды малаток.

Гэта, як вы, напэўна, здагадаліся, радкі спадара Гарачова.

А чаму не вучацца, чаму без работы стаяць, ведае спадар Сільчанка з Гомеля:

Гы-гы-гы ды га-га-га...
Мы — каманда з ЖКГ.
Не бяда, што нас тут шмат
(а яшчэ і «кіроўцаў» штат)
Мы не сеем, не куём,
Мы парады раздаём.
Нешта маем з працы гэтай,
Бо падтрымка ідзе — з бюджэту.

А таму — па вялікім рахунку...

Ідзе той крызіс ці не ідзе,
Мы жывём — не на вадзе.
Рукавы паапускаем,
А зарплату атрымаем, —

піша пра «каманду» Вольга Паўлаўна Лабажэвіч з Клецка.

І каб толькі пра гэту («каманду») — яшчэ палова бяды была б. А так... «Для рашэння чарговай галаваломкі, — у першых радках свайго ліста паведамляе Мікола Старых з Гомеля, — дасылаю вам два варыянты. Яны амаль аднолькавыя. Першы:

Калісьці жыў мужык удалы,
Ён пракарміў двух генералаў!
Цяпер — хапіў бы, мусіць гора:
Бо не пракорміш... кантралёраў.

(Тут, дарэчы, будзе хуліганская заўвага спадара Гарачова:

Калісьці фільм знялі палякі
Пра трох танкістаў і сабаку.
На здымку ж Клешчука-пранырy
«Танкіст» — адзін. Сабак — чатыры).

Але гэта так, лірычнае адступленне. І, крый Божа, не пра тых, хто на здымку... Тым больш, што яны ні на нейкіх інспектараў, ні, барані Бог, на сабак ніколькі не падобныя. Таму ад спадара Старых другі варыянт:

Калісьці жыў мужык удалы:
Ён пракарміў двух генералаў.
І наш сучаснік «не пудлуе» —
Адзін за чатырох працуе!

Добра гэта ці дрэнна, — адказ зноў жа ў рэдакцыйнай пошце. Прычым, кароткі, як стрэл:

Ну як тут крызісу не быць —
Адзін працуе, сем стаіць! —

ускліkае так спадарыня Янучок з Клецка.

Вы думаеце яна аблічылася — іх тут не сем, а толькі чатыры? Не, мяркуем, што яна — проста бачыць глыбей. А там, знізу, яшчэ трое — драбіну трымаюць... Альбо проста стаяць. Ці нават сядзяць. Вось што крыўдна! Бо магло ж быць зусім не так. І, галоўнае, чакалася!

У СССР было такое:
Адзін робіць, «кураць» трое...
До! Пасля перабудовы
У нас парадак будзе новы!..
Пажылі. І палічылі.
Без работы ўжо чатыры?! —

піша спадарыня Чыгрынава. Пра тых, хто стаіць. А трэба, як лічыць большасць чытачоў, пра таго, хто працуе. Вось чаму ён адзін, прынамсі? Тут — шэраг меркаванняў:

Хоць даўно мінуў застой
Ды зазначыць варта,
Што працуе толькі той,
Хто прайграў у карты, —

канстатуе Анатоль Гарачоў. Ад яго ж:

Не адступім ні на крок,
Каб заняцца справаю,
Бо адзіны малаток
І вядро дзіравае.

Гэта, зрэшты (па меркаванні сужэнцаў Астроўскіх з Мінска), для брыгады зусім не перашкода. Яны, узяўшыся за справу, супакоілі заказчыка, цвёрдае мужчынскае слова далі:

Сітуацыю ўратуем,
І «ажур» з прыладамі:
Мы ўсё адрамантуем
Матам і кувалдамі!

Першае — трэба разумець — за «назіральнікамі», другое — за майстрам, які

Кувалдаю... Стараецца,
Працуе наш Віцёк.
Брыгада ж — узіраецца,
Пільнуе, каб не ўцёк.

Думаеце аўтар гэтых радкоў перабольшвае? Я ўперад таксама

так думала. А цяпер — не, бо знаёмая дырэктарка не так даўно расказала, як яна на біржы сабе кадраў набрала — ды маладых, прыгожых. Рада была. Не ведала, што ім элементарнае даводзіць трэба будзе: першае — на працу трэба прыходзіць у час і... кожны дзень, другое — на працоўным месцы нельга фарбаваць пазногці і балбатаць па тэлефоне, трэцяе — з абеду трэба вяртацца... А многія сыходзілі і, як кажуць, з канцамі. Карацей — вока ды вока трэба было... І, магчыма, нават не адно, а ўсе 8!

Заўважыў гэтую з'яву Віктар Федарака са Скідзеля.

У яго, варта адзначыць, не толькі вочы пільныя, але і слых абвостраны. Прынамсі, толькі ён пачуў, што хлопец гэты (з кувалдаю) цяпер грозна прамаўляе:

Хапае мне работы
А вы тут — «стаямо»...
Далей адсуньце боты,
А то як «даямо»!..

Біць, свят-свят-свят, можа і не варта... А вось папужаць, адпомсціць — цалкам магчыма, бо гэта чацвёрка хвілін пяць таму сказала хлапцу (спачатку прозай): «Будзем працаваць па чарзе — перш ты папрацуеш, а мы адпачнём, потым мы адпачнём, а ты папрацуеш. Што ў вершаваных радках можа гучаць, напрыклад, так:

Мы стаім, бо мы — дзяды,
Ты ж працуй, ты — малады.
Будзеш добра працаваць, —
Зможаш потым пастаяць.

Пяру спадара Федаракі належаць і яшчэ чатыры радкі, дзеля якіх (на мой погляд), ну безумоўна ж, варта было друкаваць гэты здымак, варта было ў каторы раз пералапачваць сотні чытацкіх подпісаў:

Камп'ютары, аргтэхніка,
Шыкоўны «Мерседэс»...
Без простага сантэхніка
Накрыецца прагрэс!

На гэтай прыгожай, паважлівай ноце і можна было б завяршыць агляд. Ды засталіся яшчэ некалькі прапаноў, вартых увагі грамадскасці:

Мы тут курткі рэкламуем —
Зараз яны з флікерам,
Як усё прадэманструем,
Замачыць паклікаем, —

абяцаюць ахвотным сужэнцы Астроўскія.

Усё зрабілі б! І ў міг, —
Малаток адзін на ўсіх...
Хто не грыз граніт навукі,
Адбівае зараз рукі, —

заўважае настаўнік Аляксандр Пуцэйка з Вілейкі — з клопатам, відаць, пра сённяшніх вучняў?

Што ж датычыцца іншых удзельнікаў конкурсу, то яны (як мне здаецца) паклапаціліся пра ўсіх. «Я даўно заўважыла, піша, прынамсі, спадарыня Гудачкова, — што людзі нейкія панурыя сталі, рэдка ўсміхаюцца адно аднаму — мусіць, адвыклі... То хай пачытаюць нашу рубрыку «Хто каго?», хай пасмяюцца!»

Хай (дадамо ад сябе), усміхнуўшыся, паглядзяцца ў люстэрка і пераканаюцца ў тым, што ўсмешка ўпрыгожвае чалавека больш, чым новая сукенка ці шапка.

То «чапляйце» яе на твар і ведайце: у вас — атрымаецца! Усё... У тым ліку і подпіс пад новы здымак.

Што датычыцца старога (на ім, нагадаем, была самотная Снягурка і Дзед Мароз пад ручку з нейкай чарнявай...), то лепшыя подпісы да яго, па меркаванні вялікага чытацкага журы, склалі спадары Гаўрыш з Пастаўшчыны, Барысёнак з Ушаччыны і Федарака са Скідзеля, спадарыні Тарасік з Мінска, Малевіч з вёскі Старына Мядзельскага раёна і Вайда з Вілейкі. З гэтым, апошнім меркаваннем пагадзілася і маленькае рэдакцыйнае журы. Так што каштоўны прыз у выглядзе падпіскі на трэці квартал на дарагую сэрцам «Звязду» накіроўваецца ў Вілейку, да вучаніцы 5-га класа АСШ № 3 Яны Вайды. Калі хочаце, каб да вас — пішыце. Здымак, як заўжды, дадаецца. І ўмовы не мяняюцца: коратка — не больш за 8 радкоў у версіі (колькасць версій не абмяжоўваецца), трапна. І, пажадана, разборліва.

Валянціна ДОЎНАР.
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Нічога асабістага!

А ТЫ ПАЙШОЎ БЫ НА ФРОНТ?

Ёсць кнігі, пасля якіх ты сядзіш і разважаеш. Прымяраеш сітуацыю на сябе. І думаеш:

Занатоўкі мастака

Давер і дзверы

Ключ ад сваёй кватэры я спакойна магу пакінуць у суседзяў. Учора дачка занесла мае ключы да Граковічаў. Я падзякаваў ім за турботы, адчыніў кватэру і падумаў, што колькі жыву, столькі пакідаю ключы ў суседзяў, а яны, у сваю чаргу, пакідаюць ключы ў мяне. Добра гэта ці кепска? Не задумваўся, бо ўсё жыццё пражыў, так атрымліваецца, з незачыненымі дзвярыма. Нашы ключы былі ў Сурковых і Караткевічаў, а іх ключы былі ў нас. Вера Арэстаўна і Валянціна Браніславаўна, так здарылася, былі ахоўніцамі кватэр, дзе я жыў. Можа толькі мне заўсёды шанцавала з суседзямі? А можа ў мяне няма чаго хаваць ад людзей? Ну няма ў мяне сакрэтных дакументаў, няма вайсковых таямніцаў і шпіёнскіх шыфраў... Але ў мяне ёсць давер да людзей. А хіба можна без даверу да чалавека пакінуць у яго ключы ад дома?.. Не, канешне.

Гузік і Ван Гог

Разглядаючы аўтапартрэт Ван Гога з параненым вухам, я лавіў сябе на думцы, што моцна шкадую чужога мне чалавека. Ён у калматай зімовай шапцы ды летне-зялёным палітоне пасмоктвае чорную піпку і пазірае на мяне сцюдзёна-блакітнымі вачыма. Ягонае вуха заматана белай анучай. Празрыста-белы дым клубіцца над піпкаю... Адкуль бярэцца шчымлівае пачуццё шкадобы? Напачатку, я меркаваў, што белая павязка на вуху выклікае гэткае моцнае пачуццё, бо такую ж самую павязку рабіла баба Ядзя, калі мне ў дзяцінстве разбалелася вуха. Яно стралял, боль працінаў галаву наскрозь, было кепска, я не мог глядзець на сонечнае святло і ляжаў у пакоі з закрытымі шторамі. Гарачы кампрэс пах халаднаватаю гарэлкаю. Мае асабістыя ўспаміны накладаліся на аўтапартрэт вялікага галандца і нараджалі пачуццё шкадобы, так я думаў, пакуль не звярнуў увагу на вялікі, на круглы непамерна вялікі зялёны гузік на палітоне. Гузік такі вялікі, што здатны ператварыць дарослага чалавека ў дзіця. Мне шкада дзіця, мне шкада маленькага хлопчыка з хворым вухам.

Прафесійнае вока

Вакзал. Натоўп. Дзяўчына! Такую трэба маляваць. Карціна, а не дзяўчына. Боты на абцасах, чорны кароткі палітон, шалік ласкава-бэзавы. Каштанавыя кудзеры рассыпаліся на плячах. Светлы твар. А вочы! Якія вочы! Яны цябе заварожваюць сіняй чарнатою. Мне трэба на працу, спазняюся, але спыніўся і разглядаю дзяўчыну-карціну. І разумею, што я ўжо маляваў такую дзяўчыну, маляваў шмат разоў. Маляваў я яе даўно, трыццаць гадоў таму. Я маляваў маці гэтай карціны-дзяўчыны, маляваў чорную сінечу яе магічных вачэй. Дакладна, я яе маляваў, бо дзяўчына — мая старэйшая дачка...

Парадак у майстэрні

У майстэрні павінен быць парадак. Карціна, хочаш ты таго ці не хочаш, адлюстроўвае асяроддзе. Калі ў майстэрні брудна і поўна рознай непатрэбшчыны, дык і на тваім палатне з'явіцца бруд і смецце. Заявы кшталту: «У мяне хапае сілаў толькі на тое, каб навесці парадак у сваіх творах!» — несусветнае глупства і самападман. Чысціня майстэрні ў пэўнай ступені гарантуе чысціню тваёй творчасці. Таму я старанна прыбіраю майстэрню, імкнуся не трымаць у ёй выпадковых і неабавязковых рэчаў. Таму я складваю свае рэчы акуратна і з любоўю. Але здараюцца і супярэчнасці... Акрылавыя фарбы, якімі я працую на палатне, найлепш змешваць на белай талерцы. Я сам зрабіў гэтае адкрыццё, а толькі потым прачытаў, што гэта звычайная практыка. Свае талеркі з фарбамі падчас працы я старанна мыю па некалькі разоў. Вымытыя талеркі я пакідаў на падлозе, пад чарупінай. Там яны сохлі. Ставіць талеркі на падлогу — кепская звычка, як і звычка класці на падлогу палітру ці камп'ютар. Ведаеш, а кладзеш, бо не надаеш гэтай дробязі асаблівай увагі, пакуль не наступіш на камп'ютар ці не ўлезеш у палітру са свежымі фарбамі. У маім выпадку ўсё скончылася без асаблівай шкоды для рэчаў. Я проста заўважыў, што тры белыя талеркі стаяць побач з унітазам. Мне зрабілася млосна, ад такога вялікага белага нацюрморта, які можна было б назваць «Мара капрафага». Пры ўсёй сваёй светласці, бялютаксасі і чысцюткасці нацюрморт быў жудасна брудны. Цяпер я не стаўлю свае талеркі на падлогу, цяпер я іх старанна выціраю анучкаю пасля мыцця і стаўлю на адмысловую паліцу, дзе ім добра побач з пластыкавай палітраю і каробкай з фарбамі. Можаш папракаць мяне за дробязнасць і раздражнёнасць малаістотным, але твае папрокі я не прыму, бо парадак у майстэрні неабходны, бо твая майстэрня, як і твая карціна, адлюстроўвае парадак і чысціню розуму, як сабор адлюстроўвае сусвет.

Постправаслаўнае штукарства

Углядаючыся ў сучасныя абразы праваслаўных мастакоў, я зрабіў для сябе адкрыццё... Яны пішуць свае навятворы з навуковым падыходам. Разумею, як парадаксальна гучыць мая думка, але інакш пра іх і не скажаш. Ніякіх рэлігійных пачуццяў, ніякіх мастацкіх перажыванняў у постабразах няма. Ёсць камерцыйны разлік, ёсць праявы рамяства, ёсць рацыя. Раней падобную дзейнасць называлі халтураю, але слова «халтура» зашмулялася ад бясконцага ўжытку. Таму я, выключна для сябе, назаву іх дзейнасць постправаслаўным штукарствам.

Дабужынскі і grosse Linie

Графік Мсціслаў Дабужынскі згадваў, як ягоны настаўнік Ашбе патрабаваў grosse Linie. «Працаваць толькі вялікімі лініямі», — загадваў настаўнік сваім вучням. Мудрае патрабаванне тычылася не толькі графікі і жывапісу, яно тычылася ўсяго жыцця наогул. Сваё жыццё, сапраўды, варта маляваць не дробнымі рыскамі, а выразнымі вялікімі лініямі.

Хрыстос і грушы з яблыкамі

Хрыстос, напісаны Сурбаранам, уражвае так, што перахоплівае дыханне. Табе здаецца, што лепшага палатна ты ніколі ў сваім жыцці не пабачыш. Ты стаіш, а Хрыстос уздымаецца над табою і ляціць над светам. Няма словаў... Прыгаломшаны, ты паварочваешся спіною да рукатворнай велічы, робіш некалькі крокаў і бачыш «Грушы». Звычайныя, крыху зеленкаватыя грушы, напісаныя тым жа ж Сурбаранам. Спакой і цішыня вакол груш. Табе робіцца добра. Ты адчуваеш, што грушы ў Сурбарана атрымаліся значна лепей за Хрыста. Адчуваеш, але ўслых не прагаворваеш сваё адкрыццё. Каб яго спраўдзіць, ты разглядаеш «Зняцце з крыжа», вымаляванае рукою Сезана і параўноўваеш яго з яблыкамі. Яблыкі ў Сезана зроблены больш пераканаўча за вобраз Хрыста. Здавалася б, пасля такой відавочнай і пераканаўчай з'явы ты не павінен маляваць Ісуса. Ты мусіш загадзя прызнаць сваю паразу і пісаць чырвоныя яблыкі з зеленкаватымі грушамі, пісаць шкляныя бутэлькі і металёвыя кубкі. Не, ты не скараешся, ты спрабуеш напісаць Хрыста. Ведаеш, што з гэтага амаль нічога не атрымаецца, але верыш у абавязковасць такой спробы, як верылі Сезан і Сурбаран.

Адам ГЛОБУС.

Ёсць нагода

КАВА для сакратаркі

Адказваць на сотні званкоў і лістоў, афармляць пачкі дакументаў, гатаваць літры кавы і гарбаты, прымаць бясконцую колькасць наведвальнікаў — часта адначасова. І пры ўсім гэтым захоўваць спакой і бездакорны выгляд. Каб справіцца, трэба быць крыху спецыялістам па кадрах, крыху «жывым штодзённікам», крыху службай даведак, у вялікай ступені псіхолагам, а афіцыйна — сакратаром. Прафесійнае свята гэтых людзей ужо больш як паўстагоддзя адзначаецца ў сераду апошняга поўнага тыдня красавіка.



Міжнародны дзень сакратара (Formerly Secretaries Day) пачалі адзначаць з 1952 года ў ЗША. Увогуле там традыцыйна праходзіць цэлы тыдзень прафесійных адміністрацыйных работнікаў, а ў сераду святкуюць менавіта сакратары, зрэшты, таксама як і іншыя офіс-ныя работнікі — памочнікі кіраўнікоў, офіс-менеджары, асістэнты і г.д.

У Беларусі і Расіі афіцыйна асобнага дня сакратароў няма; але, напрыклад, некалькі гадоў таму ініцыятыўная група сакратароў з Масквы, Санкт-Пецярбурга, Варонежа, Растова-на-Доне, Новасібірска, Таганрога і Пермі прапанавалі заснаваць такое свята — і адзначаць яго кожную трэцюю пятніцу верасня. Віншаванні ў гэты дзень у Расіі прымаюць каля 1 мільёна чалавек (праўда, у сувязі з крызісам гэта лічба крыху зменшылася).

Таксама ў верасні — у 5-ы дзень месяца — адзначаюць Дзень сакратара ў Паўднёва-Афрыканскай рэспубліцы.

Ва ўсіх гэтых краінах у святочны дзень сакратарам заведзена рабіць невялікія падарункі — не занадта асабістыя, з намёкам на магчымую сувязь паміж босам і сакратаром, і не празмерна прагматычныя, як сродак для мыцця вокнаў. У любым выпадку, нават такая дробязь, як некалькі цёплых словаў віншавання і кубачак кавы, будзе прынятая з удзячнасцю.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

АНЕКДОТ У ТЭМУ

Шэф выклікае да сябе сакратарку:

— Гэты ліст трэба тэрмінова перадрукаваць і адправіць факсам. Паглядзіце, што вы напісалі: «Дарагі сябар»! Гэтаму махляру і прайдзісвету?!

— Добра, я ў момант усё выпраўлю. Як трэба напісаць?

— «Паважаны калега!».

Консульскай службе Расіі — 200 гадоў

КАБ ПАПОЎНІЦЬ ПРАЦОЎНЫЯ РЭСУРСЫ

15 мая 2009 года Расійскай консульскай службе спаўняецца 200 гадоў. У гэты дзень імператар Аляксандр I зацвердзіў прадстаўленне міністра замежных спраў М.П. Румянцава аб стварэнні ў рамках МЗС «Экспедыцыі консульскіх спраў».

Маючы агульныя звесткі аб пытаннях, што вырашаюцца консулам (дарэчы, у перакладзе з лацінскай consul азначае «дарадчык»), не заўсёды можна ўявіць, наколькі шырокі сёння спектр яго дзейнасці. Напрыклад, у Расіі з верасня 2007 года дзейнічае Дзяржаўная праграма па аказанні садзейнічання добраахвотнаму перасяленню ў Расійскую Федэрацыю суайчыннікаў, што пражываюць за мяжой. Куды павінны звярнуцца грамадзяне, якія хочуць прыняць удзел у гэтай дзяржпраграме? Безумоўна ж, у расійскае консульства. Пра гэты кірунак дзейнасці Пасольства Расіі ў Мінску нашаму карэспандэнту расказаў загадчык консульскага аддзела расійскага дыпламатычнага прадстаўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь У.А. МАЛЫШАЎ.

— Уладзімір Аляксандравіч, хто можа стаць удзельнікам гэтай дзяржпраграмы? І ці шмат ужо з'явілася ахвотных?

— Праграма не абмяжоўвае кола патэнцыйных перасяленцаў, але пры гэтым падкрэслівае, што менавіта суайчыннікі, якія выхаваны ў традыцыях расійскай культуры, валодаюць рускай мовай і не жадаюць губляць сувязь з Расіяй, найбольш здольныя да адаптацыі ў расійскім грамадстве.

У консульскі аддзел Пасольства Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь ужо звярнуліся і запоўнілі анкеты на ўдзел у дзяржпраграме 126 чалавек, а 49 сталі яе ўдзельнікамі.

— У якія расійскія рэгіёны запрашаюцца перасяленцы? Ці можна па гэтай праграме пераехаць, напрыклад, у Маскву?

— Дзяржпраграма накіравана не толькі на вырашэнне дэмаграфічнай праблемы, але і на «запаўненне прабелаў» у працоўных рэсурсах у шэрагу рэгіёнаў. Таму суайчыннікі запрашаюцца туды, дзе яны найбольш патрэбныя. У праграму не ўваходзяць буйныя мегаполісы, у якіх няма недахопу ў працоўных рэсурсах. Рэгіёны, што ўдзельнічаюць у Дзяржпраграме, падрыхтавалі свае схемы і парадак прыёму суайчыннікаў, зыходзячы з мясцовых сацыяльна-эканамічных умоў. Яны таксама вызначаюць, колькі чалавек ім патрабуецца, на якія спецыяльнасці і якой кваліфікацыі.

— Што гэта за рэгіёны?

— У спіс «пілотных рэгіёнаў», якія першымі ўзялі ўдзел у Дзяржпраграме, увайшлі Цюменская, Калінінградская, Калужская, Ліпецкая, Тамбоўская, Цвярская, Новасібірская, Іркуцкая і Амурская вобласці, Краснаярскі, Прыморскі і Хабараўскі краі. З сакавіка гэтага года суайчыннікаў прымае і Курская вобласць.

— Якую фінансавую і матэрыяльную дапамогу выдзяляе расійская дзяржава сваім «новым грамадзянам»?

— Поўны пакет дзяржаўнай падтрымкі перасяленцаў уключае ў сябе некалькі яе відаў. Па-першае, кампенсацыю выдаткаў на пераезд да будучага месца жыхарства і правоз асабістай маёмасці. Сям'і да трох чалавек уключна кампенсуюцца выдаткі на перавозку асабістай маёмасці 5-тонным кантэйнерам, сям'і, большай за тры чалавекі, — двума 5-тоннымі кантэйнерамі. Па-другое, кампенсацыю выдаткаў на аплату дзяржпошліны за афармленне дакументаў, якія вызначаюць прававы статус перасяленцаў на тэрыторыі Расіі. Па-трэцяе, кампенсацыю мытных плацяжоў і падаткаў на вываз уласнай маёмасці з краіны выезду. Пачацвёртае, аднаразовая дапамога на ўладкаванне або так званыя пад'ёмныя. Па-пятае, штомесячная дапамога па беспрацоўі да набыцця грамадзянства Расіі, але не больш за 6 месяцаў. Пашостае, кампенсацыйны пакет удзельніка Дзяржпраграмы, у які ўваходзяць паслугі дзяржаўных і муніцыпальных дзіцячых садкоў, адукацыйных устаноў, сацыяльнага абслугоўвання, аховы здароўя і службы занятасці. Па-сёмае, вызваленне ад выплаты мытных пошлін, падаткаў і збораў на аўтамабілі, хоць тут ёсць некаторыя абмежаванні па колькасці аўто і тэрмінах іх набыцця.

Выплачваюць кампенсацыю тэрытарыяльныя органы Федэральнай міграцыйнай службы (ФМС) Расіі пасля рэгістрацыі сям'і па новым месцы жыхарства па фактычных, дакументальна пацверджаных выдатках.

— Ці аказваецца дапамога ў вырашэнні жыллёвых праблем перасяленцаў?

— Гэтае пытанне аддаецца на разгляд суб'екта Расійскай Федэрацыі. Суб'ект у рамках рэгіянальнай праграмы можа аказваць перасяленцам, акрамя асноўнага пакета дзяржаўных гарантый, дадатковую падтрымку, у тым ліку па працаўладкаванні і забеспячэнні жыллём. У некаторых рэгіёнах для ўдзельнікаў Дзяржпраграмы выкарыстоўваюцца сістэмы іпатэчнага жыллёвага крэдытавання.

— Які статус атрымліваюць перасяленцы? І калі яны змогуць набыць расійскае грамадзянства?

— Прайшоўшы ўсе неабходныя працэдуры, суайчыннік набывае статус удзельніка Дзяржпраграмы, які замацоўвае яго правы і абавязкі, а таксама абавязацельствы перад ім суб'екта Расійскай Федэрацыі, які яго прыняў. Удзельніку Дзяржпраграмы выдаецца пасведчанне, якое дае прыярытэт на атрыманне дазволу на часовае пражыванне, на атрыманне пасведчання на права жыхарства і набыццё расійскага грамадзянства.

Больш падрабязна з Дзяржпраграмай, а таксама з інфармацыйнымі матэрыяламі, распрацаванымі суб'ектамі Расіі — удзельнікамі Дзяржпраграмы, можна азнаёміцца на сайце ФМС Расіі: www.fms.gov.ry/ або Пасольства Расіі ў Беларусі: www.belarus.mid.ru/, а таксама па тэлефоне ў Мінску: 306 27 28

Пытанні задаваў Барыс ЗАЛЕСКІ.

Віншуем цябе, дарагая

Тамара Мікалаеўна САСНОЎСКАЯ,

з юбілеем

і зычым моцнага здароўя, бадзёрасці, вясновага настрою, поспехаў у працы і доўгіх гадоў жыцця.

Муж, дзеці,
г. Мінск.

Прафілактыка

Прышчапіўся — на хваробу забыўся

У панядзелак пачаўся Еўрапейскі тыдзень імунізацыі, які праводзяць еўрапейскае рэгіянальнае бюро Сусветнай арганізацыі аховы здароўя і Дзіцячы фонд ААН (ЮНІСЕФ). У пяты раз гэта акцыя пройдзе і ў Беларусі.

— Яе мэта, — гаворыць **галоўны эпідэміёлаг Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Іна КАРАБАН**, — узняць узровень інфармаванасці насельніцтва аб неабходнасці імунапрафілактыкі. Падчас Еўрапейскага тыдня імунізацыі ў арганізацыях аховы здароўя рэспублікі будзе арганізавана работа «гарачых ліній», «тэлефонаў даверу», адбудуцца кансультацыі спецыялістаў (педыятраў, неўролагаў, алерголагаў, імунолагаў, эпідэміёлагаў) па пытаннях імунапрафілактыкі.

Інфекцыйныя хваробы працягваюць забіраць жыцці людзей, многіх робяць інвалідамі. І адмова ад прышчэпак яшчэ ў большай ступені спрыяе гэтаму.

А, між тым, хваробы, папярэджаныя вакцынацыяй, можна перамагчы і ліквідаваць. Напрыклад, воспа, ад якой штогод паміралі 5 мільёнаў чалавек ва ўсім свеце, была цалкам ліквідавана ў 1978 годзе, і сёння на гэтую хваробу ўжо амаль усе забыліся. У 2002 годзе Сусветная арганізацыя аховы здароўя абвясціла Еўрапейскі рэгіён свабодным ад поліяміэліту. На чарзе адзёр, краснуха і сіндром прыроджанай краснухі, якія застаюцца сур'ёзнымі праблемамі для многіх краін.

За апошнія 50 гадоў у Беларусі папярэджана больш за 3 мільёны выпадкаў адзёру пры дапамозе адзінага інструмента — прышчэпкі. Захваральнасць на краснуху ў рэспубліцы за апошнія 10 гадоў знізілася больш чым у 20 тысяч разоў.

— Сёння пытанні вакцынацыі ў Беларусі выношваюцца на добрым навуковым узроўні, — гаворыць **загадчык кафедры дзіцячых інфекцыйных хвароб Беларускага медыцынскага ўніверсітэта, дацэнт, галоўны дзіцячы інфекцыяніст Міністэрства аховы здароўя Іна ГЕРМАНЕНКА**. — Урачы маюць больш сучасныя, камбінаваныя вакцыны, якімі можна праводзіць прафілактыку адразу супраць некалькіх інфекцый. Імі на сто працэнтаў забяспечаны ўвесь прафілактычны каляндар прышчэпак. Важна толькі захоўваць гэты каляндар.

Вольга ШАЎКО.

КОЖНЫ ПАЛЯЎНІЧЫ І РЫБАЛОЎ ЖАДАЕ ВЕДАЦЬ...

Пра нюансы аматарскага рыбалоўства падчас забароны на лоўлю рыбы ў сувязі з яе веснавым нерастам мы напярэдадні ўводу гэтай забароны ўжо пісалі. Але ж яна будзе дзейнічаць да 30 мая, ды і паляўнічы сезон працягваецца. Словам, і ў рыбаловаў, і ў паляўнічых узнікае мноства пытанняў, што патрабуюць кампетэнтных адказаў і каментарыяў. Таму сёння мы працягнем тэму, якую ўзнімалі на старонках «Звязды» 26 сакавіка — пагаворым пра найбольш характэрныя сітуацыі, у якія можа патрапіць рыбалоў ці паляўнічы. Як правільна паводзіць сябе, каб не стаць парушальнікам заканадаўства, не нанесці ўрону прыродзе, раскажуць работнікі Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Ці дазваляецца рыбаловам-аматарам ў перыяд дзеяння забароны на лоўлю рыбы мець на рыбалцы некалькі вудаў, напрыклад, паплаўковую, спінінг і фідэр, але лавіць толькі на адну прыладу? Астатнія будуць у гэты час у чахле.

— У азначаны перыяд, займаючыся аматарскім рыбалоўствам адной вудай ці спінінгам з адным кручком, вы можаце мець з сабой у зачэхленым стане любую колькасць рыбалоўных прыладаў, выкарыстанне якіх дазваляецца ў гэты час.

— Ці можна падчас забароны лавіць паплаўковай вудай на жыўца?

— Адлаўліваць жыўца пад'ёмнікам у перыяд дзеяння забароны нельга. Аднак калі вы набылі яго ў краме, маеце пацвярджальныя дакументы, і лавіць будзеце з берага паплаўковай вудай, выкарыстоўваючы ў якасці прынады набытага жыўца, дык гэта не будзе парушэннем.

— А ментуза ноччу можна лавіць?

— Па 30 мая рыбаловам-аматарам можна лавіць рыбу дазволенымі ў гэты час прыладамі рыбалоўства толькі ў светлы час сутак і з берага. Калі ж вы здабудзеце ментуза ў цёмны час сутак, гэта будзе парушэнне пункта 131 Правілаў вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства з усімі наступствамі.

— Як вылічваецца ўрон пры незаконным вылаве падчас веснавой забароны «чырвонакніжнай» рыбы?

— Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 580 ад 8 снежня 2005 года прынятыя таксы для вызначэння памеру пакрыцця ўрону, нанесенага навакольнаму асяроддзю фізічнымі і юрыдычнымі асобамі ў выніку незаконнага выманя ці знішчэння дзікіх жывёл і шкоднага ўздзеяння на асяроддзе іх пражывання. Згодна з Указам, пры незаконным выманні дзікіх жывёл, што жывуць ва ўгоддзях, у якіх забаронена іх выманне ці знішчэнне, або рыбы ў тэрміны, калі яе выманне ці знішчэнне забаронена (у тым ліку і падчас веснавой забароны), шкода пакрываецца на падставе таксаў, вылічаных у трайным памеры па кожнай здабытай ці знішчанай дзікай жывёліне або віду рыбы. Таксама ў трайным памеры спаганяецца шкода за вылаў відаў рыб, уключаных у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь: сцерлядзь, ручаёвую фарэль, еўрапейскага харыуса, сёмгу, кумжу, корушку (снятка), рапушку, звычайнага ўсача, рыбца, падуста.

Пры вылаве рыбы прыладамі рыбалоўства, прынцып працы якіх заснаваны на выкарыстанні электрамагнітнага поля, ультрагуку, шляхам выбуху ўрон пакрываецца на падставе таксаў, што вылічваюцца ў пяцікратным памеры. У адпаведнасці з Палажэннем аб парадку вылічэння памеру пакрыцця шкоды, нанесенай навакольнаму асяроддзю, і складання акта аб выяўленні факта нанясення шкоды навакольнаму асяроддзю, гэты самы памер вылічваецца шляхам паслядоўнага памнажэння таксаў, вызначаных Указам, на адпаведныя, вызначаныя Указам, каэфіцыенты. Да прыкладу, пры разліку шкоды за адзін экзэмпляр незаконна вылаўленай электравудай у перыяд веснавой забароны рыбы, уключанай у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь, такса вылічваецца ў 45-разовым (3х3х5) памеры.

— А як вылічваецца ўрон пры незаконным вылаве вугра — падчас веснавога нерасту і ў іншы час?

— Шляхам памнажэння таксаў на адпаведныя каэфіцыенты, вызначаныя вышэйназваным Указам. Каэфіцыенты, вызначаныя ў яго пункце 1.4, прадугледжваюць пакрыццё ўрону ў перыяд веснавой забароны ў трайным памеры. У адпаведнасці з таксамі для вызначэння памеру пакрыцця шкоды, нанесенай навакольнаму асяроддзю, за здабычу вугра прадугледжана пакрыццё 5 базавых велічынь. Такім чынам, з 1 красавіка па 30 мая памер шкоды, нанесенай за здабычу адной асобіны вугра, складае 525 тысяч рублёў (5 базавых велічынь памножыць на 3). У іншыя перыяды года памер шкоды за здабычу адной асобіны вугра складае 5 базавых велічынь ці 175 тысяч рублёў.

Пры здабычы вугра з выкарыстаннем электралавільнага прыстасавання шкода пакрываецца дадаткова ў пяцікратным памеры. Значыць, пры здабычы адной асобіны вугра ў перыяд з 1 красавіка па 30 мая з выкарыстаннем электралавільнага прыстасавання памер нанесенага ўрону складзе 75 базавых велічынь або 2 625 000 рублёў. У астатнія перыяды года — 25 базавых велічынь ці 875 000 рублёў.

За незаконную здабычу вугра прадугледжана адміністрацыйная і крымінальная адказнасць. Прыцягненне да крымінальнай прадугледжана за здабычу вугра, што перавышае памер базавай велічыні, ці за здабычу вугра, здзейсненую паўторна на працягу года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання за такое ж парушэнне. За здабычу вугра адміністрацыйная адказнасць прадугледжвае пакаранне ў выглядзе штрафу ад 10 да 50 базавых велічынь, а крымінальная, у залежнасці ад ступені і сутнасці парушэння, прадугледжвае адказнасць у выглядзе штрафу, арышту, абмежавання волі тэрмінам да 3 гадоў, пазбаўлення права займаць пэўныя пасады, пазбаўлення права займацца пэўнай дзейнасцю са штрафам, пазбаўлення волі тэрмінам да 6 гадоў.

— Ці з'яўляецца парушэннем лоўля спінінгам на воблер, што мае два трайнікі (памерам, не большым за № 10 па міжнароднай класіфікацыі) у перыяд веснавой забароны? Здымаць ці не здымаць другі трайнік?

— Так, з'яўляецца. У пункце 131 Правілаў вызначана, што ў названы перыяд аматарскае рыбалоўства дазваляецца адной вудай з адным кручком ці адным спінінгам, які мае штучную прынаду, з адным адзінарным або двайным ці трайным кручком памерам, не большым за № 10 па міжнароднай класіфікацыі. Другі трайнік вы павінны зняць.

— А пры сабе на рыбалцы (у кардоначцы) можна мець воблеры з двума трайнікамі? А лішні трайнік здымаць непасрэдна на вадаёме, перад тым, як прышпіліць воблер да спінінга?

— Пры сабе вы можаце мець толькі дазволеныя ў гэты перыяд прылады лоўлі.

— Патлумачце, ці можна падчас веснавой забароны лавіць на донную вуду з адным кручком? Ці яна абавязкова павінна быць паплаўковай?

— У адпаведнасці з пунктам 127 Правілаў, падчас веснавой забароны на лоўлю рыбы дазваляецца аматарскае рыбалоўства адной вудай (паплаўковай, донай, нахлыставай) з адным кручком.

— Як праводзіцца вымярэнне злоўленай рыбы для вызначэння прамысловай меры?

— У адпаведнасці з пунктам 70 Правілаў вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства, даўжыня рыбы вызначаецца вымярэннем адлегласці ад вяршыні рыла (пры закрытым роце) да лініі пачатку сярэдніх прамняў хваставога плаўніка, даўжыня рака і крэвяткі — ад лініі вачэй да канца сярэдняй хваставой пласціны.

— Хацеў бы заняцца падводным паляваннем. Якія для гэтага патрэбны дакументы? Якую колькасць рыбы і якіх памераў можна здабываць такім чынам?

— Каб займацца падводным паляваннем, грамадзянін павінен мець пасведчанне падводнага паляўнічага і быць членам рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў». Пасведчанне падводнага паляўнічага выдаюць арганізацыі АСВОД (тэлефон у Мінску — 203 25 52). Падводнае паляванне пры наяўнасці такіх дакументаў можа весціся на водных аб'ектах, перададзеных у арэнду для арганізацыі платнага аматарскага рыбалоўства, дзе арандатарам прынята рашэнне аб арганізацыі названага віду аматарскага рыбалоўства. У гэтым выпадку падводнае паляванне вядзецца за плату і колькасць дазволенай да вылаву рыбы вызначаецца арандатарам.

У фондзе запасу рыбалоўных угоддзяў падводнае паляванне дазваляецца на тых водных аб'ектах, дзе райвыканкамамі прынята рашэнне аб арганізацыі аматарскага рыбалоўства інтэнсіўным спосабам і, у прыватнасці, падводнага паляванне. У гэтых вадаёмах падводнае паляванне вядзецца бясплатна і да вылаву дазваляецца 5 кілаграмаў рыбы на аднаго рыбалова ў суткі.

— Ці вызначаны месцы для аматарскага рыбалоўства на тэрыторыі заказніка «Лябяжы»?

— У адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 94 ад 26 студзеня 2007 года, аператыўнае кіраванне рэспубліканскім біялагічным заказнікам «Лябяжы» праводзіць Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт. У мэтах захавання вадаплаўных і балотных птушак, у тым ліку і ўключаных у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь, Мінгарвыканкам лічыць немэтазгодным вызначаць месцы для вядзення тут аматарскага рыбалоўства.

— Падчас нерасту рыбы забараняецца эксплуатацыя любых маламерных суднаў. А што рабіць з устаноўкай чуналаў пры паляванні на качароў?

— Падчас веснавога сезона паляванні, што прыпадае на перыяд веснавога нерасту рыбы з 1 красавіка па 30 мая, грамадзянам дазваляецца выкарыстоўваць маламерныя судны без рухавікоў для ўстаноўкі (зняцця) падсадных качак, профіляў, чуналаў і пад'ёму здабытай дзічыны. Такім чынам, гумавую лодку ці іншае маламернае судна без рухавіка паляўнічыя могуць выкарыстоўваць прыкладна на дыстанцыі стрэлу ад схованкі і толькі для пералічаных мэтаў. Выкарыстанне маламерных суднаў для перасоўвання па водных аб'ектах па месца палявання, адпачынку і г.д. Правіламі не дапускаюцца, парушальнікі прыцягваюцца да адміністрацыйнай адказнасці.

— Ці дазваляецца выкарыстанне электронных вабікаў пры паляванні на гусей і качак?

— У веснавы сезон палявання на гусей і качак дазваляецца паляванне з падманьваннем. Віды вабікаў, што могуць быць выкарыстаны, Правіламі не рэгламентуюцца, адпаведна, дазваляецца выкарыстанне любых вабікаў.

Падрыхтаваў Сяргей РАСОЛЬКА.

ЗАО «Дельта Банк»

220036, г. Минск, ул. Розы Люксембург, 95. Тел. 256 19 08
www.deltabank.by

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2009 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.04.2009	01.04.2008
1	2	3	4	5
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	3 195,1	—
3	Средства в Национальном банке	1102	2 109,6	389,5
4	Ценные бумаги:	1103	—	—
	для торговли	11031	—	—
	удерживаемые до погашения	11032	—	—
	в наличии для продажи	11033	—	—
5	Кредиты и другие средства в банках	1105	23 293,0	54 960,8
6	Кредиты клиентам	1106	60 596,1	9 440,1
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107	703,4	551,3
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	10 341,1	3 269,3
9	Прочие активы	1109	6 007,2	2 680,8
10	ИТОГО активы	110	106 245,5	71 291,8
11	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
12	Средства Национального банка	1202	—	—
13	Кредиты и другие средства банков	1205	11 557,8	675,7
14	Средства клиентов	1206	25 220,1	1 008,7
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208	—	—
16	Прочие обязательства	1209	2 717,9	4 907,7
17	ВСЕГО обязательства	120	39 495,8	6 592,1
18	**КАПИТАЛ**			
19	Уставный фонд	1211	64 000,0	64 000,0
20	Эмиссионный доход	1212	—	—
21	Резервный фонд	1213	260,0	260,0
22	Накопленная прибыль	1214	2 328,9	278,9
23	Фонд переоценки статей баланса	1215	160,8	160,8
24	ВСЕГО капитал	121	66 749,7	64 699,7
25	ИТОГО обязательства и капитал	12	106 245,5	71 291,8
26	**ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ**			
27	Требования	1301	45 323,5	1 198,9
28	Обязательства	1302	38 507,4	2,3

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2009 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.04.2009	01.04.2008
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	2 997,0	373,3
2	Процентные расходы	2012	786,4	31,4
3	Чистые процентные доходы	201	2 210,6	341,9
4	Комиссионные доходы	2021	7 386,1	108,9
5	Комиссионные расходы	2022	78,1	14,5
6	Чистые комиссионные доходы	202	7 308,0	94,4
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203	(-671,1)	1 943,7
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	—	—
9	Доход в форме дивидендов	205	—	—
10	Чистые отчисления в резервы	206	440,1	6,3
11	Прочие доходы	207	2 874,5	1 258,8
12	Операционные расходы	208	8 361,9	3 340,7
13	Прочие расходы	209	396,8	34,5
14	Налог на прибыль	210	448,2	6,1
15	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	2 075,0	251,2

Председатель Правления **И.С. Партнова**

Главный бухгалтер **С.И. Миркевич**

Лицензия НБ РБ на осуществление банковской деятельности № 27 от 01.09.2007 г. УНП 807000015

Гучная справа

БЕЗ МІЛЬЁНА І СВАБОДЫ...

...засталіся браты-прадпрымальнікі, якія «развялі» дзяржаву больш як на мільён долараў, але так і не прызналі злачыннасці сваіх дзеянняў, за што панеслі досыць сур'ёзнае пакаранне.

У сярэдзіне 90-х браты Данейкі — Артур і Дзмітрый — стварылі ТАА «Дэсперада». Слова «дэсперада», якое ў перакладзе азначае «адчайны», прыйшло ім у галаву з аднайменнай галівудскай кінастужкі, дзе вобраз менавіта такога хлопца стварыў Антоніа Бандэрас і якая выйшла на экраны акурат у гэты час.

Выпускнікі фізфака Белдзяржуніверсітэта браты Данейкі — з добрай адукаванай сям'і. Пры пяцігадовай розніцы ва ўзросце яны — вельмі розныя як па характары, так і знешне. Можна сказаць, дзве супрацьлегласці. Што да характараў, то старэйшы Артур — скрупулёзны, удумлівы і сур'ёзны. Між іншым, калісьці меў нават сур'ёзныя намеры заняцца навуковай дзейнасцю. Малодшы ж Дзмітрый — адкрыты, легкадумны, залішне самаўпэўнены. Уся гэта «сумесь» вартасцяў аказалася той сілай, якая дапамагла наладзіць незаконны бізнэс з нерыстойна вялікім даходам.

Супрацоўнікаў для сваёй фірмы браты набіралі пераважна з ліку знаёмых — аднакурснікаў, іх сваякоў і блізкіх. Больш за тое, у работнікаў павінна была быць бездакорная рэпутацыя. Калі высвятлялася, што ў некага была судзімасць або судзімасць мела месца ў яго сваякоў, такі чалавек як мага хутчэй звальняўся на любой падставе.

Спачатку «Дэсперада» займалася рознічным гандлем прадуктамі, але ў хуткім часе перайшла да продажу запчастак для трактароў. Запчасткі гэтыя танныя і, вядома, вельмі запатрабаваныя. Паступова фірма пачала прафілявацца на забеспячэнні самым шырокім асартыментам, неабходным для карыстальнікаў трактароў. Нарадзілася эфектыўная сістэма пастаўкі запасных частак. Тры створаныя братамі пад адным дахам фірмы займаліся больш як 3 тысячамі розных дэталяў да сельскагаспадарчай тэхнікі.

Як і належыць, некалькі гадоў запар падатковыя органы правяралі фірму, аднак ніякіх парушэнняў не выяўлялі. Іншая рэч, ніхто не думаў аб неабходнасці правядзення сустрэчных праверак — усяго ланцуга фірмаў, якія пастаўляюць тавар на «Дэсперада». Высветлілася сітуацыя толькі ў 2006 годзе. Праз некалькі месяцаў спецыяльных праверак падатковай інспекцыі ўдалося пацвердзіць першасную інфармацыю аб тым, што рух тавару на склад фірмы і рух апошняга паводле афіцыйных дакументаў... нідзе не перасякаюцца.

Так, «Дэсперада» адгружала ў Расію запчасткі, але кантрактаў з заводамі, якія іх вырабляюць, не мела. Тое, што менавіта і ў якіх аб'ёмах рэальна перавозілася, не супадала са звесткамі дакументацыі.

— Калі група падатковых інспектараў зверыла бухгалтарскі ўлік з тым, што ляжыць на складзе, выявілася вялікая колькасць няўлічанага тавару, — расказвае **намеснік начальніка следчага аддзела ўпраўлення Камітэта дзяржаўнай бяспекі па г. Мінску і Мінскай вобласці Ганна РАКЕВІЧ.** — Гэта дакладная прыкмета таго, што тавар «шэры». Тавар у многім быў кантрафактны і нават адноўлены, інакш кажучы, быў ва ўжытку, пасля чаго аднаўляўся ў гаражах і выдаваўся за новы...

На склад фірмы траплялі як запчасткі прыватных вытворцаў, якія не плацілі ніякіх падаткаў, так і крадзеныя дэталі або завезеныя з Расіі нелегальным чынам. Пры ўвозе з краіны-суседкі ў машыну грузілі тавару, скажам, на 50 тысяч долараў, а дэкларавалі — на 10 тысяч. У накладной пазначалася вага 20 тон — максімальная загрузка машыны, у той час як дэталі, пералічаныя ў дакументах, могуць важыць не больш за 8 тон. Зразумела, што

Фота Артура СТРЭХА.

У «гарадку», узведзеным у раёне Раўбічаў, знайшлося месца і для більярднай, і для саўны, і для летняй кухні...

Ні ў чым сабе не адмаўляць...

астатняя частка грузу была кантрафактнай.

Пры вывучэнні дакументаў было вызначана, што палову запчастак фірме пастаўлялі буйныя заводы, напрыклад, Мінскі трактарны і яго філіялы. Астатнюю ж колькасць адгружалі ўсяго чатыры фірмы, якія не мелі нават сваіх складоў. Дзеля высвятлення падрабязнасцяў Камітэт дзяржбяспекі ініцыяваў буйную праверку. Былі апытаны як кіраўнікі-пастаўшчыкі, так і кладаўшчыкі з вадзіцелямі. Апошнія, дарэчы, і патлумачылі, што накладныя афармляліся, але тавару яны не бачылі і нічога на згаданыя чатыры фірмы не вазілі. Праверка паказала, што і тыя фірмы, якія быццам бы пастаўляюць тавар на «Дэсперада», таксама прадмета здзелак не бачылі. Аб стане склада і пераліку пастаўшчыкоў удалося даведацца са звестак з дыскеты, якая была канфіскавана ў менеджара «Дэсперада» падчас вобыску. У файлах былі пазначаны не толькі афіцыйныя пастаўшчыкі, але фізічныя асобы з імёнамі, мянушкамі і нумарамі тэлефонаў.

Дарэчы, калі падатковыя інспектары распачалі сваю работу, не толькі кіраўніцтва, але і ўсе супрацоўнікі фірмы зніклі разам з дакументамі, якія маглі б праліць святло на іх дзейнасць. Так, той жа менеджар павінен быў не проста прыхапіць з сабой пакет з дакументамі, але і знішчыць яго. Аднак супрацоўнік, відаць, недаацаніў сітуацыю, і закінуў каштоўны «груз» на хатнюю антрэсоль, дзе яго і знайшлі падчас далейшага вобыску.

Пасля грунтоўнай работы падатковай інспекцыі «Дэсперада» спрабавала абскардзіць яе акт у гаспадарчым судзе — даказаць, што частка тавару была ўсё-такі легальнай. Цікава, што самі кіраўнікі — Артур і Дзмітрый — на судовых разборы не з'яўляліся. Данейкі, што называецца, заляглі на дно, адседжваліся тым часам на дачах сяброў. Чэкісты ведалі пра гэта, але былі не гатовыя прад'явіць братам абвінавачанне.

З аднаго боку, Артур і Дзмітрый баяліся, што за імі вось-вось прыйдуць, а з другога, спадзяваліся, што з дапамогай сваіх уплывовых знаёмых вырашаць і гэта пытанне. Падключылі нават аднаго дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу (цяпер — былога дэпутата), які закідваў праваахоўныя органы дэпутацкімі запытамі. У рэшце рэшт браты разумеюць, што ніхто не спяшаецца па іх ісці і выбіраюць найлепшую тактыку абароны — нападзенне. Выходзяць на прадстаўніцтва дзяржаўнай бяспекі, сталічнае ўпраўленне КДБ і заяўляюць, што ў іх ёсць кампрамат на аператыўнага работніка, які вядзе гэту справу. Калі іх просяць паказаць доказы, тыя пачынаюць «дамаўляцца». У сэнсе, давайце так: вы паставіце над намі куратара, а мы будзем яму выплачваць канкрэтныя грашовыя сумы і... спакойна працаваць. Пры гэтым браты працягваюць актыўна абвінавачваць ва ўсіх грахах «опера», скаргі на якога дасылаюць не толькі на імя кіраўніцтва КДБ. У нейкі момант аператыўны работнік нават пачаў адчуваць пэўны недавер з боку свайго кіраўніцтва.

Як гаварылася вышэй, у адным офісе, з адным складам, бухгалтэрыяй і супрацоўнікамі браты зарэгістравалі тры фірмы. Гэта давала яшчэ большыя магчымасці для выртання падатку на дабаўленую вартасць. Варта нагадаць, што у 1999 годзе ў краіне быў прыняты новы парадак выртання падатку на дабаўленую вартасць. Дакладней кажучы, ад згаданага падатку вызваляліся ўсе экспартуемыя тавары — як уласныя, так і набытыя. Такім чынам дзяржава стымулявала экспарт тавараў. Некаторыя прадпрымальнікі, да ліку якіх адносяцца і нашы «героі», для вяртання гэтага самага падатку арганізоўваюць доўгія ланцугі падстаўных пасрэдніцкіх фірмаў-аднадзёнак, якія ствараюцца для правядзення літаральна некалькіх аперацый па перапродажы тавару на ўнутраным рынку. Праз 3-6 месяцаў эфектыўнай працы такія аднадзёнкі «знікаюць», паколькі з гэтым знікае і неабходнасць падрыхтоўкі квартальнай справаздачы.

Продажаў ад імя трох фірмаў «Дэсперада» не было. Для гэтага існавалі падстаўныя фірмы «першага звяна», якія быццам бы арандавалі частку склада ў «Дэсперада». Задача гэтых фірмаў — стварэнне «атмасферы» легальнай работы, выплаты падаткаў з самага мінімальнага прыбытку. За досыць празрыстым «першым звяном» ішло «другое», больш шэрае, якое непасрэдным чынам працавала з аднадзёнкамі.

— У наш час проста прыбытку некаторым асобам недастаткова, — кажа Ганна Ракевіч. — Многія імкнуцца зарабіць як мага больш, у тым ліку з дапамогай дзвюх самых распаўсюджаных схемаў — падманнага экспарту і экспарту шэрага тавару. Падманны экспарт — гэта калі тавар, які не збіраецца пакідаць межаў краіны, афармляецца як тавар, які ідзе на экспарт. Пасля чаго прадпрымальнікі падаюць у падатковыя органы заяву аб вяртанні падатку на дабаўленую вартасць... Другая схема — гэта экспарт тавару, за які ПДВ не выплачваецца ў прынцыпе, паколькі ён увезены кантрабандай або выраблены саматужным спосабам, у гаражах. У выпадку з Данейкамі мы мелі справу з атрыманнем бюджэтных сродкаў махлярскім шляхам...

Браты, зразумела, не хацелі «здавацца». Дзмітрый прызначаў «оперу» КДБ сустрэчу ў загароднай кавярні, дзе пасярэднік раскрыў «тэму сустрэчы». Напачатку апошні паспрабаваў астудзіць пыл чэкіста. Маўляў, у нас на вас ёсць кампрамат. Сабралі яго праваахоўныя органы і адзін дэпутат. Мы можам гэта абнародаваць, але... Паспрабуем дамовіцца па-добраму. «Мы маўчым, а вы спыняеце сваю дзейнасць... 30 тысяч долараў вас задаволяць?» — пацікавіўся пасярэднік Дзмітрыя. Чэкіст сказаў, што яму трэба падумаць. І залёг на дно, што было... складальнікам аператыўнай гульні. Неабходна было пераканацца ў сур'ёзнасці намераў прадпрымальных братоў даць хабар. Настойлівыя спробы знайсці «опера» па мабільніку пацвердзілі сур'ёзнасць намераў.

На сустрэчу прыязджаюць абодва браты і пасярэднік. Старэйшы, Артур, быў, дарэчы, супраць такога раскладу, аднак малодшы, відаць, здолеў пераканаць... Як толькі «опер» узяў у рукі перададзеныя яму для пачатку 10 тысяч долараў, тройка была затрымана з доказамі злачынства.

Крымінальную справу перадалі ў ваенную пракуратуру. Дзмітрыю далі 4 гады пазбаўлення волі па факце дачы хабару. А літаральна на наступны дзень пасля ўзбуджэння першай крымінальнай справы ўзбуджаецца яшчэ адна — «Крадзеж шляхам злоўжывання службовым становішчам у асабліва буйным памеры». У далейшым артыкул пераквалі фікуецца ў «Махлярства».

На допытах Артур і Дзмітрый кажуць, што абвінавачанні ў іх адрас — справа рук канкурэнтаў. Іх віны няма, нічога дрэннага яны не рабілі... На працягу 9 месяцаў, пакуль ішло следства, Дзмітрый катэгарычна адмаўляўся прызнаваць віну. Братам прапаноўвалася і магчымасць вярнуць грошы дзяржаве, што змякчыла б прысуд. Аднак Данейкі адкрыта выказалі свае падазрэнні следчаму, маўляў, вы нас і грошай хочаце пазбавіць, і свабоды. Артур адчайна патрабаваў гарантый, гаварыў, што іх спрабуюць загнаць у пастку.

Падчас расследавання наяўнасці звышпрыбыткаў былі знойдзены і прамыя доказы наяўнасці апошняй. На тых пасадах, якія займалі браты, заробак вагаецца ў межах 1,5-2 мільёнаў рублёў. Ці можна было за такія грошы купіць дзве кватэры і адбудаваць загародны катэджавы комплекс з сямі будынкаў на плошчы звыш 20 сотак? Уся гэта маёмасць была зарэгістравана, праўда, на сваякоў — цешчу, бацьку і маці, пенсіянераў, якія не здолелі падаць дэкларацыю аб даходах. Гэта і дало падставы суду расцаніць маёмасць як здабытую злачынным шляхам.

Паводле слоў **інспектара інспекцыі па падатках і зборах Першамайскага раёна г. Мінска Паўла АНДРЫЕЎСКАГА,** «з такімі буйнымі злачынствамі мы яшчэ не сутыкаліся, і іх досыць цяжка даказаць».

...Кожны з братоў атрымаў 8 гадоў калоніі з канфіскацыяй маёмасці, у тым ліку таго самага жылога комплексу з сямі будынін.

Святлана БАРЫСЕНКА.

У Бабруйску абакралі царкву

20 красавіка, на другі дзень Вялікадня, у міліцыю звярнуўся айцец Іаан, настаяцель Свята-Стрэчанскай праваслаўнай царквы на вуліцы Ульянаўскай у Бабруйску. Напярэдадні ўвечары царкву зачынілі, але раніцай убачылі, што пабіта аконнае шкло і зніклі срэбныя вырабы — крыжыкі, ланцугі і пярсцёнкі, усяго на суму 8 мільёнаў рублёў. Міліцыя шукае злодзея-бязбожніка.

Алена КАЗЛОВА.

«ЛЕВЫМ» ШЛЯХАМ

5377 кантрафактных DVD-дыскаў агульным коштам каля 70 мільёнаў рублёў выявілі супрацоўнікі дзяржбяспекі і міліцыі на гродзенскім рынку «Карона». «Левая» прадукцыя з запісамі розных фільмаў прадавалася ў пяці пунктах гэтага вельмі папулярнага сярод жыхароў і гасцей горада над Нёманам гандлёвага прадпрыемства. Кантрольных знакаў на частцы дыскаў нагогул не было, а на іншых былі ідэнтыфікацыйныя знакі ад... абутку.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ЗНІК СЯРОД БЕЛАГА ДНЯ

У краме «ТЭХНА», што ў Баранавічах, нехта ўкраў тэлевізар з вадкакрышталічным экранам. Тэлевізар стаяў на вітрыне, а затым знік, і ніхто напачатку не звярнуў на гэта ўвагі. А калі спахапіліся, то было позна — знік і тэлевізар, і злодзей.

ЗАЧЫНЯЙЦЕ ДЗВЕРЫ!

У Баранавічах на грамадзянак Расіі, якія здымалі кватэру па вул. Фралянкова, напалі невядомыя. Жанчыны забыліся зачыніць дзверы, і рабаўнікі свабодна зайшлі ў кватэру, звязалі іх і забралі сем з паловай тысяч расійскіх рублёў.

А пенсіянерка з Пінска таксама не зачыніла дзверы хлява пры сваёй хаце ў в. Маразовічы, і адтуль вывезлі торфабрыкет, металічную агароджу...

Калі ў першым выпадку рабаўнікоў шукаюць, то ў другім злодзеем быў мясцовы 22-гадовы жыхар.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ШУКАЙ ГРОШЫ Ў ПОЛІ

27-гадовы гамяльчанін нарэшце зразумеў, што яго абулі ў лапці. Хаця спачатку ён разлічваў на аўтамабільныя колы, зразумела, разам з машынай. Больш чым тры месяцы таму на рынку «Бакунінскі» ў Гомелі ён аддаў 10 тысяч долараў ЗША непрацуючаму грамадзяніну 1986 года нараджэння. Той паабяцаў прыгнаць з-за мяжы жалезнага каня. Дзе ён пасецца да гэтага часу, цяпер будзе высвятляць міліцыя.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ПАДПАЛЬШЧЫКІ ЧАВУСКАГА ЛЬНОЗАВОДА — ДЗЕЦІ

Міліцыя выявіла асобаў, якія падазраюцца ў падпале льнотрасты на Чавускім льнозаводзе: тры дзяўчынкі — вучаніцы 2, 3 і 4 класаў, і з імі 6-гадовы хлопчык з дзіцячага садка. Паводле папярэдніх звестак, дзеці на тэрыторыі завода забаўляліся з запалкамі: узялі невялікі жмут ільнотрасты, падпалілі і зрабілі вогнішча. Вецер стаў хутка разносіць полымя, малыя спужаліся і збеглі.

Нагадаем, што пажарам 19 красавіка на заводзе знішчана 75 тон ільнотрасты на суму каля 34 мільёнаў рублёў.

Алена КАЗЛОВА.

У суд Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак **ЛЕНТАЧА Уладзіміра Віктаравіча**, 24 лютага 1955 года нараджэння, ураджэнца г. Мінска, які пражываў па адрасе: Маладзечанскі раён, вёска Вазгелы, 6—3, апошняе вядомае месца працы — СПК імя Янкі Купалы, электрык. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра грамадзяніна У.В. Лентача, паведаміць іх суду Маладзечанскага раёна (г. Маладзечна, вул. Партызанская, 5 ці па тэл. 74 147, 71 581) на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

Погляд

ЛОШЫЦКУЮ СЯДЗІБУ РАЗБІРАЮЦЬ...

На жаль, гэта сапраўды так — Лошыцкую сядзібу пачалі разбіраць у рамках рэстаўрацыі. У мінулыя выхадныя у інтэрнэце з'явіліся першыя фотаздымкі сядзібы без даха, і такім чынам стала вядома, што спраўдзіліся самыя горшыя чаканні грамадскасці. Нагадаем, што ў канцы ліпеня мінулага года неабыякавыя да гісторыі мінчане нават арганізавалі досыць спантанны мітынг ля сядзібы ў Лошыцкім парку, каб прыцягнуць увагу да яе рэстаўрацыі.

Яшчэ летам спецыялісты (глядзіце нумар «Звязды» за 23 ліпеня 2008 года) не гублялі надзеі, што Лошыцкую сядзібу можна выратаваць. У іх планах было спачатку поўнасцю або часткова зняць тынкоўку і паглядзець, наколькі пашкоджаны драўляныя канструкцыі. Што ж убачылі спецыялісты-рэстаўратары і якое прынялі рашэнне, мы паспрабавалі высветліць у панядзелак у навуковага кіраўніка рэканструкцыі Лошыцкай сядзібы. Аднак Наталля Баранец з УП «Мінскпраект», якая цяпер з'яўляецца навуковым кіраўніком і адначасова галоўным архітэктарам праекта і як ніхто ведае гэты аб'ект, каментаваць што-небудзь адмовілася. Маўляў, перашкаджаеце спецыялістам працаваць і што не кожнаму чалавеку патрэбна ведаць падрабязнасці. Але мы з ёй не згадзіліся, бо рэстаўрацыя гісторыка-культурнай каштоўнасці — гэта не капітальны рамонт «хрушчоўкі», і ўсё ж такі навалі даведкі пра тое, што дзеецца цяпер у Лошыцы.

Спецыялісты, якія маюць непасрэднае дачыненне да рэстаўратарскіх і праектных прац на аб'екце (папрасілі не друкаваць іх прозвішчы), расказалі, што цяпер ідзе паступовы дэмантаж сядзібы. Будынак знаходзіцца ў аварыйным стане, а дрэва настолькі спарахнела, што месцамі ў яго можа тыцкаць нават пальцам. Разбор канструкцый праводзіцца паступова, і нават нельга прадбачыць, калі завершыцца. Напрыклад, разбіраюць у адным месцы, а пачынае валіцца ўвесь будынак. Кожны тыдзень усе зацікаўленыя спецыялісты збіраюцца на планёрку, дзе абмяркоўваецца зробленае і вырашаецца, як дзейнічаць далей. Нас запэўнілі, што сядзіба не бяздумна «ідзе пад сякеру», а што тыя элементы, якія можна захаваць, адпраўляюць на рэстаўрацыю і потым вернуць у «новую» сядзібу. Яна будзе адбудаваная з новых матэрыялаў, але ідэнтычных старым. Пакуль вядома, што «роднымі» ў сядзібе застануцца коміны, фрагменты сценаў і падлогі і, магчыма, некаторыя дзверы.

Дарэчы, да лістапада 2008 года навуковым кіраўніком па Лошыцкай сядзібе была Галіна Левіна, якая потым ад гэтага кіраўніцтва адмовілася, бо не была згодная з тым, як вядуцца працы на аб'екце. Яна лічыць, што трэба прыкласці як мага болей намаганняў, каб захаваць сядзібу па-максімуму:

— Безумоўна, у драўлянага будынка ёсць праблемныя месцы, і трэба рабіць даследаванні па кожным квадратным метры, калі трэба — выразаць, замяняць. Для гэта існуюць методыкі, сусветная і еўрапейская практыкі. Мне заўсёды здавалася, што мы павінны прыкласці ўсе намаганні, а можа і звышнамаганні для таго, каб захаваць. Аднавіць як было — таксама важна, але сэнс у тым, што ёсць невыказныя пачуцці, калі ты знаходзішся ў сапраўдным, ідзеш па прыступках, па якіх хадзіў Дунін-Марцінкевіч... Можна аднавіць, і гэта будзе прыгожа, я не сумняваюся, што майстры зробяць добра, але надта высокі кошт той няшчырасці, якую мы пакідаем. Як прафесіянал я разумею, што калі нейкую частку немагчыма захаваць, яе трэба замяніць, каб там грыбок не пайшоў далей... Але калі ёсць хоць адзін шанц на захаванне, яго трэба выкарыстоўваць. І я лічу, што такі шанц быў.

Галіна Леанідаўна і цяпер працуе ў Лошыцы — яна з'яўляецца навуковым кіраўніком па астатнія аб'ектах сядзібна-паркавага комплексу. І яна расказала пра іх далейшы лёс. Так, у дому вартаўніка будуць прадаваць сувеніры і квіткі ў музей, які размесціцца ў будынку сядзібы. Капліцу чакае кансервацыя (на 1-м этапе), а таксама прадугледжана аднаўленне першапачатковага выгляду (на 2-м этапе). Зараз рэшткі капліцы праходзяць комплекснае навуковае даследаванне. Што датычыцца далёкага млына, то ён будзе адназначна закансерваваны. Комплекс броавара цяпер знаходзіцца ў вельмі цяжкім аварыйным стане, ідуць даследаванні і абмеры, якія праводзяць спецыялісты «Праектрэстаўрацыі». У планах зрабіць там кавярню з міні-пякарняй (у так званым «малым млыне»), гатэль (у вялікім будынку каля сажалкі) і міні-піваварню-музей з рэстарацыяй (доўгі будынак па вуліцы Чыжэўскіх, 17). Заказчык рэканструкцыі комплексу броавара — бізнэс-цэнтр «Сталіца».

Нагадаем, што актыўныя працы на Лошыцкай сядзібе пачаліся ў жніўні 2008 года, а скончыцца павінны да канца гэтага года. У адноўленай сядзібе будзе музей, для якога ўжо цяпер вядзецца пошук экспанатаў. Заказчыкам рэстаўрацыі сядзібы выступае КУП «Упраўленне капітальнага будаўніцтва Мінгарвыканкама», праект рэстаўрацыі быў распрацаваны УП «Мінскпраект», а генеральным падрадчыкам з'яўляецца ЗАТ «НВА Эльвіра».

Павел БЕРАСНЕЎ.

г. ВИТЕБСК 30.04.2009

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

по продаже объектов государственной собственности с одновременной продажей права заключения договоров аренды земельных участков

№ лота	Наименование предмета аукциона	Характеристика предмета аукциона	Начальная цена, руб.	Сумма задатка, руб.
Место нахождения объектов: Витебская область, г. Барань, ул. Набережная, 1				
ЦЕНА СНИЖЕНА НА 20 %				
5.	Капитальное строение (здание лесопильного цеха) инв. № 240/С-21774 с асфальтобетонной площадкой и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объектов недвижимости: одноэтажное кирпичное здание, перекрытия металлические фермы, ж/б плиты, крыша шиферная, объем 5811 куб. м, общая площадь 1061,39 кв. м; Асфальтобетонная площадка 1460 кв. м. Земельный участок: площадью 0,2311 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 242450200002000356, срок аренды земельного участка — 20 лет, ограничения в использовании земельного участка в водоохранной зоне водного объекта вне прибрежной полосы реки Адров.	**224307940**	**22430794**
6.	Капитальное строение (здание склада ОКС) инв. № 240/С-21876 и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: одноэтажное кирпичное здание, перекрытия железобетонные, крыша рулонная, объем 2398,46 куб. м, общая площадь 427,87 кв. м. Земельный участок: площадью 0,1037 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 242450200002000352, срок аренды земельного участка — 20 лет, ограничения в использовании земельного участка в водоохранной зоне водного объекта вне прибрежной полосы реки Адров.	**92498696**	**9249869**
7.	Капитальное строение (здание склада металлов) инв. № 240/С-21877 и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: трехэтажное кирпичное здание, перекрытия железобетонные плиты, крыша совмещенная рулонная, объем 2089,13 куб. м, общая площадь 536,27 кв. м. Земельный участок: площадью 0,0701 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 242450200002000353, срок аренды земельного участка — 20 лет, ограничения в использовании земельного участка в водоохранной зоне водного объекта вне прибрежной полосы реки Адров.	**89421204**	**8942120**
8.	Капитальное строение (здание молокоприемного пункта) инв. № 240/С-21879 с асфальтобетонным покрытием и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объектов недвижимости: двухэтажное кирпичное здание, перекрытия железобетонные плиты, крыша рулонная, жесть, объем 838,86 куб. м, общая площадь 171,22 кв. м; Асфальтобетонное покрытие 607 кв. м. Земельный участок: площадью 0,1699 га для обслуживания здания общественного назначения (объекты торговли и оказания услуг), кадастровый номер 242450200002000354, срок аренды земельного участка — 20 лет, ограничения в использовании земельного участка в водоохранной зоне водного объекта вне прибрежной полосы реки Адров.	**87681892**	**8768189**
9.	Капитальное строение (здание склада материалов СПХ) с инвентарным номером 240/С-21773 и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: одноэтажное кирпичное здание, перекрытия железобетонные, крыша рулонная, жесть, объем 8383,39 куб. м., общая площадь 989,20 кв. м. Земельный участок: площадью 0,2956 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 242450200002000355, срок аренды земельного участка — 20 лет, ограничения в использовании земельного участка в водоохранной зоне водного объекта вне прибрежной полосы реки Адров.	**226484490**	**22648449**
С УСТАНОВЛЕНИЕМ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ РАВНОЙ ОДНОЙ БАЗОВОЙ ВЕЛИЧИНЕ				
10.	Не завершенное строительством не законсервированное капитальное строение – станция очистки сточных вод и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта: дата начала строительства: 10.1986; площадь застройки: 1458 кв. м, общая площадь – 3 164,75 кв. м, общая степень готовности: 59,95 %; в т.ч. фундаменты — 100 %, стены – 85 %, перекрытия – 95 %, кровля — 90 %, полы — 20 %, проемы — 20 %. Земельный участок с кадастровым номером 242450200002000451, площадью 0,4766 га, срок аренды 50 лет. Использование земельного участка для обслуживания здания производственно-складского назначения. Ограничения в пользовании земельным участком в связи с его расположением в водоохранной зоне вне прибрежной полосы реки Адров и в охранной зоне линий электропередачи напряжением свыше 1000 В.	**12378280**	**1237828**

ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. Правды, 38, контактный телефон-факс в г. Витебск: (0212) 476096, сайты: www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, E-mail:votfondgi@tut.by.

1. Аукцион состоится 30 апреля 2009 г. в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 38.

2. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00, последний день приема документов 29.04.2009 до 17.00 по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 38, кабинет 308. Заключительная регистрация участников 30.04.2009 с 14.00 до 14.45. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

3. Сумма задатка перечисляется на расчетный счет № 3642903000021, в филиале ОАО «БПС-Банк» по Витебской области г. Витебск, код 150801307. Получатель — фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

4. **Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан:** подписать протокол аукциона; не позднее 10 дней со дня принятия решения исполнительным комитетом о предоставлении земельного участка, внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить расходы, связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка; не позднее 12 дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

5. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи.

6. **Подробная информация об объектах продажи и условиях участия в аукционе опубликована ранее в газете «Рэспубліка» за 26.04.2008 № 80 (4503) и за 28.10.2008 № 202 (4625).**

г. ВИТЕБСК 27.05.2009

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

по продаже объектов государственной собственности с одновременной продажей права заключения договора аренды земельного участка

№ лота	Наименование предмета аукциона	Характеристика предмета аукциона	Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей	Сумма задатка, рублей
1.	**Капитальное строение с инв. № 240/С-28970 (здание ремонтной мастерской) с забором, тремя покрытиями площадок и капитальное строение с инв. № 240/С-27127 (сооружение специализированное энергетики), расположенные по адресу: Витебская область, Оршанский район, дер. Юрцево, и право заключения договора аренды земельного участка.**	Характеристика объекта недвижимости: здание ремонтной мастерской — одноэтажное, стены — металлические панели, общая площадь 657 кв.м, 1996 г. постройки, крыша — металлические панели, полы бетонные, электроосвещение — открытая проводка; забор дощатый решетчатый, ж/б столбы, площадью — 918 кв.м; покрытие площадки — черное щебенчатое для хранения навесного дорожно-строительного оборудования — 150 кв.м; покрытие площадки — черное щебеночное для стоянки дорожно-строительной техники — 2665 кв.м; покрытие площадки — черное щебеночное — подъезда к площадке для стоянки техники — 290 кв.м; воздушная линия электропередач на железобетонных опорах – 0,4 В, протяженность – 667,98 м. Земельный участок с кадастровым номером 223684408101000119, площадью 1,2518 га для размещения объектов производственного назначения, сроком аренды 50 лет. Ограничения: расположение участка в водоохранной зоне вне прибрежной полосы реки Скупья и охранной зоне тепловой сети. Назначение: для производственного назначения (склад, либо здание для ремонта и обслуживания автотранспорта).	**285532764**	**28553276**

ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. Правды, 38, контактный телефон-факс в Витебске: (0212) 47-60-96, сайт www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, E-mail:votfondgi@tut.by.

ПРОДАВЕЦ ОБЪЕКТА НЕДВИЖИМОСТИ: Республиканское унитарное предприятие «Белавтострада», контактные телефоны: (017) 216-93-41, 216-93-42;

АРЕНДОДАТЕЛЬ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА: Оршанский районный исполнительный комитет.

Условия пользования земельным участком:

- заключение победителем аукциона с райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок, после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка, государственной регистрации права на земельный участок;

- получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки проекта на строительство (реконструкцию) объекта в срок, не превышающий двух лет;

- осуществление строительства (реконструкции) объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

1. Аукцион состоится 27 мая 2009 г. в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 38.

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы. Участнику необходимо подать заявление и подписать Соглашение установленной формы с фондом «Витебскоблимущество».

Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также представляются: юридическими лицами (резиденты РБ) — доверенность, выданная представителю юридического лица, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, заверенные нотариально; индивидуальными предпринимателями — нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации; юридическими лицами (нерезиденты РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский (русский) язык; представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов на участие в аукционе уполномоченные лица предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00, последний день приема документов 26.05.2009 г. до 17.00 по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 38, кабинет 308. Заключительная регистрация участников 27.05.2009 с 14.00 до 14.45. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

2. Сумма задатка перечисляется на расчетный счет № 3642903000021, в филиале ОАО «БПС-Банк» по Витебской области г. Витебск, код 150801307. Получатель — фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

3. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Победитель аукциона — участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

4. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

5. Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; не позднее 10 дней со дня принятия решения райисполкомом о предоставлении земельного участка, внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка; не позднее 12 дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

6. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

БЛІЦКОНКУРСЫ

4 сакавіка мы прапанавалі выправіць канструкцыю, бо ў ёй напрыканцы гульні не патрэбна простая белых а3. Былы следчы пракуратуры Віктар Талкачоў, які цяпер жыве і працуе кінамеханікам у вёсцы Уздзевічы Клімавіцкага раёна, прадставіў такую версію ў якасці **бліца-45/2**:



Белыя: a1, d2, f2, f6, g7 (5). **Чорныя**: a3, c5, c7, d4, e5, h2, h8 (7). Выйгрыш.

Даслаў сваю варыяцыю і навуковы супрацоўнік Іван Астроўскі (Мінск):

Белыя: a1, a5, c1, f6, g7 (5). **Чорныя**: b4, c3, c5, c7, d4, e5, h8 (7). Тут, на жаль, лішняй застаецца белая дамка: 1. ab2 2. a:c3 3. f:d8 4. d:g5/h4x.

А ў рамках бліца-46/2 разгадайце галаваломку на 100-клетачнай дошцы токара-ўніверсала магілёўскага завода «Тэхнапрылада» Дзмітрыя Камчыцкага:



Белыя: 10, 14, 41, 42, 49, 50 (6). **Чорныя**: 34, 36, 39, 40, 45 (5). Перамога белых.

Ідэя праходзіць і ў больш практычным выходным становішчы:

Белыя: 10, 11, 14, 23, 33, 50 (6). **Чорныя**: 12, 19, 22, 32, 40, 45 (6).

1. 11-7 19:39 2. 7:38 і далей, як у бліцы-46/2.

Тэрмін для адказаў звычайны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: **220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі»**.

ЧЭМПІЯНАТ КРАІНЫ

Завяршыўся чэмпіянат краіны па міжнародных шашках сярод жанчын. Чэмпіёнкай стала майстар Вольга Федаровіч. Яна набрала 15 ачкоў з 20 магчымых. Сярэбраны медаль уручаны міжнароднаму гросмайстру Ірыне Пашкевіч (14), бронзавы — майстру Дар'і Федаровіч (13). Чацвёртае-пятае месцы занялі майстар Наталля Герасімовіч і міжнародны майстар Вольга Садоўская. Гэтая пяцёрка засталася ў вышэйшай лізе і на будучы год.

Паведаміў карэспандэнт нашай рубрыкі «Шашкі» Вільям Астрынскі — экс-чэмпіён Беларусі па рускіх шашках, кандыдат у майстры спорту па іх.

РАШАЕМ, ПЕРАМАГАЕМ

На заданні аўтарскіх конкурсаў 6/7-15 і 7/1-3, бліцаў-42/6, 43/1-6 і 44/1-2 правільныя адказы даслалі: па электроннай пошце — І. Ананіч (Гродна), Э. Акер (Галандыя), А. Гімбутас (Літва), А. Маісееў (ЗША) і У. Рычка (Украіна), на лістках у канвертах і паштоўках — Аляксандра Камінская і А. Рогач (Вілейка), В. Голас (Любань), У. Бандарык (в. Лугавая Слабада Мінскага раёна), С. Нячаеў (Баранавічы), А. Шургін (Клімавічы), В. Ціханенка (Гомель), І. Мацкевіч (Жодзіна), М. Трухан (в. М. Пагост Салігорскага раёна), А. Нікіфараў, Вольга і Юлія Шакун (Мінск), Б. Завадскі (Брэст), Марыя Лічко, Дар'я Малашка, Аляксандра Рудкоўская, Р. Аль-Карані, А. Жур, Я. Казлоў, А. і А. Яраховічы і А. Кіслы (Уздзенскі раён), І. Козел (в. Махнавічы Мазырскага раёна), К. Козел (в. Ласосна Гродзенскага раёна), М. Саўкін (п/а Суднікі Валожынскага раёна), К. Барэль (Свіслач), П. Шклудаў (Наваполацк), І. Астроўскі, В. Талкачоў і інш.

Сярод іх у аўтарскім-6 В. Шульгі заўважылі іншыя развязкі: П. Шклудаў — 1. d6x у заданні № 2; А. Белы (Наваполацк) і П. Шклудаў — 2. dc5x у № 10; У. Сапяжынскі (Рагачоў) і Д. Камчыцкі — 6. d:a5x у № 11; А. Янчук (Камянец), А. Белы, Д. Камчыцкі, У. Сапяжынскі і П. Шклудаў — 3. cd8x і 1. gh8x ў № 12. Заданне ж № 1 не мае пабочнага рашэння. Такім чынам, яны зарабілі дадатковыя ачкі і перамаглі ў конкурсе: Пётр Шклудаў (18 ачкоў), Аляксандр Белы, Дзмітрый Камчыцкі, Уладзімір Сапяжынскі (па 17) і Аляксандр Янчук (16,5). Іх чакаюць узнагароды.

Лаўрэаты конкурсу пацвердзілі сваё высокае званне першакласных рашальнікаў, а астатнія вышэй пералічаныя ўдзельнікі выканалі норму другога спартыўнага разраду па шашках, якая склала 15 ачкоў. Гэта публікацыя з'яўляецца падставай для прысваення звяздоўскім канкурсантам адпаведных разрадаў.

Мы вельмі ўдзячныя чытачам за актыўны ўдзел у конкурсе, а майстру ФМЖД Віктару Шульгу (Мінск) — за прызы і змястоўныя заданні.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (18 красавіка). Па гарызанталі: Далікатэс. Лаванда. Раска. Жлобін. Омметр. Ушакоў. Салетра. Камар. Кобза. Указ. Эскарп. Неўскі. Патака. Тур. Бук. Капыл. Арбіта. Кон. Нут. Смык. Цана. Сказ. Адкат. Увал. Ралі. Рэал. Суворaў. **Па вертыкалі:** Распэ. Адрас. Жулік. Арабіна. Тор. Кутузаў. Каламбур. Пракат. Ішак. Кура. Таверна. Авал. Куб. Метал. Сінус. Ліс. Коўка. Кок. Анатам. Цела. «Муму». Акустыка. Тура. Кулон. Заір. Нахімаў.

Любую матулю, жонку, бабулю, цешчу **Таццяну Міхайлаўну РЫЖЫКАВУ** з Мінска шчыра віншуем **з 55-годдзем**!

Зычым моцнага здароўя, цудоўнага настрою, сонечных ранкаў і зорных начэй, бязмежнага аптымізму, сямейнага дабрабыту. Заставайся заўсёды такой жа жыццярадаснай, цудоўнай і прыгожай жанчынай, бадзёрай і добрай да людзей, жыві ў павазе, радасці і з добрай надзеяй. Усё, што ад Бога ёсць цудоўнага на зямлі, мы шчыра жадаем табе!

Што яшчэ пажадаць? *Дабра і спакою, і доўгага веку.*
Няхай табе сонца смяецца, *Няхай абмінаюць бяда і трывога,*
Няхай табе ўсё ўдаецца. *Ды стомы не чуй*
Жадаем жа шчасця, *ад жыццёвай дарогі.*
здароўя без лекаў, **Родныя.**

«Ахавай, Госпадзі!»

Сіла слова

«З задавальненнем чытаю рубрыку «Сіла слова». Магчыма, Аляксей Ненадавец ведае, як нашы продкі баранілі сваю хату, сваю сядзібу ад крадзяжу, ад дрэннага чалавека. Калі ласка, змясціце гэтую інфармацыю на старонках вашай газеты».

З павагай Наталля БЯЛКА, *г. Бабруйск.*

Так павялося з даўніх часоў, што нашы продкі заўсёды імкнуліся аберагчы сябе, сваіх родных і, адпаведна, нажытае імі дабро ад усялякага непажаданага ўздзеяння на іх прыродных стыхій ці ліхіх, зайздросных нядобразычліўцаў. Нічога не зробіш — былі тыя, хто нажываў усё сумленна, выжыльваючыся на працы, а былі і такія, хто не хацеў працаваць і марыў узбагаціцца за кошт першых. Таму і ўзніклі так званыя засцерагальныя, ці «аберагальныя», замовы. Іх, у абавязковым парадку, ведалі кожны гаспадар і гаспадыня, бо свята верылі ў вялікую сілу магічных слоў. Падкрэслім і тое, што апошнім часам узрастае цікавасць да такога кшталту замоў сярод параўнальна маладога насельніцтва. Давялося зафіксаваць і яшчэ адну акалічнасць: самі інфарматары перасталі асабліва афішаваць замовы. Гэта сведчыць пра тое, што традыцыя вяртаецца і людзі зноў пачынаюць засцерагаць сваё дабро, кватэру, усё нажытае, пры дапамозе не толькі моцных замкоў, сігналізацыі, але і ...замоў.

«Зара зару занімаець, свету-сонца жадаець, Прасвятая маць Багародзіца ангелаў ажыдаець. Ангелы мае, храніцелі мае, захавайце хату раба Божага (імя), усё, што ў ёй пакладзена, усё, што ў ёй закладзена, ад зладзейскае сілы, ад трыдзевяці ліхіх калдуноў, ад трыдзевяці чорных ведуноў і ведуніх, ад калдуна і калдуніхі, ад зладзея і зладзяіхі, ад уражэскае сілы, ад чорнае сілы, ад нездаровае сілы. Аградзі яго, Госпадзі, каменнаю сцяною і накрый яго, Госпадзі, гарачаю скаварадою, падмасці яму, Госпадзі, жалезнаю даскою. Тады ў хату раба Божага (імя) зладзей пралезець, як гарачую скавараду сваім языком праліжаць, жалезную даску ілбом праламаець.

На гарэ Сіяньскай стаіць золат-цэркаў, у той золат-цэркві прэстолы дарагія стаяць, ютранні там спяваюць, службы савяршаюць. Сам святы Міхайла на прастолі стаіць, відзіць ён нас, праведнікаў і ябеднікаў, і ведзьмакоў, і зладзеюкоў, і зладзеючых; і разбіваець усіх зладзеяў, усіх наганіцеляў на хату раба Божага (імя) вялікаю грамою, пякучаю маланнёю, калянаю стралою, багатырскім канём, булатным нажом. Асвяці, Госпадзі, сію ваду, на якую я шапчу, ва ўсялякім часе і ва ўсялякай гадзіне. Амінь» (шаптаць тройчы на ваду, а пасля гэтай вадой апырскаць хату з сярэдзіны і з вуліцы, старацца рабіць так, каб ніхто гэтага не бачыў). ***(«Замова на засцеражэнне хаты ад зладзеяў»,*** *Ганцавіцкі раён).*

Другі прыклад, які прыводзіцца ніжэй, характэрны тым, што замова больш «вузкая» па сваім змесце і выкарыстоўвалася адно толькі ад зладзеяў, не падкрэсліваючы нейкага зберажэння самой хаціны. Затое ўжо ліхім людзям тут жадалася такое, чаго мог спалохацца і збаяцца нават самы адчайны.

«На сінім моры, на акіяне, на востраве старым Буяне стаіць жалезны сундук, а ў тым моцным сундуку ляжаць вялікія нажы булатныя. — Падзіце ж вы, нажы, да такога-та і такога-та зладзея, рубіцесячыце яго цела, паліце яго чорнае сэрца, што б ён, злодзей-зладзяюка, вараціў украдзенае ў (імя), штобы нічога не схаваў, не прадаў, а ўсё чыста назад вярнуў і гаспадару (імя) аддаў. Будзь ты, злодзей, закляты і праклятый маёй моцнай замовай у зямлю прэісподнюю, у смалу кіпучую, у залу гаручую, у балоты гнілыя і на лясы цямныя; будзь ты, злодзей, прыбіты ў прыпаталкі асінавым калом, лазовым дручком, іссушан сонцам, ветрам і марозам; каб жа ты, злодзей, акрывеў, ахрамеў, ашалеў, абязручаў і абязножаў, аташчаў і не здолеў хадзіць, а валяўся ў гразі, з людзьмі не спаткайся і не сваёй смерцю памры! Амінь!» ***(«Замова ад зладзеяў»,*** *Веткаўскі раён).*

Аляксей НЕНАДАВЕЦ.

Спорт

Магілёў і Бабруйск гатовы прыняць чэмпіянат Еўропы

У 2010 годзе ў Беларусі пройдзе фінальны турнір юніёрскага чэмпіянату Еўропы па валейболе сярод мужчынскіх каманд. У Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу адбылося пасяджэнне арганізацыйнага камітэта гэтых спаборніцтваў, якія прымуць Магілёў і Бабруйск.

«Рашэнне аддаць Беларусі гэты турнір было прынята два гады таму, і сёння магу толькі пацвердзіць, што мы паступілі правільна. Чэмпіянат можна праводзіць сёння — вашы гарады гатовы», — заявіў віцэ-прэзідэнт Еўрапейскай канфедэрацыі валейбола Ян Хронек, які наведвае нашу краіну ў гэтыя дні. Замежны госць выказаў меркаванне, што выступленне лепшых еўрапейскіх каманд стане выдатнай прапагандай гэтага віду спорту. «Я бачу, што ў вашай краіне добра развіваюцца баскетбол і гандбол, а па хакеі вы ўвогуле прэтэндуеце на чэмпіянат свету. Мяркую, што гэтыя спаборніцтвы абудзяць у моладзі цікавасць да валейбола».

Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, старшыня Беларускай федэрацыі валейбола Барыс Батура заўважыў, што чэмпіянат Еўропы ў нашай краіне — гэта не толькі папулярызацыя валейбола, але і прапаганда нашай краіны ў еўрапейскай супольнасці. Ён адзначыў, што ў найбліжэйшыя гады выдатная база для валейбола будзе створана і ў сталіцы. «Яна будзе і на Мінск-арэне. Акрамя таго, мы працуем над тым, каб пабудаваць у сталіцы асобны цэнтр для развіцця валейбола», — падкрэсліў Барыс Батура. Старшыня федэрацыі валейбола растлумачыў, што калі падавалася беларуская заяўка на гэты турнір, у Магілёве быў выдатны спартыўны комплекс «Алімпіец», а ў Бабруйску — 7-тысячная Бабруйск-арэна, менавіта таму для першынства Еўропы былі абраныя гэтыя гарады Магілёўскай вобласці. «Каб развіваўся валейбол, спаборніцтвы павінны прымаць не толькі сталіца, але і рэгіёны. Мяркую, што Магілёўская вобласць з гэтым справіцца», — заявіў Барыс Батура.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Запрашальнік

А ДЗЕ Ж ТЫЯ ДУДАРЫ?

Аматары беларускіх традыцый і беларускай музыкі, напэўна, звернуць увагу на даты — 24, 27 і 28 красавіка. Бо ў гэтыя дні ў Беларусі адбудзецца 8-мы па ліку Міжнародны фестываль дударскай музыкі «Дударскі фэст». Гэта адзінае мерапрыемства такога кшталту ва ўсёй Усходняй Еўропе ладзіцца з 1992 года, а з 2006 — адбываецца штогод. І кожны раз, безумоўна, мае свае асаблівасці і сюрпрызы.

Сёлета такіх адметнасцяў, паводле словаў прадзюсара фэсту Зміцера Сасноўскага, адразу некалькі. Так, у праграме з'явіўся гурт «Litvintroll», які прынцыпова спалучае ў сваіх выступленнях традыцыйныя беларускія інструменты і стылістыку рок-музыкі. Гурт, дарэчы, возьме ўдзел у канцэрце-адкрыцці фестывалю 24 красавіка ў сталічным клубе «Рэактар». Таксама ў канцэрце возьмуць удзел «Стары Ольса», «Testamentum Terrae», «Расалія», Esprit, «Келіх кола», «Гістрыён», Дзяніс Сухі і гурт «Дзевясіл», Тодар Кашкурэвіч). Эстрадны гурт «Esprit», які не саромеецца называцца нават «папсой», між іншым, спецыяльна для фэсту запісаў тры песні з выкарыстаннем валынкі.

Акрамя таго, упершыню апошні дзень фэсту адбудзецца на адкрытай пляцоўцы — 28 красавіка ў музейным комплексе «Дудуткі» з 13 да 18 гадзін будзе доўжыцца вялікая праграма з выступленнямі музычных калектываў, кірмашом сярэднявечных рамёстваў, традыцыйнай нацыянальнай кухняй і напоямі. «Выступленне на адкрытым паветры — гэта яшчэ і своеасаблівы іспыт для музыкаў, якія цягам 3 гадзін павінны граць практычна без перапынкаў, пацвярджаючы, што іх інструмент сапраўды строіць», — расказаў Зміцер Сасноўскі. 5 айчынных турфірмаў падтрымалі ідэю опэн-эйр і арганізуюць дастаўку наведвальнікаў на мерапрыемства.

Традыцыйна на фэст запрошаны замежныя госці, прычым штогод розныя: на адкрыцці сыграе «Kapela ziele» з Польшчы і, магчыма, музыкант з Балгарыі, на закрыцці — музыкант з Даніі Рунэ выступіць сумесна з беларускім гуртом «Келіх кола».

Яшчэ адна абавязковая частка дударскага фэсту, цікавая і больш важная не для гледачоў, а для саміх удзельнікаў — навуковая канферэнцыя «Захаванне дударскай традыцыі ў Беларусі і ў Балтыйскім рэгіёне Еўропы». Некалькі гадоў запар яна ладзіцца на хутары найстарэйшага беларускага майстра-дудара Алеся Лася ў Валожынскім раёне. Сёлета 27 красавіка таксама выканаўцы і майстры з розных гарадоў — Гродна, Оршы, Маладзечна, Браслава, Івянца, Лепеля ды іншых — збяруцца на канферэнцыі, каб абмяняцца досведам, тэхнічнымі дэталямі і сакрэтамі ў вырабе, доглядзе і самім працэсе ігры на дудах.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота з сайту фестывалю www.dudar.info.

Zepter Bank

ЗАО «ЦЕПТЕР БАНК»
Адрес: 220034, ул. Платонова, 1Б, г. Минск
эл. адрес: info@zepterbank.by.
Тел. 331 89 49, факс 331 89 48

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2009 г.

в миллионах белорусских рублей

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.04.2009	01.04.2008
1	2	3	4	5
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	554,7	—
3	Средства в Национальном банке	1102	255,6	—
4	Ценные бумаги:	1103	28 536,9	—
	для торговли	11031	—	—
	удерживаемые до погашения	11032	(-142,0)	—
	в наличии для продажи	11033	28 678,9	—
5	Кредиты и другие средства в банках	1105	21 429,2	—
6	Кредиты клиентам	1106	3 834,2	—
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107	—	—
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	884,9	—
9	Прочие активы	1109	422,3	—
10	ИТОГО активы	110	55 917,8	—
11	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
12	Средства Национального банка	1202	—	—
13	Кредиты и другие средства банков	1205	—	—
14	Средства клиентов	1206	10 865,1	—
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208	—	—
16	Прочие обязательства	1209	1 102,8	—
17	ВСЕГО обязательства	120	11 967,9	—
18	**КАПИТАЛ**			
19	Уставный фонд	1211	36 000,0	—
20	Эмиссионный доход	1212	—	—
21	Резервный фонд	1213	131,8	—
22	Накопленная прибыль	1214	7 818,1	—
23	Фонд переоценки статей баланса	1215	—	—
24	ВСЕГО капитал	121	43 949,9	—
25	ИТОГО обязательства и капитал	12	55 917,8	—
26	**ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ**			
27	Требования	1301	—	—
28	Обязательства	1302	850,5	—

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2009 г.

в миллионах белорусских рублей

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.04.2009	01.04.2008
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	420,3	—
2	Процентные расходы	2012	18,6	—
3	Чистые процентные доходы	201	401,7	—
4	Комиссионные доходы	2021	8,6	—
5	Комиссионные расходы	2022	3,1	—
6	Чистые комиссионные доходы	202	5,5	—
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203	10 414,8	—
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	(-7,9)	—
9	Доход в форме дивидендов	205	—	—
10	Чистые отчисления в резервы	206	189,0	—
11	Прочие доходы	207	—	—
12	Операционные расходы	208	1 097,5	—
13	Прочие расходы	209	24,8	—
14	Налог на прибыль	210	2 412,4	—
15	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	7 090,4	—

Председатель Правления **Дворников Игорь Андреевич**

Главный бухгалтер **Нестерова Галина Чеславовна**

Лицензия Национального банка Республики Беларусь от 13 ноября 2008 года № 31 на осуществление банковской деятельности. УНП 807000214 БИК 153001820

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.53	20.24	14.31
Віцебск —	5.39	20.17	14.38
Магілёў —	5.43	20.14	14.31
Гомель —	5.44	20.07	14.23
Брэст —	6.09	20.39	14.30
Гродна —	6.13	20.35	14.22

Месяц

Апошняя квадра.
Месяц у сузор'і Авена.

Імяніны

Пр. *Вадзіма.*
К. *Настассі, Яўгеніі, Лукаша, Лявона, Фелікса.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАДВОР'Е на заўтра



Дзве даты

22 красавіка

1826 год — нарадзіўся Ясафат Пятровіч Агрызка, удзельнік рэвалюцыйна-вызваленчага руху, выдавец і журналіст. Пасля заканчэння Мінскай гімназіі вучыўся ў Пецярбургскім універсітэце, працаваў у Міністэрстве фінансаў. У Пецярбургу заснаваў друкарню, выдаваў газету «Слова», перавыдаў зборнік старажытных законаў Польшчы, Беларусі, Літвы, Украіны, выдаў першы зборнік твораў М. Дабралюбава. У 1863 годзе назначаны галоўным прадстаўніком варшаўскага паўстанцкага камітэта ў Пецярбургу. У 1864 годзе арыштаваны і асуджаны да 20 гадоў катаргі.

1784 год — у нясвіжскім тэатры Радзівілаў пастаўлена камічная опера «Агатка ці Прыезд пана» (кампазітар Ян Голанд, аўтар лібрэта Мацей Радзівіл), першы вядомы арыгінальны музычна-сцэнічны твор, які быў напісаны і пастаўлены ў Беларусі. Створаны спецыяльна да прыезду ў Нясвіж караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага.

Цытата дня:

«Задача мастацтва — працірацъ нам вочы».
Карл Краўс (1874—1936), аўстрыйскі пісьменнік.

ПАДКОВА

«Знайсці старое жалеза, асабліва падкову, — знайсці сваё шчасце»

Паўсюдна сярод усходніх славян існуе вера ў незвычайныя ўласцівасці конскай падковы. Па павер'ях нашых продкаў, падкова сімвалізавала шчасце і поспех, уяўляючы сабою магутны абярэг ад дрэннага вока і нячыстай сілы. Абавязковая ўмова — падкову трэба знайсці на дарозе.

Такое прыхільнае стаўленне да падковы магло быць выкліканa тым, што яе форма нагадвае арку. У кожнай хаце ў чырвоным куце быў ручнік, які пакрываў абраз — ён нагадваў сабою арку.

● Пад аркай-ручніком праходзілі маладыя, калі выходзілі з хаты і ехалі да вянца ў храм.

● У шэрагу вялікіх гадавых святаў абавязковым атрыбутам была арка. На Сёмуху маладзіцы завівалі галінкі бярозы — рабілі арку, праз якую трэба было прайсці сяброўкам, узяўшыся за рукі — пакуміцца, г.зн. пасябраваць. На жніво з каласоў саспелай пшаніцы плялі касу-арку, якой упрыгожвалі дзверы хат.

● Можа быць, менавіта таму падкова, прыбітая ў хаце над парогам, сімвалізавала не што іншае, як арку, пад якой «пасялялася» шчасце (славяне вешалі падкову «ражкамі» ўніз, у адрозненне ад англійскай традыцыі вешаць падкову «ражкамі» ўверх).

● Яшчэ адна з прычын, чаму падкова стала знакам шчасця і ўдачы, была ў тым, што ў ранейшыя часы багатыя людзі падковы сваім любімым рысакам рабілі не толькі з жалеза, але і са срэбра, а бывала, і з золата. Здаралася, што даволі дарагія падковы губляліся. А той, хто знаходзіў такую падкову, раптоўна станавіўся багатым чалавекам.

● Падкову надзялялі ўласцівасцямі ахоўнага характару. Лічылася, што ў хату, над парогам якой вісіць падкова, ніколі не трапіць нячыстая сіла.

● Нярэдка падкову выкарыстоўвалі ў магічных дзеяннях. Напрыклад, каб вылечыць хворага, які пакутуе ад жорсткага рэўматызму, раілі пад матрац яму пакласці дзве старыя падковы — адну ў галаве, другую ў нагах, але канцамі ўнутр, і сказаць: *«Раней па зямлі білі, а зараз каб раба (імя) абаранілі. Амін»*.

● Рыбакі ў мэтах бяспекі свайго судна прыбівалі падкову на мачце.

● Існавала наступнае паданне аб магічных уласцівасцях падковы: калі знойдзеную на дарозе падкову кінуць праз левае плячо і задумаць жаданне, яно абавязкова спраўдзіцца.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнёмся!

Жонка — мужу:

— Я ж цябе прасіла не перашкаджаць мне! З-за цябе я выпусціла з рук кулінарную кнігу, яна загарнулася, і зараз я не ведаю, што зварыла на абед!..

☺

Мужчынам, каб выканаць танец жывата, шмат не трэба — усяго толькі жаданне і пару літраў піва.

☺

У тэатры:

— Павесьце, калі ласка, куртку.

— Не павешу — у вас няма гафтачкі.

— Ну, хоць за капюшон!

— Не! У вас няма гафтачкі!

— Ну, зараз жа спектакль пачнецца!

— Не пачнецца: вунь сядзяць акцёры і ўсё прыслухаюць гафтачкі!

☺

Актуальнае.

Чаму ў праграме «Сэкс з Анфісай Чэхавай» не паказваюць сэкс з Анфісай Чэхавай?!

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 47 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».

Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 32.444 Індэкс 63850. Зак. № 2160. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12